ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

6—7 лістапада 1937 г. № 58—59 (329—330)

Цана 40 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і управлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Няхай жыве XX гадавіна Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі ў СССР!

Няхай жыве вялікі, непераможны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна!



Янка КУПАЛА

АБ СТАЛІНЕ СЕЙБІТУ

Аб Сталіне сейбіту песня мая,
А песня ад сэрца і звонка, як медзь,—
Якую ў жніво пяе ў полі жняя,
Якую ў касьбу пяе ў лузе касец.

Багата ўраджаем
Зямля расквітнела,
У будучнасць людзі
Ўзіраюцца смела.

Аб Сталіне сейбіту песня мая,
А песня з душы і гартоўна, як сталь,—
Якую пяе арлоў горных сям'я,
Якую пяе пры кавадле каваль.

Арлы самалёты
Ўсё неба ўзялі,
І волю здабылі
Сабе кавалі.

Аб Сталіне сейбіту песня мая,
А песня ад сонца, ад зор залатых,
Якую пяе уся наша зямля,
Аб Сейбіту светлы разносячы слых.

Ён даў для народаў
Асноўны закон,
І дружбу народаў
Навек стварыў ён.

Аб Сталіне сейбіту песня мая,
А песня ад казак, чароўных тых сноў,
Што сталіся яваю нашага дня,
Што збавілі долю ад пут, данцугоў.

Заглянула сонца
Да хат, сутарэнь,
Праклятых дзён прошлых
Развеўся цень.

Аб Сталіне сейбіту песня мая,
А песня ад шчасця, ад радасных дзён,
Якая на крыллях ляціць салаўя
За межы—границ ды будзіць там сон.

І рухнуць апоры
Фашысцкіх цямніц,
Нявольнікі выйдуць
Да ясных зарніц.

Менск, кастрычнік, 1937 г.

Дваццаць год

Дваццаць год назад—7 лістапада 1917 года—рабочыя і сяляне нашай радзімы, пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна, раз і назаўсёды скінулі ўладу капіталістаў і памешчыкаў. Пройдуць вякі, але вялікая дата 7 лістапада 1917 года, якая адкрыла новую эру ў гісторыі чалавецтва, будзе лунаць над светам, неўміручым крэмлёўскім сузор'ем, асвятляючы шлях народам да шчасця.

У артыкуле «Сусветны характар Кастрычніцкай рэвалюцыі» таварыш Сталін пісаў, што «перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі азначае карэнны пералом у гісторыі чалавецтва, карэнны пералом у гістарычным лёсе сусветнага капіталізма, карэнны пералом у вызваленчым руху сусветнага пралетарыята, карэнны пералом у спосабах барацьбы і формах арганізацыі, у быту і традыцыях, у культуры і ідэалогіі эксплаатуемых мас усяго свету».

Геніяльныя словы правадыра сусветнага пралетарыята пацверджаны жыццём. Кастрычніцкая Сацыялістычная рэвалюцыя была пачаткам новай, ленінска-сталінскай эпохі ў жыцці чалавецтва. Існаванне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, пабудова сацыялізма ў нашай краіне акрыляе пралетарыяў свету. Усё мыслячае чалавецтва з любоўю глядзіць на СССР—сваю бацькаўшчыну, радзіму культуры і прагрэса.

Прайшлі два дзесяцігоддзі. Ад старой убогай і бяссільнай, жабрацкай Расіі, паўкалоніі заходне-еўрапейскага капіталізма няма і ўспаміну. Наша краіна стала магутнай індустрыяльнай дзяржавай. СССР па выпуску прадукцыі заняў першае месца ў Еўропе і другое месца ў свеце. Наша сельская гаспадарка ў гэтым годзе дала ўраджай у 6,8 млрд. пудоў. Сацыялістычная прамысловасць у 1937 годзе дасць у дзесяць раз больш прадукцыі, чым да вайны. Зусім іншым стала жыццё на абноўленай зямлі вялікага Савецкага Саюза. Наша зямля стала не той—яна пакорна выконвае волю чалавека. Людзі пакараюць прыроду, прымушаючы яе служыць сацыялізму.

Адзначаючы дваццацігоддзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, мы з болем у душы ўспамінаем вядомых і невядомых герояў, што загінулі ў барацьбе ў кастрычніцкія дні 1917 года, на шматлікіх фронтах грамадзянскай вайны, што забіты з-за вугла найміта́мі сусветнага фашызма. У дзень усенароднай урачыстасці працоўных нашай краіны, свята ўсяго перадавога чалавецтва свету, схілім нашы баявыя сцягі, ушануем іх памяць і паклянемся высока несці падняты імі сцяг і калі патрэбна будзе—кроплю за кропляй аддаць сваю кроў за рабочую справу, за сацыялізм.

«Лепшыя людзі з працоўных мас аддалі сваё жыццё, пачаўшы паўстанне за вызваленне народаў ад імперыялізма, за спыненне войн паміж народамі, за звяржэнне панавання капітала, за сацыялізм...

На лёс загінуўшых у кастрычніцкія дні... дасталося вялікае шчасце перамогі. Найвялікшы гонар, пра які марылі рэвалюцыйныя правадыры чалавецтва, стаў іх здабыткам: гэты гонар заключаўся ў тым, што па целах доблесна загінуўшых у баі таварышоў прайшлі тысячы і мільёны новых барацьбітоў, таксама бясстрашных, забяспечыўшых гэтым гераізмам масе перамогу...

Ушануем-жа памяць кастрычніцкіх барацьбітоў тым, што перад іх помнікам дамо сабе клятву ісці па іх слядах, пераймаць іх бясстрашнасць, іх гераізм. Няхай іх лозунг стане лозунгам нашым, лозунгам паўстаўшых рабочых усіх краін. Гэта лозунг—«перамога ці смерць».

І з гэтым лозунгам барацьбіты сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі пралетарыята будуць непераможны» **(Ленін).**

Гэтыя словы глыбока запалі ў сэрцы нашага народа. Рабочы клас СССР, сялянства, інтэлігенцыя, пад кіраўніцтвам прадаўжальніка вялікай справы Леніна, геніяльнага Сталіна, рынуліся ў бой і перамаглі. Падагульняючы пройдзены шлях, І. В. Сталін, выразіўшы думы народа, сказаў: «Прыемна і радасна знаць, што кроў, багата пралітая нашымі людзьмі, не прайшла дарма, што яна дала свае рэзультаты».

З лозунгам «перамога ці смерць» барацьбіты сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі пралетарыята змагаюцца з азвярэлымі фашыстамі, гэтымі варварамі дваццатага стагоддзя, якія ў страху перад надыходзячай сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыяй не спыняюцца ні перад чым, спальваюць на кастрах усе лепшыя здабыткі чалавечае культуры, дзесяткамі і сотнямі тысяч фізічна знішчаюць лепшых людзей народа, вешаюць дзяцей. Надыходзіць час расплаты. У апошнім і рашаючым баі будуць наголаву разбіты ўсе гэтыя вырадкі роду чалавечага, дэгенераты мыслі—фашысцкая погань. Віхурай рэвалюцыі яны будуць сцёрты з твару зямлі.

Народы вялікага Савецкага Саюза дабіліся сусветнагістарычных перамог, у жорсткай барацьбе з класавымі ворагамі пабудавалі сацыялізм. Наш гераічны народ, пад кіраўніцтвам мудрай партыі Леніна—Сталіна, наголаву разбіў ворагаў сацыялізма, трацкісцка-зіноўеўскую, бухарынска-рыкаўскую, нацыянал-фашысцкую і іншую брыду, гэтую агентуру фашызма, якая імкнулася рэстаўрыраваць капіталізм у СССР. Але ворагі сацыялізма яшчэ не дабіты. Неабходна выкарчаваць рэшткі гэтай зграі махляроў чорных спраў.

З выключным энтузіязмам шырокія працоўныя масы нашай прыгожай радзімы сустракаюць вялікае дваццацігоддзе. Шчасліва і радасна жывецца пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі. Яна «ўзбройвае духоўна наш рабочы клас, наша сялянства, нашу працоўную інтэлігенцыю. Гэта рухае наперад і ўзнімае пачуццё законнага гонару. Гэта замацоўвае веру ў свае сілы і мабілізуе на новую барацьбу для заваёў новых перамог комунізма» **(Сталін).**

Канстытуцыя СССР, у якой палымнее мудрасць вялікага Сталіна, гэта—новы комуністычны маніфест, у якім прадаўжаюцца вялікія справы Маркса, Энгельса, Леніна,—мабілізуе шырокія працоўныя масы на барацьбу за пабудову комунізма.

Дванаццатага снежня гэтага года народы нашай радзімы, на аснове Сталінскай Канстытуцыі, выберуць Вярхоўны Совет СССР. Яны аддадуць свае галасы за тых людзей, якія не шкадуючы сваіх сіл, а калі патрэбна будзе—і жыцця, вядуць барацьбу за пабудову новага грамадства. Яны выберуць першага з першых—вялікага Сталіна і яго слаўных саратнікаў Молатава, Варашылава, Калініна, Кагановіча, Ежова, Жданава і другіх прыяцеляў народа, партыйных і непартыйных бальшэвікоў.

У дзень усенароднага свята—дваццацігоддзя Кастрычніка—выйдзе на вуліцу дружная сям'я народаў, каб прадэманстраваць сваю любоў да партыі Леніна—Сталіна, сваю гатоўнасць прадаўжаць барацьбу за ажыццяўленне вялікіх ідэй Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

На вуліцы выйдуць гордыя рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя нашай краіны, якія за дваццаць год напружанай барацьбы пабудавалі сацыялістычнае грамадства працоўных горада і вёскі.

Наша магутная Чырвоная Армія, надзейны вартавы заваёў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, прадэманструе сваю сілу, гатоўнасць у любую хвіліну стаць на абарону сацыялістычнай бацькаўшчыны. «Мы стаім за мір і адстойваем справу міру. Але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны» **(Сталін).**

Весела і радасна жывецца на вялікіх і багатых прасторах нашай радзімы. Народы СССР у песнях і казках славяць сваіх правадыроў Леніна і Сталіна, пад кіраўніцтвам якіх забяспечаны росквіт эканомікі і культуры, навукі і тэхнікі, літаратуры і мастацтва.

Беларускі народ упершыню ў гісторыі атрымаў сваю дзяржаўнасць. Магутны рускі народ, гераічная Чырвоная Армія, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, дапамаглі яму прагнаць з сваіх палёў, гушчароў-лясоў орды польскіх паноў. Не давядзецца болей ім быць на нашай свяшчэннай сацыялістычнай зямлі!

«Са сцягам Леніна перамаглі мы ў баях за Кастрычніцкую рэвалюцыю.

Са сцягам Леніна дабіліся мы рашаючых поспехаў у барацьбе за перамогу сацыялістычнага будаўніцтва.

З гэтым-жа сцягам пераможам у пралетарскай рэвалюцыі ва ўсім свеце.

Няхай жыве ленінізм!» **(Сталін).**

Няхай жыве XX гадавіна Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў СССР!

Няхай жыве Ўсесаюзная комуністычная партыя бальшэвікоў—перадавы атрад працоўных СССР!

Няхай жыве Комуністычны Інтэрнацыянал—кіраўнік і арганізатар барацьбы супроць вайны, фашызма, і капіталізма! Няхай жыве сусветны комунізм!

Няхай жыве вялікі непераможны сцяг Маркса — Энгельса — Леніна—Сталіна!



Пятро Глебка

У тыя дні, мае сябры,
Крывёй гарэла неба,
У тыя дні былі жадны
Скарынцы чэрствай хлеба.
У тыя дні, мае сябры,
Цямнелі грозна далі,
У тыя дні жалезным сном
Пад сцюжай засыналі.
У тыя дні, мае сябры,
Мы вельмі мала мелі:
Вінтоўку, шаблю, кулямёт
І шэрыя шынелі.
Мінуліся, мае сябры,
Падзеі жорсткай явы,
Але застаўся успамін
І песні мужнай славы.
Сягоння я, мае сябры,
Да краю імі повен.
Паслухайце-ж пра тыя дні
Суровую аповесць.

I

Вайна...
Адзінокія фабрыкі тужаць,
Апусцелі палі,
Ні касцоў, ні аратых...
Па загаду цара
ўсіх здаровых і дужых
ад малых да старых
Паздавалі ў салдаты.
Не пачуеш ні смеху,
ні песень вясёлых,
толькі—стогны і плач,
толькі—слёзы і лямант.
Гарады—у трывозе,
Калоцяцца сёлы,
Дні і ночы
гарматы гудуць над палямі.
Па старых,
зруйнаваных вайною гасцінцах
Цягнуць бежанцы бедны,
убогі пажытак,
у падраных шынелях
ідуць пехацінцы,
кавалерыя топча
высокае жыта.
Цішыня, цішыня!
Нават гром кананады
не развее тугі
з амярцвелага сэрца:
Ні адзення, ні хлеба,
ні слова спагады...
З набалелай душы
Крык на вусны ірвецца:
— Эх, каб сілы былі,
ды каб дружна паўсталі!..
Толькі, мусіць, ніколі
такога не будзе:
У Швейцарыі Ленін,
на катарзе Сталін,
у выгнаннях, у турмах
найлепшыя людзі.
Але голас,
узняты над лямантам бойні,
І адтуль урываецца
ў рокаты бою,
заклікае закончыць
нялюдскія войны
поўным мірам людскім,
грамадзянскай вайною.
Кліч ідзе на заводы,
трапляе ў акопы
і, памножаны сілаю
зброі і працы,
навальніцай грыміць:
— Нацярпеліся! Хопіць!
— Мір хацінам,
вайна апантанным палацам!
Вее з Балтыкі
лютаўскі вецер халодны,
Петраград—у агні,
у завеях суровых—
пачынае шумець.
Сотні тысяч галодных
узнімаюць, як сцяг,
два агністыя словы:
— Мір і хлеб!
Поўніць вуліцы
крык Петраграда.
Забастоўкі растуць
спавяшчаюць змаганне.
І надзейных салдат
і рабочых атрады
у зімовую ноч
падымаюць паўстанне.
Дружным націскам
царскія збіты аковы,
Але новыя ладзяць
народу кайданы:
У часовым урадзе—
паны Мілюковы,
у советах рабочых—
прадажныя Даны.
Не для гэтага мерлі
таварышы нашы,
не для гэтага бура
імперыю трэсла,
каб змяніць рэволюцыю
мірненькім маршам
ад прастола цара
да прэм'ерскага крэсла!

II.

Далёкі да Цурыха шлях...
Ляці, наша думка, туды!
Там Ленін—прыгнечаных сцяг,
народаў усіх правадыр.
Далёка палярны круг...
Ляці, наша думка, жвавей!
Там Сталін—наш бацька і друг
У цяжкай няволі жыве.
Галосіць у тундры зіма,
Мяце над Курэйкаю снег,
А вестак ніякіх няма,
Трывога на яве і ў сне.
Ляці-ж, наша думка, ляці,
Зламаўшы граніц берагі,
Ляці-ж, наша думка, ляці
Праз ноч і завею тайгі.
Скажы, што ізноў ашукаць,
імкнуцца купцы і паны,
спытайся дзе выйсця шукаць,
як волю сваю бараніць.
Аж рэха над светам грыміць,
ідзе устрывожаны гул,
Мінае заставы граніц,
палярную ноч і тайгу.
І выбухам першых гранат
Ірвуцца здалёку лісты:
— Ваюйце за ўласны урад,
мае дарагія браты!
Вы скінулі мужна цара...
Да зброі-ж усе, як адзін!
Настане другая пара
вялікіх і цяжкіх гадзін.
Настане час боек другіх,
Мацуйце-ж рабочы атрад!
І Сталін з далёкай тайгі
спяшае прыйсці ў Петраград.
Не скора прахопіцца дзень,
далёка да ранішніх зор,
а ён ужо тундрай ідзе,
мінае сібірскі прастор.

III.

Вясна ішла шырокім крокам,
але не цешыла яна—
лілася кроў густым патокам
і не канчалася вайна.
— Зямлі!—крычалі грозна вёскі,
прасіла іхніх рук зямля.
Міністры пасылалі войска
душыць абураных сялян.
— Даволі!—хмурыя салдаты
складалі шаблі і штыкі.
А трапяткія адвакаты
збіралі новыя палкі.
Крывёй, а не вясновым сокам
скрозь налівалася зямля.
Але ішлі «Лісты здалёку»
і асвятлялі цёмны шлях...
У кожным—ракатала сіла,
гатовая зламаць граніт.
Яе не дарам паланілі
Глухімі кратамі граніц.
Не заняволяць толькі сэрца,
яно з народам прагне жыць
і ў родную краіну рвецца
цераз граніцы й рубяжы.
Бо хіба-ж выкажаш у словах
усе шляхі да перамог?!
І Ленін кожны дзень нанова
шукае сцежак і дарог
туды, туды...
дзе супраць здрады
мільёны рушаць у паход,
дзе на крывавых барыкадах
змагаецца яго народ.
Радзіма!
доўгімі начамі
ты снілася ў кароткіх снах
з тваімі ціхімі палямі,
з маркотным шумам па лясах,
з тваім народам працавітым,
гатовым на рашучы бой,
каб імператар і бандзіты
не панавалі над табой.
Ты блізка, родная!..
Вагоны
мінаюць пагранічны рад,
Салдаты рускія гамоняць,
І Ленін слухае салдат.

IV.

Паўсталі
вякамі закутыя сілы,
магутнаю хваляю
змылі цара
І рушаць па ціхіх
прасторах Расіі
у вобразе Леніна—
правадыра.
Банкір, што няшчадна
рабуе і крадзе,
імперскай ахранкі
служылыя псы
імкнуцца чарніць,
вінаваціць у здрадзе
таго, хто душою
чысцей ад расы;
таго, чыё сэрца
гадамі балела
за долю краіны,
за струджаны лёс,
Таго, хто заўсёды
адважна і смела
вялікую праўду
прыгнечаным нёс.
Ні земным праклёнам,
ні карай найвышняй
ніхто не запляміць
святое імя...
Насустрач любімаму Леніну
выйшла
уся неабдымная
наша сям'я:
Саратнікі й вучні,
салдаты й матросы,
Чырвонае гвардыі
першы атрад,
увесь працавіты
мільёнагалосы,
закураны дымам
стары Петраград.
Фінляндскі вакзал
баявыя калоны
з усіх чатырох
замыкаюць старон.
Узрушаны Ленін
выходзіць з вагона
і шпаркай хадою
мінае перон.
Вось ён узышоў
на прыступкі вакзала,
аркестры ударылі
радасны марш.
І мора людское
кругом задрыжала:
— Няхай жыве Ленін!
Ён з намі і наш!
Не сілаю рук,
а пачуццямі сэрца
узнеслі яго
на круты бранявік.
Самкнулі шарэнгі
чырвонагвардзейцы,
і ленінскі заклік
ад бурнай Нявы
імчыцца па земных
прасторах вялізных:
— Няхай для шчаслівых
і радасных мэт
Зара рэволюцыі
социялізма
запаліць увесь
заняволены свет.

V.

Слова маё!..
узнімайся высока,
будзь загартаваным,
цвёрдым, як сталь,
вечна імкніся,
налі́ўшыся сокам,
чыстым, як гэта
празрыстая даль!
Стань у рады,
хоць ад самага краю,
слоў гартаваных
у яркім агні!..
Гонару большага—
я не жадаю...
Помніш, у тыя
вялікія дні?
Леніна слова—
мільёны збірала,
Сталіна слова—
на бітву вяло!
Вось яно коціцца
ўзрушаным валам
з гораду ў горад,
з сяла—у сяло.
Дом—асабняк
балярыны Кшасінскай
поўняць прыбоі
жывых галасоў:
Молатаў, Куйбышаў,
Фелікс Дзяржынскі,



Клім Варашылаў
і Якаў Свярдлоў...
З высылкі, з фронту,
з далёкіх ускраін
дружна збіралася
гвардыя мас.
Быў красавік.
Над разбураным краем
бурна каціўся
ўстрывожаны час.
Кожны павет
выбіраў дэлегатаў,
з цвёрдым наказам
усіх пасылаў:
выслухаць Леніна
думкі-парады,
вырашыць з Сталінам
тысячы спраў.
Дзесяць гадзін...
На высокай трыбуне
стомлены Ленін
чытае даклад:
— Наша задача—
дзяржава-комуна,
новы грамадскі,
парадак і лад.
Мір і братанне!..
Улада—советам,
Шахты—рабочым,
сялянам—зямля,
зброя—народу...
Да гэтае мэты
нам рэволюцыя
выракла шлях.
І на змаганне
З часовым урадам
сілы збіраць
заклікае Ільіч.
Цераз заставы
вакол Петраграда
скрозь над Расіяй
ідзе гэты кліч.

VI.

Склікаы Советамі
першы з'езд збіраецца.
Здраднікі з кадэтамі
пахаджаюць, раюцца.
Столь і сцены белыя
курывам ахутаны.
Дні і ночы цэлыя
Засядаюць, гутараць.
Слухаюць рабочыя,
Засынаюць з прыкрасці...
Згоднікі-ж саймуюцца
як уладу выкрасці.
На трыбуне трагікам
Цэрэтэлі курчыцца,
соладка і прагненька
цешыцца і мучыцца.
Тонкаю руладаю
цягне, аж заходзіцца:
— Стаць цяпер уладаю—
партыі не знойдзецца!..
Над крыклівай помпаю
трагікаў і эпікаў
выбухае бомбаю
ленінская рэпліка:
— Ёсць такая партыя!..
І крутой лавінаю
цішыня упартая
у праходы рынула.
Як вулей развязаны,
Загулі, прачнуліся:
— Што за словы сказаны?
— І адкуль пачуліся?

VII

А ён, вялікі і магутны,
і радасны, як светлы дзень,
паходкай лёгкай і нячутнай
ужо ў прэзідыум ідзе.
— Міністр сказаў нядаўна слова,
што партыі няма цяпер,
каторая была-б гатова
узяць уладу на сябе.
А я сцвярджаю—ёсць! Дачасна
Вы засмяяліся, міністр...
Шляхі да мэты сонцам ясным
Нам асвятляе комунізм.
І, як вясною па каменнях
празрысты залаты ручай,
гарачым і жывым струменем
ліюцца словы Ільіча:
Як у акопах людзі гінуць,
як трусяць мас меншавікі,
як нішчаць волю і краіну
нажывы прагнай хіжакі.
Заціхла зала. Вымер лямант.
Як шпарка тут імчыцца час!
Ужо канчаецца рэгламент
і завадатаі крычаць:
— Даволі! час!—Але як бура
устрапянуўся злы пратэст,
зляцелі воплескі віхурай
і зашумелі, быццам лес.
Салдатам і рабочым люба
паслухаць словы Ільіча.
Кіраўнікі, зацяўшы зубы,
прымушаны прадоўжыць час.
За сказам—сказ, за словам—слова,
Ізноў вядзе расказ Ільіч.
І з слоў спакойных і суровых
выроствае грымотны кліч:
— Мы не баімся браць улады:
Мы—партыя рабочых мас...
І радавыя дэлегаты
прыймаюць ленінскі наказ.

VIII

Над фронтам ціш. Маўчаць гарматы,
але ў вушах не моўкне гром...
У круг сабраўшыся, салдаты
успамінаюць родны дом.
Якая ціш у іхняй хаце!
Якая скруха і туга!
Чыясьці згорбленая маці
збірае шчаўе на лугах.
Чыясьці жонка-парабчанка,
чужое поле аручы,
Спявае сыну калыханку
і горка плача пяючы.
Чыесьці скрыўджаныя дзеці
Ідуць па сёлах жабраваць...
Навошта-ж гэты плач на свеце?!
За што-ж пакутным ваяваць?!
Жыццём клянецца агітатар:
— Як выйграем апошні бой,
вас павязуць усіх дахаты,
надзеляць хлебам і зямлёй.
І, ашуканыя падманам,
без кіраўнічае рукі,
па недарэчных царскіх планах
у наступ рушылі палкі.
На мармуровых плітах высеч
патрэбна-б золата імён:
іх шэсцьдзесят суровых тысяч
загінула за дзесяць дзён.
Урад спраўляе перамогу,
Смяецца хіжы Мілюкоў:
— Віншую панства! Дзякуй богу,
паменшала большэвікоў.
Дачасна цешыцеся, гады!..
Саюз рабочых і сялян
Змяце, як логавішча здрады,
увесь часовы балаган.
Грымяць суровай эпапеяй
«Акопнай праўды» тыражы...
Не дарма медзь сваіх капеек,
свае медалі і крыжы,
свой крык, надзеямі сагрэты,
душу маўклівую сваю—
салдаты за жыццё газеты,
як за радзіму, аддаюць.

IX

Канчаецца ноч.
У бялёсай імгле
абуджаных вуліц
расце ажыўленне.
І Ленінскі штаб
паўстае на чале,
сваімі шляхамі
вядзе выступленне.
Па слову ЦК
на мастах над Нявой
атрады займаюць
пасты абароны.
Спакойна і мірна
суровай хадой
пад ленінскім сцягам
праходзяць калоны.
І раптам жалезны,
распалены град
бунтуе калоны,
змятае і косіць...
Агнём кулямётным
Часовы урад
вітае салдата,
частуе матроса.
— Вы хочаце міру?
Вам трэба совет?
Мы самі калісь
ваявалі з арламі,
але не да гэтых
імкнуліся мэт—
Расіі патрэбна
вайна і парламент!
Ізноў наступіла
і вымерла ноч,
а чорная зграя
грыміць і скрыгоча.
Маўклівыя плошчы
Заліты ізноў
гарачым свінцом
і крывёю рабочых.
Разбіты рэдакцыі
нашых газет,
палацы Кшасінскай
займаюць казакі.
— На катаргу Леніна!—
хрыпне кадэт,
і кожную сцежку
віжуюць сабакі.
У ноч, у падполле
ідзе правадыр,
у бедных хацінах
шукае прыстанку.
І нюхаюць доўга
на бруку сляды
халодныя ноздры
сабак і ахранкі.

X

Народныя пачуцці і настроі
гартуюць думкамі большэвікі:
— Прыходзіць час узяцца ўсім
за зброю,
узняць над ворагам свае штыкі.
І сёлы разгінаюць стан пахілы,
становяцца ў шарэнгу гарады,
І кожны дзень дужэюць нашы сілы,
шырэюць большэвіцкія рады.
Хто-ж вернымі і простымі шляхамі
у грозны час на бітву павядзе?
Далёка дзесь за цёмнымі лясамі
вялікі Ленін сустракае дзень.
За ім ахраннікі па следу шараць,
шукаючы ахвяры для мяча.
І рыкавы спакойна вырашаюць
на суд ганьбы павесці Ільіча.
На чый-жа суд? на суд ваеннай
банды,
нядаўніх слуг крывавага цара,
на люты суд банкірскіх ад'ютантаў,
каторым трэба смерць правадыра.
Не, здраднікі і гандляры! не
выйдзе:
ад вашых рук і ненавісці злой—
Дзяржынскі і Серго Орджанікідзе
яго заслоняць радасна сабой.
На варце Леніна мільёны сталі,
запаленыя гнеўным пачуццём,
і першы ленінец таварыш Сталін
аддасць за Леніна сваё жыццё.
Яго дарогамі, яго шляхамі
ён павядзе на бой рабочы клас,
ён—ленінская мудрасць паміж намі,
ён—ленінская воля сярод нас.

XI

Маладыя вятры адшумелі,
ціха плешчацца сонны прыбой.
Чалавек у армейскім шынелі
задуменны ідзе над Нявой.
Штосьці новае ў рысах знаёмых:
а ці ветлая ўсмешка вачэй,
а ці вуснаў абрыс нерухомы,
а ці контуры нізкіх плячэй?
Не, ён той-жа, прыветны і строгі,
Тая-ж бурная сіла вясны,
толькі вочы цямнейшыя трохі
і над скронямі цень сівізны.
Многа горкіх хвілін праляцела,
Шмат мінула суровых падзей...
Нічыя так душа не балела
За гаротную долю людзей!
Узнімаюцца думкі высока,
шмат на сэрцы трывог і клапот.
Задуменны, хадою шырокай
ён спяшае да Нарвскіх варот.
Ціш і цемра. Туманная бездань.
Ён ідзе. І праз нейкі ўжо час
На паседжанні шостага з'езда
яго чыстыя словы гучаць.
Мужна й строга ліецца прамова...
Колькі гневу у ёй і цяпла,
колькі кожная думка і слова
вылучаюць жывога святла.
— Рэволюцыя працы і міру
не памерла ў ліпнёвыя дні.
Рана цешыцца сталі банкіры,
Рана свята спраўляюць паны.
Мы жывыя! нестрачанай сілай,
як агнямі, кіпіць наша кроў.
Мы свой гнеў у глыбінях сталі
і падымем на ворага зноў.
Штык павінен быць востра
адточан,
у змаганні за шчасце сваё.
Мірны ход рэволюцыі скончан,
Час вялікіх і грозных баёў.

XII

Мінае лета. Першыя лісты,
пакрытыя сухім налётам сонца,
спадаюць з дрэва. Ціхія кусты
палаюць залатым агнём чырвонца.
Начамі зябка. Лёгкае пальто
падшыта ветрам і асенняй сцюжай.
Усё пазбудзецца, усё—нішто,
абы змагчы бяду і гора здужаць,
Абы жыццё рабочых і сялян
навек збыло ярмо капіталізма.
І Ленін у Разліве піша план—
пралог рэспублікі социялізма.
Ён вернай партыі дае наказ:
— Большэвікі павінны ўзяць уладу.
І неўзабаве сам у грозны час
з'яўляецца на плошчах Петраграда.
Паўстанне блізіцца. Ужо ЦК
на вырашэнне дзень і план
выносіць.
А ворагаў прадажная рука
Ахранкам шле на партыю даносы.
Спужаліся, штрэйкбрэхеры, вайны?!
Вам страшна, што народ на бітву
крочыць?!
А дзе-ж былі, калі ў крыві паны
тапілі тысячы і тысячы рабочых?!
Праклён вам, здраднікі, жыць
будзе век.
Не спыніце жыцця ганебнай
здрадай.
Па слову Леніна адважны чалавек
вядзе прыгнечаных на барыкады.

XIII

Горад вымер і згас
Толькі свецяцца Смольны.
Штаб паўстання жыве
небывалым жыццём.
А ні страху, ні болю
ў вачах навакольных,
нават смутак гарыць
баявым пачуццём.
У пакоях ад дыму
няма куды дзецца.
За акном пад нагамі
грукочуць тарцы:
адыходзяць атрады
чырвонагвардзейцаў,
прабягаюць выведчыкі
і пасланцы.
І на момант усё
заціхае і гасне—
і гамонка, і крокі,
і словы, і шум...
Ленін моўчкі стаіць
У вачах яго ясных
Многа—светлых надзей
і няздзейсненых дум.
Заклапочаны Сталін
схіліўся над картай
А хвіліны ідуць,
быццам тысячы дзён.
Узрастае трывога...
І раптам упарта
у глухой цішыні
зазвінеў тэлефон.
— Я вас слухаю... Сталін.
Вакзалы заняты?..
Тэлеграф і паштамт?..
І сенат?.. малайцы!
Што далей? У Зімовы,
на помач салдатам.
Атакуйце палац
на дварцовым пляцы.
Першы залп за Няву
пасылае «Аўрора»,
ды не хоча здавацца
Зімовы палац:
Кулямётным агнём
з залатых калідораў
афіцэры бароняць
пакінуты Пляц.
Зноў ударыў з гармат
браніраваны крэйсер,
Дробным шротам пасыпаўся
белы карніз.
І міністры з высокіх
наседжаных крэсел—
недаступных вышынь—
апаўзаюць наніз.
З Петрапаўлаўскай крэпасці
б'юць кулямёты,
і чырвонагвардзейцы
выходзяць на пляц,
маракі і адборныя
часці пяхоты
дружным штурмам займаюць
Зімовы палац.
Ноч мінае.
Зара над краінай усходзіць.
Над жыццём гаспадарыць
Рабочы совет.
Аб зямлі, аб сапраўднай
народнай свабодзе
мудры Ленін падпісвае
першы дэкрэт.

XIV

Многа дзён я знаю урачыстых,
непаўтораных ніколі і нідзе,
ды няма на свеце больш вячыстых,
як жывы кастрычнікаўскі дзень.
Дні такія не забудуцца ніколі!..
У жыцці, на працы, у баю,
паміраючы на ратным полі
за радзіму слаўную сваю;
хто не ўспомніць гэтай светлай
даты?
Хто не ўспомніць, як ішлі на бой
верныя матросы і салдаты
і рабочыя дружынай баявой,
як адважна моўчкі паміралі
на дварцовых плошчах і палях,
як навек над Смольным падымалі
апалосканы крывёю сцяг,
як на шэрых лапленых шынелях
неслі раненых сваіх сяброў,
як ішлі па вуліцах і пелі
песню новых легендарных слоў,
як усюды на шырокім свеце
тысячы рабочых і салдат
плакалі ад радасці, як дзеці,
абдымаліся, як з братам брат!
Слава вам, байцы суровай бітвы,
Слава вам, памёршым і жывым!
Ваша мужнасць намі не забыта,
не забыт і шлях ваш баявы.
Вамі заваёваны Кастрычнік,
вамі высака падняты сцяг—
Беражэ адважны пагранічнік
кожнай кропляю свайго жыцця.
У вяках не згасне ваша слава:
помнікам былых вялікіх дзён
вырасла людское наша права—
Няўміручы сталінскі закон.



Слава Леніну, слава Сталіну!

Янка КУПАЛА

Святочныя вершы

1.
Не пра быўшае кайданнае
Гэту песню я складаю,
А пра з'яву доўгажданую,
Што сягоння шчасна маем.
Не пра турмы, здзекі царскія—
Мукі люду і народаў,
А пра волю пролетарскую—
Залатыя нашы годы.
Не пра цемру беспрасветную,
Што людзям сляпіла вочы,
А пра яснасць зорнацветную,
Што развеяла нам ночы.
Не пра беднасць беспрытульную,
Гора вечнае, жабрацтва,
А пра наша ўсеагульнае
Неабсяжнае багацтва.
Не пра ненавісць, што годамі
Нас давіла цяжкім грузам,
А пра дружбу між народамі
Усяго нашага Саюза.
Не пра сны з цяжкімі зморамі,
Што цягнулі нас у нерат,
А пра Сталінскі пад зорамі
Сонечны паход наперад.
Не пра быўшае кайданнае
Гэту песню я складаю,
А пра з'яву доўгажданую,
Што сягоння шчасна маем.

2.
Ідзе гоман урачыста,
Ідзе з хаты ў хату,
Ідзе з песняй агнявістай
Аб вялікім святу.
Дваццаць год святкуем сёння
Магутных праяваў,
Край Совецкі ўвесь гамоніць
Большэвіцкай славай.
Ідзе гоман расспяваны
Далёка, ў прасторы,
Дзе льдзяныя акіяны,
Дзе цёплыя моры.
Мы святочна сходы клічам—
Вольныя, ў бясстрашшы—
Канстытуцыю ўзвялічыць
Сталінскую нашу.
Ідзе гоман пушчай, борам,
Ідзе лугам, полем.
Развіталіся мы з горам,
З нядоляй, з няволяй.
Мы ўраджай збіраці сталі
Буйны небывалы,
Што нам Ленін, што нам Сталін
Засеялі дбала.
Ідзе гоман—а крылаты—
Ідзе, не сціхае,—
На вялікае на свята
Народы склікае.
Так збыліся ў час нямногі
Леніна заветы.
З новым шчасцем, з перамогай,
Народзе Советаў!

Менск, лістапад, 1937 г.

АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ

Вартаўнік

Урывак з паэмы

У калгаснага вартаўніка Кліма Даверы быў забіты кулакамі сын—комсамолец Ігнат Давера. Праз колькі часу ў госці да Кліма прышлі былыя школьныя таварышы Ігната Піліп і Наташа.
У хаце іх чакае Клім Давера з сынамі брыгадзірамі.

Тымчасам вярнуліся з поля
І Кліма Даверы сыны.
Даўно ўжо чакае застолле
Гасцей дарагіх на бліны.
Ідуць доўгажданыя госці,
Жаданыя—ён і яна,
Ім Клім да парога падносіць
Дзве поўныя шклянкі віна.
— За ваша здароўе.
— За ваша...
І шклянкі звіняць на стале.
Распытвае ў Кліма Наташа
Пра першы ўмалот на сяле.
За сытным сталом палілася
Гаворка прыемная ўсім,
Пра сёлетні год у калгасе
Спакойна расказвае Клім.
Пад гоман іх мірнай вячэры,
Ігната Даверы спакой
Ахоўвае зорка з фанеры
Над жоўтай магільнай зямлёй.
Між сосен гарыць, як жывая—
Яе не забудзе Піліп:
І ў памяці ярка ўсплывае
Трохрадкі на досвітку ўсхліп.
Ён бачыць:
І школьную ліпу,
І цень ад яе за акном,
І чуецца глуха Піліпу
Гул бубна за родным сялом.
Ён шэпчыць:
— Ігнатка, Ігнаце...
Былі мы з табою сябры...
І ціха зрабілася ў хаце.
Закашляўся бацька стары...
Ён сына забітага думу
Дадумаў начамі ўжо сам,
На варце ўраджаю, без суму,
Што сёння даруе гасцям.
Ён бачыць—бацькоўскай пароды,
Сядзяць брыгадзіры-сыны—
І брата свайго назаўсёды
Уславілі працай яны.
Глядзіць на іх Сталін з партрэта,
У кветках-вянках палявых,
І позіркам светлым, як лета,
Сыноў атуляе такіх.
Здаецца ўжо Кліму, што Сталін
З вянкоў тых паціху ўстае,
Садзіцца за стол і ласкава
Гаворыць ім:
— Людзі мае...
Я ведаю вашага брата,
Да нас ваша гора дайшло,
Запомніць радзіма Ігната
І век не забудзе сяло.
Шчасліваму Кліму здаецца—
Схіляецца Сталін над ім,
За позняй вячэрай віецца
Ад люлькі славутае дым.
— Жылі мы,—гаворыць,—сардэчна,
Начамі размовы вялі
І шлях твой сышоўся навечна
З маімі шляхамі ў Крэмлі.
Ці мала ўжо намі здабыта?—
Хай людзі пасведчаць за нас.
Па восені сеем мы жыта,
Дажынкі спраўляем у час.
Як сын твой, ад ворагаў цвёрда
Ты зброяй сваёй заслані
Наш край, што красуецца горда,
Суседа свайго працадні.
Да позняга веку, заўсёды,
На варце стаяць нам, стары,
Ахоўваць спакой, азяроды
І люлькай дыміць да зары.

Канчаецца позна вячэра.
На хату выходзяць сыны.
Бярданку іх бацька-Давера
Таропка здымае з сцяны.
Абмацвае Клім патранташы—
Яму ўжо на варту пара.
Пасцель для сяброўкі-Наташы
Нясе гаспадыня-сястра
І сцеліць у сенцах.
А госцю,—
Калёсы з травой на двары.
Спі крэпка, дышы прыгажосцю
Зор спелых, буйных у гары.
. . . .
Пашла на брыгадную сходку
З братамі—Даверы дачка,—
І дрэмле Піліп
Пад ляскотку
Калгаснага вартаўніка.
Далёка, за гумнамі недзе,
Ён лік азяродам вядзе
І знае—хто пожнямі едзе,
Хто сцежкай да дому ідзе.
Адказнасць яго немалая,
Багата пад вартай дабра.
Святлом маладзік залівае
Яго бараду з серабра.

Мікола ХВЕДАРОВІЧ

Сталін


Шмат імён вялікіх не забудзе
Наш народ—жывуць яны ў вяках.
Ясным сонцам над сусветам будзе
Імя ленінца-большэвіка.
Ты прышоў, развеяўшы туманы,
І народ, што ў путах векаваў,
У Кастрычніку паклікаў на змаганне—
І ён вольным і шчаслівым стаў.
Свет раскрыўся, сонца яму свеціць
На зямлі, дзе ліў ён кроў і пот.
Ад калыскі не забудуць дзеці
Цёплых, ласкавых тваіх пяшчот.
Гэта іх сады, палацы, школы—
Сталінская рыса у вачах,
У абліччы сонечным вясёлым,
У дзіцячых звонкіх галасах.
Выміралі, гінулі пляменні,
Кроў лілася, біўся з родам род.
Ты з'яднаў іх у адным імкненні
У магутнае братэрскае—народ.
Мара светлая яго збылася,
Не памеркла ў турмах і вяках.
Ураджаямі шуміць яна ў калгасе
Славаю—на ўсіх мацерыках.
Край шырокі—ад пустынь бязводных
Праз палі, лясы—да гор крутых,
Ты вялікі бацька—самы родны,
Добра ведаеш дачок, сыноў сваіх.
Уздымае заўжды тваё слова
Невыказнай шчырай прастаты.
Ворагам—ты страшны і суровы,
Самы блізкі нам і родны—ты!
Мора шырыню і акіянаў—
Цэлы свет яднае вобраз твой.
Мчаць праз полюсы аэрапланы,
І ідуць байцы Мадрыда ў бой.
Ворага яны перамагаюць
У няроўнай, страшнай барацьбе.
Дзеці, пакідаючы Біскайю,
Як да сонца мкнуцца да цябе.
Маці смутак лёгка пераносіць —
Гора не аплаквае сваё.
Леванеўскага сярод ільдоў-торосаў
Грэе сэрца бацькава тваё.
Не загіне ён у цёмнай ночы,
Ні ў сырых туманах, ні ў вятрах.
Пэўны курс. І сталінскія вочы
Асвятляюць цераз поўнач шлях.
У народных сэрцах тваё імя
Ім яны натхнёныя гараць.
Наша гордасць—сокалы радзімы
З воблікам тваім—правадыра.
З ім вартуюць нашыя граніцы,
З ім вырошчваюць багатыя сады,
Раскрываюць нетраў таямніцы,
Адбудоўваюць у пустках гарады.
Сілу, розум, волю міліёнаў
Усенародным сэрцам ты з'яднаў.
І Васіль Баранаў у палоне
Сталінцам у муках паміраў.
І народ вялікі ганарыцца
Сталіным—сваім правадыром.
На заводах, у калгасах і сталіцах—
Ён усюды стаў гаспадаром.
Ад тайгі суровай і халоднай,
Ад палескіх пушчаў і лясоў
Да цябе у песні ўсенароднай
Нашая адданасць і любоў.

Якуб КОЛАС

Да дня 20 гадавіны

Сцягоў агністых мора
Струменіцца ў прасторы,
Як сонечны прамень.
Над радаснай краінай
Расквечанай пуцінай
Ідзе наш ясны дзень.
Раскатам многаструнным,
Узнімным дружным, юным
Грыміць з ім песень хор.
Выходзь, народ працоўны,
Вітай свой дзень цудоўны,
Што даў табе простор.
Успомні час бурлівы,
Як геній празарлівы
Склікаў цябе на бой...
Разбіты ўсе аковы.
Як золак, шлях
Разгорнут прад табой.
Вялікаму з вялікіх
На мовах многалікіх
Нясем мы песень дар
І тым, хто ў дні паўстання
За праўду на змаганне
Нёс Ленінскі штандар.
Сцягі, агні ,як зоры
Струменяцца ў прасторы,
Іграюць як прамень.
Над вольнаю краінай
Прасторнаю пуцінай
Ідзе наш ясны дзень.

16/X 1937 г.



І. В. СТАЛІН
Скульптура З. Азгура. Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

Якуб КОЛАС

Да выбараў па Сталінскай Канстытуцыі

Я за тых падам свой голас,—
Хто працуе чэсна, дбала,
Хто кладзе трудоў не мала,
Каб жыццё закрасавала,
Як дзянніца мая;
Хто, адмёўшы твань старую,
Ідзе ў далеч маладую,
Хто гартуе баявую
Моц нашаму краю;
Хто ў час кожны і хвіліну
Стаць гатовы за айчыну,
Каб зламаць хрыбет змяіны
Шкоднікам і гадам;
Хто па полі, па заводзе,
Як вясенняе разводдзе,
У стаханаўскім паходзе
Ідзе новым ладам,—
Я за іх падам свой голас.

30/X—37 г.

Пімен ПАНЧАНКА

СТАЛІНУ

Ад дальніх марэй да Палесся,
Як гул навальніц маладых,
Разносіцца мужная песня
І славіць цябе, правадыр.

І слова тваё агнявое
Раджае наш творчы уздым,—
Палеткі шумяць збажынною
Цвітуць маладыя сады.

Ідзе тваё слова па свету,
Мінае сакрэты граніц;
Ствapae ў Кітаі Советы,
На плошчах Мадрыда грыміць.

У казках, легендах, паданнях,
Ты сонца прыгнечаных мас:
Ты ведаеш нашы заданні,
Штодзённа бываеш у нас.

Табою напоўнена сэрца,
Табою сагрэта зямля.
І песня пра шчасце нясецца
К табе, дарагі, да Крэмля.

І маці пяе над калыскай
Пра Сталіна дзецям сваім...
Вялікага вобраза рысы
Я ў сэрцы нясу маладым.

Ў герояў ты выхаваў волю,
Не здрадзіць яна і ў бядзе—
Праз стыні, за казачны полюс
Ты чулай рукой іх вядзеш.

І лепшай слыве ўзнагародай
Ў нас сталінскі поціск рукі.
Ты радасць, ты сэрца народаў,
Глядзіш, як прарок, у вякі.

Калі-ж да палеткаў радзімы
Нахлынуць часы завірух,
Жыццё за цябе аддадзім мы,
Любімы настаўнік і друг!

У Маскве гэтай ночы Ленін будзе

(Песня пра Кастрычнік)

Над Масквою-горадам
Воран крача,
А ў Маскву дарогаю
Коннік скача.

Бяду воран кліча
Людзям багатым,
Бяду воран кліча
Людзям праклятым.

Над Масквою хмары,
Не відна свету,
Там ваююць людзі
За Советы.

Над Масквою-горадам
Воран крача,
А ў Маскву дарогаю
Коннік скача.

Ён вязе вялікія
Весці людзям,
Што ў Маскве гэтай ночы
Ленін будзе.

У Маскве на вуліцах
Кроў ліецца,
Ў маладога конніка
Сэрца б'ецца.

Ён вязе вялікія
Весці людзям,
Што ў Маскве гэтай ночы
Ленін будзе.

Запісана ад калгасніка Леташкова Данілы,—калгас «Комунар», Буда-Кашалёўскага раёна.

Пятрусь БРОЎКА

У Сталіна

(З паэмы „Кацярына“)

У напружаным чаканні
Сэрца кожнага жыло.
Хутка шэсць. І хваляванне
Над радамі ўзрасло.

Поўны шчасця над усімі
Шэпт узняўся і суціх.
Зналі—прыдзе ён любімы
Між таварышаў сваіх.

І нібы уся краіна
Там сабралася, цвіла...
І ніколі Кацярына
Так шчаслівa не была.

Многа ласкі там сустрэла,
Многа цёплых, шчырых слоў,
Колькі побач з ёй сядзела
Родных сёстраў і братоў.

Незабыўнаю хвілінай
Думу думала адну...
Раптам буры несутрымнай
Выбух сцены скалануў.

Быццам мора загудзела,
Быццам ветры у гарах,—
Над галовамі ляцела:
Хай жыве!.. Ваша!..* Ура!..

І паміж вітанняў грому
Над людскою грамадой
Ён стаяў, такі знаёмы,
З прыузнятаю рукой.

І ў сям'і многанароднай
Ён вітаў дзяцей сваіх—
Самы просты, самы родны,
Самы мудры ад усіх.

Ён імкнуўся гул няспынны
Як мага суняць хутчэй.
І глядзела Кацярына,
Не спускаючы вачэй,

На яго твар, на проседзь,
На любімага ўсяго.
Праз ўсё жыццё здалося
Блізка бачыла яго.

Гэта ён яе ў няволі
Парабчанку суцішаў,
На чужым, кулацкім полі
Слёзы крыўды выціраў.

Гаварыў, вазьмем у бойцы
Мы парадак новы, свой,
Станавіў на ўсход, да сонца,
Шлях паказываў рукой.

Год семнаццаты. Гудзела
Ўся краіна на зары...
Заклікаў ён у шынелі,
Сцяг трымаючы ўгары.

Гэта ён—вайну і голад
Грознай сілай пакараў,
Гэта ён заводы, школы
Клапатліва збудаваў.

Гэта ён устаў над часам,
Зоркай яснай запылаў,
Гэта ён стварыў калгасы,
Дзе зямлю навечна даў.

І павёў дарогай росту,
Назаўсёды знішчыў здзек—
Самы родны, самы просты,
Самы мудры чалавек.

Ён між нас, і з кожным годам
Больш гартуюцца рады.
Вось ён тут, перад народам,
Чалавецтва правадыр.

Доўга буру, што вітала,
Не маглі ніяк суняць.
Ледзь, узбуджанаю залай,
Заўладала цішыня.

У прэзідыуме праца
Па звычайнаму пайшла.
Ды пакінуць хвалявацца
Кацярына не магла.

Дэлегаты слова бралі,
Пачыналі гаварыць.
Слухаў іх вялікі Сталін
І саратнікі сябры.

І чуваць былі ў разгоне
Ясных думак, новых спраў—
Галасы Бярозы, Дона,
Зангі, Церака, Дняпра.

Чуўся рух снягоў Хінгана,
Прыуральскі шум лясоў,
Пах садоў Аджарыстана,
Рух паўночных рапакоў.

І дачка сваёй краіны,
Беларускага сяла,
Дэлегатка Кацярына
На трыбуну узышла.

— Мой народ спрадвеку плакаў,
Ён расцвіў цяпер табой,
Ты прымі яго падзяку,
Родны Сталін, бацька мой!

Ты яго узняў і вучыш
Як жыццё пабудаваць...
Ад бароў, вазёр бліскучых
Я прышла цябе вітаць.

Чахлі мы на голых нівах,
Мерлі з голаду вясной.
Мы жывем цяпер шчаслівa,
Родны Сталін, бацька мой!

Маем, яслі клубы, школы,
Нам адкрыўся цэлы свет.
Ад жанок, дзяўчат вясёлых
Асаблівы наш прывет.

Зніклі крыўда, гора, слёзы,
Кожны ўзняўся галавой,
Не пазнаць наш край прыгожы,
Родны Сталін, бацька мой!

І мінулага з праклёнам
Мы парвалі кайданы,
Нам відно, як за кардонам
Ходзяць польскія паны.

Ды ніколі катам болей,
Ніякою ўжо цаной
Не ступіць на наша поле,
Родны Сталін, бацька мой!

— Я кажу перад усімі,
Што сваё жыццё знайшла...
І заўважыла, любімы
Твар усмешка заняла.

Кончыла. Сышла. І залай
Запылаў вачэй агонь,
Як руку яна сціскала
Бацькі роднага свайго.

Як яе віталі справы
За калгаснае сяло—
Погляд Сталіна ласкавы
І рукі яго цяпло.

І ад шчасця Кацярына
Не магла сябе знайсці,
Чула сэрцам,—той хвіліны
Не забудзе у жыцці.

Ей хацелася пра радасць
Расказаць сябрам сваім.
І пакуль ішла нарада,
Толькі думала аб ім.

Вось ён, Сталін—наша сонца,
Кацярына ім жыла.
Хвалявалася бясконца
Нават вышаўшы з Крэмля.

Хіба ведала учора,
Што шчаслівa будзе так?
Над Чырвонай плошчай зоры
Палыхалі, што маяк.

Сцяг чырвоны горда рэяў
Чалавецтву усяму.
Падышла да маўзалея,
Пакланілася яму.

За прыгожы час, за шчасце
Аддала яна паклон,
За дзяцей, бацькоў багацце,
За ясноту новых дзён.

Потым Сталіну душою
Пажадала доўга жыць,
За Крэмлёўскаю сцяною
Знала, ён яшчэ не спіць.

І была яна сагрэта
Цеплынёю дум сваіх,
Знала, ён стаіць над светам
І працуе за усіх.

* Прывітанне па грузінску.

М. ЛІЎШЫЦ

НАШ СТАЛІН

Чые словы цёплай хваляй
У жыццё да нас нясуць
Радасць працы і красу?
Хто вучыць нас?
Хай жыве любімы Сталін,
Хай жыве любімы Сталін,
Хай жыве любімы Сталін—
Бацька наш!

Там, дзе птахі не крылялі,
Свой карабль вядзе пілот;
Знае ён—вятрам палёт
Не супыніць.
Знае ён, што мудры Сталін,
Чуе ён, што мудры Сталін,
Бачыць ён, што мудры Сталін
З ім ляціць

Любы казачныя далі,
Што нам шлях зарою свецяць,
Цепляць радасныя сэрцы
У людзей.
Нам за ўсё любімей Сталін
І бліжэй за ўсё нам Сталін,
І за ўсё на свеце Сталін
Даражэй.

Чые словы цёплай хваляй
У жыццё да нас нясуць
Радасць працы і красу?
Хто вучыць нас?
Хай жыве любімы Сталін,
Хай жыве любімы Сталін,
Хай жыве любімы Сталін—
Бацька наш!

Пераклад Міх. КАЛАЧЫНСКАГА

Анатоль АСТРЭЙКА

Наш сцяг, наша праўда

Шырокія нашых калгасаў палі,
Прыгожае сонца палае над намі,
Ты сонца ўсіх сонцаў на нашай зямлі,
Наш бацька, надзея прыгнечаных—Сталін.

Наш край абмывае дзівосны блакіт,
Наш край—гэта розумаў лепшых імкненні.
Мудрэйшы з людзей на зямлі нашай—ты,
Наш Сталін, наш бацька, наш сонечны геній.

Народы стагоддзі чакалі прыход
Вялікае долі, і праўды шукалі,
Ты даў яе ў велічны, казачны год
Навечна нам, слаўны настаўнік наш Сталін,

Заўсёды цяпло тваіх светлых вачэй
І ласку, сыны мы твае, адчуваем,
Жыццё нам тваё за усё даражэй,
Наш сцяг, наша праўда—любімы наш Сталін.

УСПАМІНЫ

Грымнуць аркестры, і магутнае чалавечае море чароўнае і юнае, як сонца, рушыцца наперад. Грозны і вясёлы пачнецца парад сіл краіны, народжанай 20 год таму назад. Наперад пройдуць сыны працоўнага народа, якія кляліся абараняць радзіму і якія ахоўваюць яе мір і працу. Іх вострыя штыхі будуць бліщэць упэўненасцю і спакоем. Потым неба і зямлю зоймуць лёгкія і рухавыя, як птушкі, танкі і самалёты—машыны, якіх 20 год таму назад не ведала наша краіна. Нарэшце—дзеці, юнакі, рабочыя, якія бачылі тры рэвалюцыі, сяляне, якія перажылі панаванне і падзенне двух цароў, узыйдуць на плошчу і на іх сцягах будзе напісана дарагое і дзіцяці, і юнаку, і даросламу імя Сталіна.

Плошча зоймецца нябачанай яркасцю фарбаў, дзеці і юнакі будуць скакаць, весяліцца, спяваць, і зноў будзе гучаць магутнае і непераможнае, роднае і блізкае слова—Сталін.

На плошчу ўзыйдуць фізкультурнікі, і гледачы будуць поўны захаплення. Якія стройныя юнакі, якія прыгожыя дзяўчаты! Дзіцянё, высока ўзнятае над галовамі, будзе працягваць кветкі—яму, роднаму Сталіну, як падзяку за шчаснае дзяцінства.

Зачараваны, з шырока раскрытымі вачыма я буду глядзець на гэта выключнае відовішча, адзінае за ўсю чалавечую гісторыю, з якім не могуць спаборнічаць святочныя карнавалы старажытнай Грэцыі.

Душа мая будзе перапоўнена ціхай унутранай радасцю, што бывае ў хвіліны, калі чалавек адчувае сябе асаоліва шчаслівым. Ёю авалодаюць невыказныя пачуцці і настроі. Узбуджаны, павольна, прайду я сярод сцягоў і штандараў уздоўж Совецкай праз Пляц Волі да свое ў дом.

І на хвіліну мяне агорне смутак.

Чым я ўспомню цябе, бязрадаснае маё юнацтва? Мне было столькі-ж год, сколькі, напэўна, таму юнаку, што ўзначальваў калону фізкультурнікаў, высока трымаючы над галавою сцяг, на якім былі напісаны вогненыя словы правадыра. Гэты юнак быў шчаслівы. Я гэта прыкмеціў па асабліваму бляску вачэй. Я-ж прыход свайго юнацтва сустрэў чатырма магіламі. Памер бацька, а следам за ім брат і дзве сястры ў адзін тыдзень. Гэта страшэнна мяне змагло. Як старэйшы, я стаў «гаспадаром» і карміцелем сям'і. Пан прагнаў з арандаванай зямлі, як не аднойчы тыя ж польскія паны праганялі майго бацьку, прымушаючы вандраваць па свету. З жабрака «уласніка», я ператварыўся ў жабрака-пролетара, чорнарабочага ў бровары. У гэтым бровары я працаваў тры гады, і зазнаў там такога пекла, якога яшчэ не ведаў у сваім жыцці.

Вось як сустрэў я цябе маё юнацтва, вось як я вышаў «у людзі», у жыццё.

Прыкладна ў гэты перыяд я і пачынаю складаць свае горкія песні.

Захавалася ў мяне адна фатаграфія. Мне да болю цяжка глядзець на яе. Я сфатаграфаваны там у сялянскай світцы—на мяне глядзіць белакуры твар юнака-селяніна. Ці-ж не паказальная гэта фатаграфія! Сялянскі хлапец, праняты вялікай верай у будучыню свайго народа, поўны энтузіязма і паэтычнага запала, я разам з такімі-ж як і я маімі таварышамі паэтамі, былі галасамі забітага і замучанага да крыві польскімі панамі і царскімі сатрапамі слаўнага народа. Мы імкнуліся выражаць думы народа, яго крыўду, яго пакуты. Плакалі разам з ім, гнеўна бунтавалі і верылі ў яго будучыню. Мы былі бунтарамі наіўнымі. У гэты час рабочы клас на чале з партыяй большэвікоў выкоўвалі волю народа, вялі яго да соцыялістычнай рэволюцыі.

Царскія сатрапы душылі маю песню. Стараліся, каб яна не дайшла да народа. Зборнікі вершаў, як праз турэмныя муры і краты, павінны былі прабрацца праз рагаткі цэнзуры, каб дайсці да чытача. Па-беларуску кнігі забаранялі друкаваць. Ды і хто іх мог друкаваць? «Дабрадзейныя» мецэнаты. Але такіх было вельмі мала. А калі ўжо друкавалі, дык тыраж іх быў мізэрны. Калі кніга «Жалейка» вышла з друку, дык яе двойчы канфіскавалі.

Тыраж усіх маіх кніг да рэволюцыі складае не больш 10 тысяч экземпляраў, у той час, як пасля рэволюцыі выдадзена больш 225 тысяч экземпляраў кніг. Апрача гэтага, яны вышлі на рускай, украінскай, польскай, літоўскай, яўрэйскай мове.

Хто мяне прыкмячаў да рэволюцыі, хто пра мяне клапаціўся? У гэты радасны дзень XX Кастрычніка я павінен заявіць, што хаваю на працягу многіх год чысцейшую і бязмежную любоў у сваім сэрцы да вялікага рускага народа і яго геніяльнага пісьменніка А. М. Горкага, які ў тыя беспрасветныя і горкія дні быў адзіным чалавекам, што заўважыў маю песню. Да слёз мяне расчуліў тады цёплы водгук Аляксея Максімавіча і яго пераклад верша «А хто там ідзе?».

У гэтым-жа сэрцы ёсць месца для праклящця беларускім буржуазным нацыяналістам, якія бессаромна і подла імкнуліся спекуляваць маёй творчасцю, цягнучы мяне ў балота шавінізма і ідэалізацыі цяжкай і пакутнай прошласці майго народа.

Але песню не ўтрымалі ў кратах ні царская цэнзура, ні банда Луцкевічаў.

Яна дайшла да народа, народ яе па-сапраўднаму пачуў, дзякуючы Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі і яе геніяльным правадырам Леніну і Сталіну, якія далі соцыяльнае і нацыянальнае вызваленне ўсім народам былой царскай імперыі, у тым ліку і беларускаму народу.

У той момант, калі думка мая спынілася на Вялікім Кастрычніку, я схіліў сваю галаву перад святой памяццю гераічных барацьбітоў, якія аддалі сваё жыццё за лепшую будучыню дарагой радзімы.

Правільна сказаў наша сонца Сталін: «Прыемна і радасна ведаць, што кроў, багата пралітая нашымі людзьмі, не прайшла дарма».

Зрок мой ахапіў карту Радзімы. Я пабачыў новыя гарады, якія ўзняліся на пустэчы, чырвоны сцяг, які пераможна палымнее над сцюдзёнай Арктыкай, індустрыяльныя гіганты. Я ўспомніў магутнасць нашай Чырвонай Арміі, слаўных сокалаў, якія нясуць славу нашай краіны праз мацерыкі, я ўспомніў дзень сталінскай дэмакратыі 12-га снежня, і твар дзяўчынкі, якая працягвае ружы Сталіну, уліў у маё сэрца невыказную радасць. Два радкі з верша «Беларусі ордэнаноснай» прышлі мне на памяць:

Чым ты была Беларусь мая родная?
і другі:
Беларусь мая радзіма, як-жа расцвіла ты?

Некалькі часу таму назад я даведаўся, што заходне-беларускія нацыянал-фашысты называюць мяне большэвіком.

Тут яны не памыліліся.

У гэты радасны дзень XX Кастрычніка я заяўляю:

Так, я сам лічу сябе беспартыйным большэвіком і гэтым ганаруся. Я з радасцю буду выконваць усе тыя задачы, якія паставіць перада мной партыя большэвікоў.

Я аддам усю сваю творчасць, а калі трэба будзе—і жыццё за вялікую справу нашай совецкай бацькаўшчыны, за справу Леніна—Сталіна.

Янка КУПАЛА.

Хочацца спяваць радасныя песні

Нам, совецкім акторам, самым шчаслівым акторам ва ўсім свеце, Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя прынесла бязмежную павагу і любоў працоўных, партыі і ўрада, штодзённыя клопаты якіх мы штохвіліну адчуваем.

Я нарадзілася ў сям'і чыгуначнага служачага, і ніколі ва ўмовах цар-



скай Расіі не магла-б і марыць стаць вядучай артысткай Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Нагогул, хто на Беларусі тады мог марыць аб сваім нацыянальным тэатры! Не адважваліся нават адкрыта праспяваць беларускую народную песню, прачытаць беларускую кніжку, бо беларускі народ, як і іншыя нацыянальнасці царскай Расіі, былі пад найцяжэйшым прыгнётам самаўладства, капіталістаў і памешчыкаў. Вялікі Кастрычнік 1917 года вызваліў працоўны народ ад соцыяльнага і нацыянальнага ўціску. Дзякуючы правільнасці правядзення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, дзякуючы правадыру народаў таварышу Сталіну, кожнай нацыянальнасці, увахо-дзячай у магутны брацкі Саюз совецкіх соцыялістычных рэспублік, забяспечана шчаслівае, радаснае жыццё, росквіт культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу.

Нядаўна цэлы рад вядучых работнікаў нашага тэатру, у тым ліку і я, былі пасланы ў творчую камандыроўку ў Маскву, каб папоўніць свае веды, займаючыся ў лепшых педагогаў Масквы, паглядзець лепшыя пастаноўкі нашых вядучых тэатраў, паслухаць нашых лепшых майстроў-вокалістаў, скрыпачоў, пабываць у музеях, на выстаўках і т. д.

Шчыра любячы народную песню, вывучаючы яе, робячы яе здабыткам масы, я чэрпаю ў ёй сілы для сваёй творчасці на опернай сцэне, ствараючы той ці іншы вобраз. Працуючы ў даны момант над вобразам рашучай энергічнай Аксіні («Ціхі Дон», музыка Дзержынскага), я шукаю цэльнасці яе вобраза ў народнай песні, прачытваю літаратуру па гэтаму пытанню. І ў даным выпадку таксама народная творчасць з'яўляецца невычарпальнай крыніцай і найкаштоўнейшым дапаможнікам для маёй работы.

Увага і любоў, якімі нас абкружаюць партыя і працоўныя,—бязмежны. Да дня 20-й гадавіны Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі наш калектыў атрымлівае выдатнейшае тэатральнае памяшканне, абсталёванае па апошняму слову тэхнікі. Праца ў гэтым тэатры—справа гонару кожнага работніка тэатра. І мы павінны прыкласці ўсе свае сілы, увесь свой вопыт, веды, каб гэты тэатр стаў сапраўдным праваднікам соцыялістычнай культуры ў масы. Паказваючы ў тыповых, характэрных вобразах героіку Сталінскай эпохі, мы павінны імкнуцца зрабіць іх сапраўды жывымі, якія абуджалі-б глыбокія пачуцці і думкі совецкага гледача і клікалі яго да далейшых перамог соцыялізма.

Хочацца спяваць радасныя, вясёлыя, шчаслівыя песні—песні аб радасным жыцці, да якога прывёў нас вялікі правадыр працоўнага чалавецтва таварыш Сталін.

ЛАРЫСА АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ,
заслужаная артыстка БССР.

КАСТРЫЧНІК ДАЎ НАМ УСЁ

Што мне дала Вялікая соцыялістычная рэволюцыя? Мне нават цяжка адказаць на гэтае пытанне. У дні вялікай рэволюцыі я быў дзесяцігоднім хлопчыкам. Так што Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя дала мне ўсё—я ўступіў у жыццё вызваленым чалавекам. Для мяне ўсё было адчынена. Я мог працаваць і вучыцца дзе хачу і на што хачу. Я мог сабе выбраць любую прафесію і ўдасканальвацца ў той ці іншай галіне. Для мяне быў адчынены шырокі шлях жыцця. Я не павінен быў думаць аб процантнай норме ў школах, я не павінен быў баяцца пагромаў. Я не павінен быў баяцца стаць акторам і «нават» яўрэйскім акторам, я не павінен быў баяцца і сароміцца той прафесіі, якая лічылася ганебнаю. Я—грамадзянін нашай Вялікай Соцыялістычнай радзімы. Пра мяне ўжо клапаціліся наша партыя, наш урад. Я толькі павінен быў намеціць сабе шлях—прафесію. І я абраў сваю прафесію—стаў яўрэйскім акторам. І як толькі для мяне стала ясным, што я хачу ўдасканальвацца ў гэтай галіне, мне як грамадзяніну свабоднай совецкай краіны, былі прадастаўлены ўсе магчымасці для ажыццяўленя маёй мары.

У 1923 годзе я паехаў у Маскву вучыцца ў Беларускім дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва. Хто мог калі-небудзь сабе ўявіць, каб яўрэйскі хлопчык, сын незаможных бацькоў, зможа вучыцца ў Маскве, на Чырвонай плошчы і ў харомах Барыса Гадунова... Не толькі ўявіць, але і марыць пра гэта не маглі. Хто мне даў гэту магчымасць, магчымасць развівацца і ўдасканальвацца, не думаць пра тое, што сёння я працую, а заўтра буду беспрацоўным? Хто мне даў магчымасць кончыць Тэатральны інстытут і працаваць у Дзяржаўным яўрэйскім тэатры Беларускай Совецкай Соцыялістычнай рэспублікі? Каму мы абавязаны нашымі поспехамі, нашымі радасцямі? Мы абавязаны ўсім гэтым нашай вялікай партыі Леніна—Сталіна, якая вызваліла наш яўрэйскі народ, як і ўсе народы нашага магутнага Совецкага Саюза, ад цёмнага царскага прыгнёту. Мы найшчаслівейшыя людзі ў свеце. Вялікая Сталінская Канстытуцыя дае нам права на працу, права на адпачынак, права на



асвету. Нідзе ў свеце няма такой канстытуцыі. Цяпер я мару пра тое, як у гістарычны дзень 12-е снежня я, грамадзянін совецкай краіны, пайду выбіраць дэпутатаў у Вярхоўны Совет, і першы мой голас я аддам таму, хто даў нам шчаслівае і радаснае жыццё, таму, хто пра нас клапоціцца кожны дзень, таму, хто нас выпеставаў, таму, каго мы любім, як роднага бацьку,—нашаму, роднаму, любімаму, дарагому правадыру таварышу Сталіну. Яму я аддам не толькі свой голас, але і жыццё, сваё, калі яно спатрэбіцца.

Артыст Дзяржаўнага
Яўрэйскага тэатра БССР *А. Е. Трэпель.*

Створым вобразы сталінскай эпохі

З вялікім хваляваннем сустракаю 20-ую гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Радуюся і шчаслівa, што я, як і мільёны другіх, вышаўшых з народа, з беднаты, у мінулым абяздоленых і эксплаатуемых, набыла права на працу, права на адпачынак, права на асвету, і ўсё, што запісана залатымі літарамі ў вялікай Сталінскай Канстытуцыі. Не магу знайсці такіх слоў, якія па-сапраўднаму маглі-б выравіць маю ўдзячнасць, маю любоў да нашай партыі Леніна—Сталіна, да нашага бацькі, настаўніка і друга вялікага правадыра народаў любімага Сталіна за ўсё тое, што я дасягнула за годы соцыялізма!

І шчаслівы будзе той дзень для мяне, калі я падыйду да выбарчай урны і прагаласую за чалавека, які прынёс нам шчасце,—за таварыша *СТАЛІНА*.

Я з асаблівай радасцю і хваляваннем рыхтавала ролю ў кастрычніцкім спектаклі «Сям'я Авадзіс». Я хачу паказаць у ролі Сары, маці сям'і Авадзіс, жанчыну з народа, якая любіць сваіх дзяцей, любіць сваю радзіму, усведамляе свой абавязак перад соцыялістычнай краінай.

Я не хочу, каб гэта маці нагадвала мацярэй класікаў Шолам-Алейхема, Мендэле Мойхерсфорым. Гэта маці другая—яна дае згоду малодшаму сыну, замяніць на граніцы брата, што загінуў у сутычцы з налётчыкамі японцамі, бо разумее важнасць гэтага ўчынку. Але гэта жанчына не зжыла традыцыі мінулага. Аплакваючы сына, яна сядзіць «шыва». Але і будучы ў вялікім горы, гэта маці не забывае пра жыццё, яна хоча ўзяць на выхаванне дзіцянё. І ў канцы прыходзячы на заставу, дзе месца загінуўшага сына заняў яе малодшы сын, яна перапоўнена радасцю за сваіх дзяцей. Інтуітыўна адчувае яна гераізм эпохі, і звaрачаючыся да ўсіх кажа: «Калі тут паміраюць па іншаму і нараджаюцца па іншаму».

Вельмі хочацца мне, каб «мая» маці



выклікала асацыяцыю з многімі маткамі, якія прышлі з народа, якія хоць і не зжылі ў нейкай меры старыя традыцыі, але разумеюць сучаснае, і захоплены ім.

Калі мне у якой-небудзь ступені гэта ўдасца я буду шчаслівa, што іменна да гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі я ствару такі вобраз.

Ю. С. АРОНЧЫК.
Артыстка ЯДТ БССР.

Шлях мільёнаў

У гэтыя дні хочацца агляну́цца назад, на сваё мінулае. Ці ведаў мой бацька, майстар па крыццю дахаў з Сянно, аб існаванні оперы? Не. У сучасны момант, у рэзультаце заваёў Кастрычніка, мне прадастаўлена магчымасць працаваць і расці ў сталічным тэатры. Я належу да пакалення, якое выхоўвалася ў совецкі час. Любоў да музыкі я праявіла на вечарах самадзейнасці ў школе і педтэхнікуме. Сур'ёзна пачала займацца спяваннем з 1930 года, калі была прынята ў Менскі музычны тэхнікум. Два гады напружанай працы, і ў 1932 годзе упершыню я выконвала партыю Міхаэлы ў оперы «Кармен». Побач з работай у тэатры займалася ў Кансерваторыі, якую кончыла ў 1937 г.

Кожнае новае выступленне ў оперы і на канцэртах выклікае яшчэ большыя патрабаванні да сябе. Усё больш узрастаючыя патрабаванні нашага культурнага гледача—рабочага і калгасніка—прымушаюць яшчэ больш працаваць над сабой, больш удасканальвацца.

Такі шлях работы і дасягненняў не толькі асабіста мой, а мільёнаў дзяўчат і юнакоў, якім партыяй і ўрадам прадастаўлены ўсе магчымасці для развіцця сваіх здольнасцей.

Д. З. КРОЗ.
Артыстка Бел. Дзярж.
тэатра оперы і балета.

МОЙ ГОНАР, МАЕ ШЧАСЦЕ

Ганаруся, берагу і ахоўваю сваё шчасце грамадзяніна і артыста Совецкага Саюза, маючага права працаваць на карысць і магутнасць сваёй радзімы. Ці магла я, дачка музыканта, марыць аб тым, каб быць вядучай артысткай Дзяржаўнага Беларускага тэатра оперы і балета...

Толькі ў нашай краіне ёсць усе магчымасці для росту талентаў, для творчага развіцця.

Сваю музычную адукацыю я пачала ў Менску. Кончыла музычны тэхнікум. Два годы вучылася ў Кансерваторыі, адначасна была ў опернай студыі. Першыя мае работы: Домна Сабурава ў «Царскай нявесце», Яраслаўна ў «Князі-Ігары», Ліза ў «Пікавай даме», Тоска ў оперы Пучыні.

Вельмі многа дала мне сустрэча з майстрамі музычнага тэатра імя народнага артыста СССР Неміровіча-Данчанкі. Зараз працую над вобразам Наталі ў оперы «Ціхі Дон» з рэжысёрам Смолічам. Я да сваёй работы прыцягваю рад падсобных матэрыялаў, як раман Шолахава, працы Леніна і Сталіна аб імперыялістычнай вайне, народны фальклор, якія адлюстроўваюць становішча і правы жанчыны да рэволюцыйнага часу. Вывучаю і ўнікаю ў музычны вобраз Наталі. Мабілізую ўсе свае творчыя магчымасці, каб стварыць жывы, праўдзівы вобраз.

Я, совецкая жанчына, артыстка беларускага народа, адчуваю найглыбейшае шчасце і радасць, што жыву ў Сталінскую эпоху ў выдатнай магутнай Совецкай краіне. Хочацца ўсе свае сілы, усе свае веды, усе свае творчыя здольнасці аддаць маёй любімай радзіме, якую вядзе комуністычная партыя і яе правадыр, наш друг таварыш Сталін—да светлага шчаслівага будучага, да комунізма.

С. Ю. ДРУКЕР.
Артыстка Бел. Дзярж.
тэатра оперы і балета.

Мяне выхавала совецкая ўлада

Сёння ўвесь совецкі народ шчаслівa і радасна святкуе слаўнае дваццацігоддзе Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі. Мне, выхаванаму совецкай уладай, асабліва блізка і родна гэтае свята. 15-гадовым хлапчуком я застаўся сіратою. Што-б было са мной пры царызме? Я быў-бы беспрытульным, прапаў бы ў голадзе і холадзе. Совецкая ўлада, аднеслася да мяне, як і да сотні тысяч маіх равеснікаў, вельмі чула і клапатліва. Мяне прымаюць у выхаванцы Чырвонай Арміі і даюць магчымасць выбіраць тую прафесію, якую хачу. Я любіў музыку і таму пайшоў абучацца ў духавы аркестр. З радавога музыканта я вырас у капельмейстра палкавога аркестра. Чырвоная Армія, якая выхавала мяне, паклапацілася і аб далейшым маім росце. Мяне накіравалі вучыцца ў Менскі музтэхнікум. А пасля сканчэння навучальнай установы мне адкрываецца шырокая дарога совецкага кампазітара.

Усім гэтым я абавязаны нашай комуністычнай партыі, любімаму правадыру таварышу Сталіну і Совецкаму ўраду.

Таму я з любоўю аддаю ўсю сваю творчасць тым, хто выхаваў мяне і стварыў усе магчымасці для плённай творчай работы.

І сёння, калі мы, совецкія кампазітары, выйдзем на вуліцы з сцягамі, прагучаць гукі радаснай музыкі, прагучаць песні, праслаўляючы нашых дарагіх правадыроў. *М. ІВАНОЎ.*

РАДАСНА ЖЫЦЬ І ТВАРЫЦЬ

XX-годдзе Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі я сустракаю з велізарным энтузіязмам. За 20 год наша краіна ператварылася ў квітнеючую краіну соцыялізма, у краіну талентаў. У нашай краіне дадзена поўная магчымасць творчым работнікам і, у прыватнасці, кампазітарам, выяўляць свае творчыя магчымасці. Асабліва гэта датычыць да кампазітарскай моладзі, да якой належыць і аўтар гэтых радкоў. У гэтым годзе я кончыў Беларускую кансерваторыю. У сучасны момант працую над операй па матывах аповесці Я. Коласа «Дрыгва» (лібрэто Рамановіча). Да XX-годдзя Кастрычніка кончыў сімфонію. Працуючы зараз над операй я ведаю, што мой твор не будзе ляжаць у партфелі, а будзе паказан нашаму совецкаму гледачу. На дэкадзе беларускага мастацтва яе ўбачыць Вялікі Сталін і кіраўнікі партыі і ўрада. Гэта думка ўлівае ў мяне велізарныя творчыя



сілы. Як шчаслівa і радасна жыць і тварыць у нашу вялікую сталінскую эпоху!

А. БАГАТЫРОЎ.

Я ШЧАСЛІВА

У дарэволюцыйны час лёс актрысы быў жудасна цяжкі. Яна цалкам залежала ад антрэпрэнёра-дзяльца, які страшэнна эксплаатаваў актрысу і ў любы час мог выкінуць яе з трупы. Вандроўнае жыццё актрысы, вечная пагроза астацца беспрацоўнай у любы момант не давалі ёй магчымасці мець дзяцей, сям'ю.

Я шчаслівa, што не ведала гэтага жудаснага жыцця актрысы дарэволюцыйнага часу, што я з'яўляюся актрысай новага шчаслівага пакалення, якое вырасла ва ўмовах Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Рэволюцыя дала мне права і магчымасць жыць свабодным, поўнакроўным, шчаслівым жыццём, шчыра і аддана працаваць на фронце тэатральнага мастацтва Беларускай Совецкай Рэспублікі, мець сям'ю і дзяцей.

У дзень вялікага свята XX-годдзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі хочацца пераглядзець увесь свой творчы шлях. За ўвесь час працы ў Беларускім Дзяржаўным тэатры мне давялося пераіграць дзесяткі самых рознастайных роляў. Але толькі некаторыя з іх прынасілі мне сапраўдную творчую радасць і задавальненне. Наша совецкая драматургія не можа пахваліцца колькасцю цікавых і поўнакроўных жаночых вобразаў, праца над якімі давала-б сапраўдную творчую радасць, а з класічных твораў наш тэатр ставіў такія, у якіх галоўнымі персанажамі былі не жанчыны.

З радасцю ўспамінаю працу над вобразамі Глафіры ў п'есе «Інга» Глебава, Марфы ў п'есе «Ярасць» Яноўскага, Дыяны ў п'есе «Падпальшчыкі» Луначарскага, Яворскай у п'есе «Мост» Рамановіча, Наталлі ў п'есе «Канец дружбы» Крапівы і ў апошні час працу над вобразамі Мурзавецкай у п'есе «Ваўкі і авечкі» і Фразіны ў п'есе «Скупы» Мальера.

А як хочацца стварыць вобраз нашай совецкай жанчыны, жанчыны-будаўніка соцыялістычнага грамадства, якіх так многа ў нашай краіне і якія да гэтага часу не знайшлі яшчэ сабе адпаведнага месца ў нашай драматургіі. Вось зараз праглядаеш увесь рэпертуар, як рускі, так і беларускі, прысвечаны да дня вялікага свята, як, напрыклад: «Чалавек з ружжом» Пагодзіна, «На беразе Нявы» Трэнева, «Зямля» Вірты, «Партызаны» Крапівы, «Кацярына Жарнасек» Клімковіча, і ў ніводнай з іх няма яскравага, глыбокага, шматграннага вобраза жанчыны.

Мы ўсе, жанчыны актрысы, чакаем такіх п'ес, якія здолеюць стварыць рад самых рознастайных і поўнакроўных вобразаў нашых совецкіх жанчын.

Зараз я працую над вобразам Каспарыхі ў п'есе «Салавей» Бядулі, прысвечанай XX-годдзю вялікага Кастрычніка.

Гэта вобраз сялянкі—маткі часоў прыгону. У гэтым вобразе я хачу з усёй праўдзівасцю і шчырасцю паказаць нашаму маладому пакаленню, як жанчына—маці ў часе прыгону мужна пераносіла ўсе цяжкасці, прыгнёт, здзекі ад паноў. Гэты вобраз яскрава пакажа нашаму гледачу, асабліва нашай жанчыне, якая розніца паміж жанчынай—сялянкай часоў прыгону і нашай совецкай сялянкай—калгасніцай, якая жыве шчаслівым, радасным, свабодным жыццём, якая мае права прымаць удзел у нашым будаўніцтве, як роўнапраўны член соцыялістычнага грамадства.

Л. РЖЭЦКАЯ.
Актрыса Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра

ЖЫЦЦЁ НАТХНЯЕ

Крыху статыстыкі. За час кампазітарскай дзейнасці да Кастрычніцкай рэволюцыі мною закончана не больш дзесяці твораў, а за дваццаць год пасля рэволюцыі—каля 30 (з іх 15 буйных). Значыць, мая творчая прадукцыйнасць узрасла амаль у тры разы.

Тлумачэнне гэтаму, вядома, простае: цяпер, калі творыш, дык ведаеш, што робіш патрэбную справу, што гэта культурная работа, якая высока ставіцца ў нашай краіне, што ты карысны член грамадства. У дарэволюцыйны-ж час велізарная большасць насельніцтва зусім нічога не ведала аб гэтай дзейнасці—кампазітарскай, а калі і сутыкалася з ёю, то лічыла гэта ў лепшым выпадку пустой забавай, тая-ж нязначная меншасць, якая магла карыстацца пладамі гэтай дзейнасці, хоць на словах і прызнавала яе пачэснаю, на справе, за нямногімі выключэннямі, заўсёды лічыла кампазітара ніжэй за сябе—чалавекам, які павінен асалоджваць бяздзейнасць гэтай меншасці. Адсюль у кампазітараў пачуццё маральнай адзіноты, сумненне ў патрэбнасці сваёй работы, што, вядома, адбівалася на прадукцыйнасці творчасці. Ды і абкружаючае тады жыццё не давала тых яркіх, радасных уражанняў, якія ў сучасны момант заўсёды настройваюць на творчы лад: хочацца як мага больш глыбока і дакладна адлюстраваць у музыцы гэта наша радаснае жыццё, якое так не падобна на тое, што працякае «там за Сулою» пад пятой азвярэлых фашысцкіх варвараў; але як-бы ні стараліся гэтыя паны—наш светлы лёс стане лёсам усіх прыгнечаных: надыйдзе сусветны Кастрычнік—і мільёны вызваленых працоўных усяго свету вольна і адкрыта далучаць свой голас да нашага голасу, што раздаецца па ўсёй нашай вялікай радзіме:

— Няхай жыве наш дарагі, наш любімы правадыр народаў Вялікі Сталін!

Н. АЛАДАЎ.



Новы Менск.
72-кватэрны дом па Совецкай вуліцы.

Фота І. Капілінскага.

Янка Купала

У літаратуру Янка Купала прыйшоў пад гром рэвалюцыі 1905 г. За плячыма яго былі 23 годы жыцця, а ў сэрцы горкая крыўда беззямельнага селяніна, які вымушаны вандраваць па краіне ад аднаго памешчыка да другога, выпрошваючы кавалачак зямлі ў арэнду. Гэту крыўду селяніна-бедняка і панёс Янка Купала на суд грамадскі. Быў як раз падыходзячы для гэтага час: працоўны народ царскай Расіі вышаў на плошчы, каб паквітацца з сваімі прыгнятальнікамі,—з царскім самадзяржаўем, памешчыкамі, фабрыкантамі.

У першым сваім вершы—«Мужык»—Янка Купала адракамендаваўся як прадстаўнік сялянскай бедняты і ў той-жа час недвухсэнсна заявіў, што «Чалавек ён, хоць мужык». А калі мужык—таксама чалавек, дык значыць ён мае права на чалавечае існаванне. Але жабрачае існаванне, ніяк нельга было назваць чалавечым.

Сам селянін, аднак, не заўсёды даволі ўсведамляў усё сваё бяспраўе і жабрацтва. Янка Купала прыходзіць тут яму на дапамогу з сваімі песнямі. У гэтых песнях, як у люстры, бачыць селянін самога сябе, сваё рыззё, сваю крыўду і гора.

Працуй цяжка дні і ночы,
Пагарду цярпі;
Сказаў праўду—дзяруць вочы,—
Вось тут і жыві!
У палацы п'юць, гуляюць,
Свецяцца агні;
Мяне-ж з хаты выганяюць,
Вось тут і жыві.

Сілы ў селяніна многа і здольнасць да працы велізарная:

Глянь, высокенькі бор,
Вокам нельга прабіць:
Загудзеў мой тапор—
Як блін, поле ляжыць.
Сошку з вышак сцягнуў,
Кабылічку ўшчаміў,
Плечы трохі прыгнуў,—
Лес на пахань зрабіў!

І не гледзячы на гэтую багатырскую сілу і працавітасць, памірае ён такім-жа голым, якім нарадзіўся на свет.

У свірны паноў-памешчыкаў, у царскую казну ды ў кішэню хабарнікаў чыноўнікаў льецца пот і кроў селяніна. Паэт заклікае да барацьбы за лепшую долю і ў адказ на свой заклік улаўлівае чулым вухам грозны поступ мільёнаў беларускіх працоўных, якія ўзняліся, каб разбіць аковы сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту («А хто там ідзе?»).

Але тых, хто пасмеў заявіць пра сваё права людзьмі звацца, цар расстраляў альбо кінуў у турму. Над Расіяй навісла чорная ноч рэакцыі. Вызваленне, якое здавалася было так блізка, стала цяпер для паэта нязбытнай марай, і баявая песня ў яго нярэдка ўступае месца суму і адчаю. Змрочныя сілуэты курганаў, крыжоў і могілак усё часцей і часцей мільгаюць на старонках яго твораў.

Адначасна адбываюцца змены і ў асабістым жыцці Янкі Купалы. Ён пакідае вёску і пераязджае ў горад, спачатку ў Вільна, а потым у Пецярбург, дзе пападае пад апеку буржуазных беларускіх нацыяналістаў. Яны спрабуюць выкарыстаць яго паэтычны талент у сваіх рэакцыйных мэтах. Фальсіфіцыруючы гісторыю, яны імкнуцца пераканаць паэта, што ідэал Беларусі ў мінулым, што быў калісьці «залаты век» беларускай культуры і дзяржаўнасці. Гэтак яны называлі няволю беларускага народа пад уладарствам польска-літоўскіх князёў.

Цяжка было, аднак, нацыяналістам утрымаць у палоне жывую палымнеючую душу паэта. Усё часцей і часцей вырываецца ён на прастор і ідзе, на голас блізкіх яго сэрцу працоўных мас.

А гора ў краіне было многа. У дадатак да штодзённага, так сказаць, буднічнага гора, награнула імперыялістычная вайна.

Усё гэта болем адклікнулася ў сэрцы паэта. Боль гэты нараджаў тварэнні, поўныя гневу і нянавісці, але часам і роспачы і жадання ўцячы ад страшэннай рэчаіснасці ў зданнёвае, падфарбаванае нацыяналістамі мінулае, альбо нават у магілу.

У шуканні шляхоў да шчасця для свайго народа ўзрокі паэта былі накіраваны пераважна ў адзін бок—у бок прыгнечаных мас сялянства. Ён як быццам нават не падазраваў, што



існуе больш магутная і арганізаваная сіла, ужо гатовая да бою за шчасце ўсяго чалавецтва і ў тым ліку беларускіх працоўных мас. Атрымалася досыць дзіўная з'ява: Янка Купала, які звыш дзесяці гадоў заклікаў лепшую долю для свайго народа, не пазнаў гэтай долі, калі яна з'явілася ў вобразе пралетарскай рэвалюцыі. Не вольны ад нацыяналістычных поглядаў, ён аднёсся да сацыялістычнай рэвалюцыі насцярожана, не зразумеў яе вялікай гістарычнай сутнасці.

Прайшоў некаторы час, пакуль Янка Купала зразумеў, што пралетарская рэвалюцыя прынесла беларускаму народу тое шчасце, якое чакаў ён доўгія годы. Ён убачыў, як на вачах у яго перарабляецца былая поўкалонія ў квітнеючую краіну сацыялізма, як выраслі людзі, якія раней і людзьмі сябе лічыць не смелі. У рэзультаце—з'явілася паэма «Над ракою Арэсай» і зборнік вершаў «Песня будаўніцтву». Гэтыя творы з'яўляюцца сапраўдным гімнам сацыялістычнаму будаўніцтву і любімаму правадыру народаў таварышу Сталіну. Тут тая-ж народнасць, тая-ж прастата, што і ў яго ранейшых творах, і тэма ў асноўным тая-ж—доля беларускага селяніна, але змест зусім іншы. У паэзіі Янкі Купалы становіцца цёпла, светла і радасна, як у хаце заможнага селяніна. Праца з праклёну, якой яна была ў мінулым, становіцца радасцю. Такой яе паказвае паэт у надзвычайным вершы «Лён».

Перад паэтам, як і перад яго народам, адкрываюцца шырокія далягляды ў будучае. Кожны з шасці сыноў у вершы Янкі Купалы «Сыны» ясна бачыць перад сабою мэты жыцця і поўную магчымасць да дасягнення гэтай мэты.

Так прайшоў свой вялікі і складаны творчы шлях Янка Купала, кіруемы любоўю да беларускага працоўнага народа. Комуністычная партыя, якая адносілася да паэта заўсёды чула, з бацькоўскімі клопатамі, зрабіла ўсё неабходнае, каб гэта любоў паэта не выключала любві да працоўных мас іншых народаў. *Кандрат КРАПІВА.*

Якуб Колас

У 1906 г. у беларускай газеце «Наша доля» паявіўся першы верш Якуба Коласа, напісаны ім яшчэ ў 1904 годзе. Малады паэт у гэтым вершы выказаў сваё паэтычнае і грамадскае «крэдо»: жыццё акружаючых яго вельмі цяжкое і нешчаслівае, паэт не можа дапамагчы іх гору сваёй песняю. І з таго часу да самай рэвалюцыі паэт спяваў сваю бясхітрасную простую песню аб цяжкім жыцці свайго народа, імкнучыся ўдыхнуць у яго жаданне змяніць існуючы лад жыцця. Часам гэтая песня узнімалася да прамога заклiку «перавешаць паноў», як адзіны шлях здабыць зямлю, часам яна гучэла стомлена і бесперспектыўна, але заўсёды, яна была сагрэта любоўю да прыгнечанага роднага народа.

Колас пацягнуўся сэрцам і думкамі да бушаваўшай тады віхуры рэвалюцыі 1905 года. І яго ліра загучэла сурова і палка:

Ужо даўно вяроўкі
Вас, паны, чакаюць
І па вас асіны
Слёзы праліваюць.

Ён адчуў вялікае дыханне ўсенароднага бунту і прабаваў выразіць яго ў творчасці.

У 1908 годзе за ўдзел у настаўніцкім з'ездзе Коласа кідаюць на тры гады ў менскую турму. Але ні ўплыў нацыяналістычнай інтэлігенцыі, ні турма не маглі перамагчы ўплыву рэвалюцыі. У турме Колас піша рад адточаных эпіграм, вершаў—памфлетаў супроць свайго ворага—царскага самаўладства. Тут і малебен аб «другім і апошнім Міколе», які нікому не патрэбны, тут і «Асадзі назад», верш аб грозным вокрыку начальства ў адносінах да бедняты. На жаль, Якуб Колас не ўтрымаўся на гэтых пазіцыях, і не адна турма была тут віною. Вядома, турма навявала сумныя думкі і песні, зніжала баявы настрой, але глушыла іх «Наша Ніва», нацыяналістычная газета, якая прэтэндавала на прадстаўніцтва ад «імя беларускага народа» ў вачах тагачаснай грамадскасці (у ёй друкаваўся Колас). Сабраўшы вакол сябе тагачасных паэтаў і пісьменнікаў, «Наша Ніва» старанна апрацоўвала іх у нацыяналістычным духу. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў радзе вершаў Якуба Коласа і—што асабліва шкада—у яго вялікай паэме «Сымон Музыка». Паэма «Сымон Музыка»—твор аб лёсе таленавітага музыкі з народа. З уласцівым Коласу майстэрствам у гэтай паэме рэалістычна паказаны быт сялянскай бядняцкай сям'і, думкі і перажыванні таленавітага пастуха, яго уцяканне з дому і першая сустрэча з памешчыцкай культурай. На жаль, пад уплывам нацыяналістаў Колас не ўтрымаўся на рэалістычных пазіцыях, ён надаў вобразу Сымона Музыкі нейкую сімвалічнасць, якая павінна была ўвасабіць у ім калі не самое мастацтва наогул, дык ва ўсякім выпадку музыкальную народную душу. І гэта знізіла ўзровень добра задуманай і добра выкананай рэалістычнай паэмы. Другая паэма—«Новая зямля» выдатная дэтальным апісаннем жыцця беларускага селяніна (нездарма многія яе называюць энцыклапедыяй сялянскага жыцця), яго радасцей і гора, па-майстэрску нарысаванымі пейзажамі і глыбокім адлюстраваннем барацьбы селяніна за зямлю. Уплыў нацыяналістаў на Ко-



ласа быў такі моцны, што Кастрычніцкую рэвалюцыю Колас сустрэў непрыязна. Нацыяналістычны туман засланіў перад ім тыя вялікія ідэалы, за якія ён у свой час змагаўся разам з сялянскай беднатой. Ненавідзячы пана адвечнай нянавісцю напоўгалоднага сялянства, Колас, аднак, не зразумеў, што канчатковае вызваленне ад пана магчыма толькі пры дыктатуры пралетарыята.

Разгром нацыяналістаў у 1929 годзе, выкрыццё іх здрадніцтва ў адносінах да радзімы і беларускага народа, выкрыццё іх ролі, як польскіх і нямецкіх шпіёнаў—адштурхнула Коласа ад нацыяналізма. Колас перагледзеў свой пройдзены шлях, асудзіў свае хістанні і памылкі і цвёрда стаў на шлях актыўнага служэння сацыялізму. Гэты перыяд стаў перыядам росквіту яго творчых сіл. Ён напісаў дзве аповесці—«Адшчапенец» і «Дрыгва», многія раздзелы з вялікай паэмы «На шляхах волі», дзве п'есы—«Вайна вайне» і «У пушчах Палесся», шмат вершаў аб сацыялістычным будаўніцтве. Асаблівы поспех выпаў на долю аповесці «Дрыгва», у якой паказаны шлях старога Талаша, ад звычайнага вясковага селяніна да арганізатара партызанскага атрада і сялянскага палкаводца, які наводзіў страх на польскія армейскія атрады. У гэтай аповесці выявілася майстэрства Коласа, яго веданне сялянскага быта, веданне вёскі, уменне даць просты, але захапляючы расказ аб самых звычайных рэчах, уменне пабудаваць цікавы сюжэт, уменне даць беларускі пейзаж, уменне выкарыстаць народныя матывы, народную мову, вобразы.

Партыя вяла барацьбу за Коласа, супроць нацыянал-фашыстаў, партыя цярпліва растлумачвала Коласу яго памылкі, па-большэвіцку крытыкавала яго слабасці і зрывы, партыя выхоўвала Коласа, уцягвала яго ў актыўную работу па сацыялістычнаму будаўніцтву; і народны паэт рэспублікі не адзін раз выказваў партыі Леніна—Сталіна сваю найвялікшую сардэчную ўдзячнасць за сапраўды бацькоўскія клопаты аб ім. Вялікай цеплынёй і пяшчотнасцю гучыць яго ліра, калі ён гаворыць аб правадыру народаў, аб лепшым другу Совецкай Беларусі—аб таварышу Сталіну.

М. КЛІМКОВІЧ.

Змітрок Бядуля

Папулярнейшы беларускі белетрыст Змітрок Бядуля выступіў на літаратурную арэну ў 1910 годзе. Ён адразу звярнуў на сябе ўвагу як арыгінальны талент. Ён працуе і ў галіне верша і ў галіне прозы. У вершах яго пераважалі эпічна-суровыя карціны прыроды; часта ў іх з вялікім майстэрствам выкарыстоўваліся вобразы народнай міфалогіі. Вершаваныя творы Змітрака Бядулі склаліся пад уплывам рускіх і беларускіх сімвалістаў.

Найбольш каштоўнымі з'яўляюцца рэалістычныя апавяданні пісьменніка, якія ўвайшлі ў зборнік «На зачараваных гонях». Трэба вылучыць навелы: «Пяць лыжак заціркі», «Малыя дрэвасекі», «Вялікодныя яйкі», «Чараўнік», «Ашчаслівіла», «Сорам», «Панас на небе». Бядуля ў сваіх навелах раскрывае (вельмі часта і пры дапамозе гумара) трагічныя бакі дарэвалюцыйнай убогай, забітай беларускай вёскі. Ва ўсіх гэтых творах пісьменніка вобраз селяніна—бедняка,—якога ненавідзіць вясковае начальства,—даведзенага падаткамі, беззямеллем да жабрацтва, бедняка, над якім здзекваецца кулацтва—паказаны з вялікай сілай.

Да Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Змітрок Бядуля прышоў з вялікім грузам буржуазнага нацыяналізма, пачэрпнутага ім у «нашаніўскім» асяроддзі.

Пасля Кастрычніка Бядуля паступова пакідае вершы і пераходзіць выключна да мастацкай прозы. Ужо ў першыя годы рэвалюцыі ён даў рад майстэрскіх апавяданняў на тэму грамадзянскай вайны. Апавяданні Бядулі лаканічныя, кароткія, дзея ў іх гранічна насычана, сюжэт яркі. І цяпер пісьменнік звяртаецца да тэмы дарэвалюцыйнай беларускай вёскі. З-пад яго пяра з'яўляюцца такія апавяданні, як «Дванаццацігоднікі», «Бондар». У іх Бядуля паказвае гордасць мужыка перад тварам паноў. Гэтак селянін Лявон адпомсціў за ўсю вёску арандатараў, якія былі сагнаны панам з зямлі, якою яны карысталіся здавён-даўна. Лявон падпаліў новапабудаваны маёнтак пана і сам заявіў яму пра гэта.

Літаратурная творчасць З. Бядулі пасля Кастрычніка шматгранна і кольказна багатая. Няма магчымасці тут хаця-б каротка спыніцца на ўсіх яго творах. Таму звернемся да галоўных з іх.

У 1927 годзе З Бядуля напісаў раман «Салавей», а на працягу 1928—1931 года—вялікі двухтомны раман «Язэп Крушынскі».

«Салавей»—адна з нямногалікіх спроб у беларускай літаратуры увасрасіць эпоху прыгонніцтва, намаляваць змрочную карціну прыгнечання працоўнага сялянства. З. Бядуля абраў для сваёй аповесці каларытную фігуру прыгоннага актора Сымона Салаўя. Салавей пераймае голас звяроў і птушак. Пан хоча паказаць яго ў тэатры, як цуда. Але душа ў Салаўя змучана беззаконнямі, катаваннямі і здзекамі, якія чыняць паны над сялянствам. Ён паўстае, помсціць за сваё аплёванае каханне, ён «не хоча быць панскім салаўём». І паўстаўшы, ён помсціць за ўсё прыгнечанае сялянства. Як у народнай казцы, ён тройчы перахітрыў пана. Нарэшце, разам з чорнабародым Язэпам ён узнімае паўстанне сярод сялянства. Гарыць панскі маёнтак, паўстаўшы народ помсціць за свае многавяковыя пакуты.

Раман «Салавей» з'яўляецца значнай зброяй у нашай барацьбе супроць польскіх паноў. Вельмі трапна, гумарам і бічуючай сатырай выкрывае іх Бядуля. Асабліва падкрэслівае ён жорсткія, утончана-іезуіцкія метады здзекаў польскіх паноў і ксяндзоў над працоўным беларускім народам.

Раман «Салавей» з'яўляецца адным з лепшых твораў беларускай совецкай літаратуры.

Менш удалым аказаўся вялікі двухтомны раман Бядулі «Язэп Крушынскі». Ён меў сваёй мэтай паказаць подлую дзейнасць кулакоў на вёсцы. Крушынскі не шаржыраваны, не плакатны кулак. Ён змог так уцерціся ў



давер'е да некаторых работнікаў, что яны яго, першага кантрабандыста, ненасытнага звера, лічаць прыкладным актывістам, «культурным гаспадаром». Газеты друкуюць пра яго артыкулы, партрэты яго. Тым часам «культурны гаспадар» звязвае ўсю сваю дзейнасць з контррэвалюцыйнай нацыяналістычнай арганізацыяй, групуе вакол сябе кулацтва, атручвае жывёлу ў комуне, робіць замахі на жыццё комунараў, сам пры гэтым вонкава «астаючыся ў баку». Бядулі ўдалося паказаць подлыя метады дзейнасці кулака. Але ён не змог пры гэтым паказаць у вёсцы сілу, якая супроцьстаіць Крушынскаму. Асабліва гэта адчуваецца ў першай кнізе рамана, якая напісана яшчэ ў 1928 годзе.

Другая-ж кніга ў стылявых адносінах рэзка адрозніваецца ад першай. Маючы пахвальны намер паказаць дзейнасць нацыянал-фашыстаў у Совецкай Беларусі, аўтар не знайшоў у сабе даволі палітычнай спеласці, каб паказаць нацыянал-фашыстаў ва ўсёй іх звярынай істоце, не выкрывае іх як шпіёнаў і дыверсантаў польскага фашызма.

Усё-ж кніга З. Бядулі з'яўляецца адной з сур'ёзнейшых спроб паказу вобраза кулака ў беларускай совецкай літаратуры.

Пасля рамана «Язэп Крушынскі» Бядуля надрукаваў аўтабіяграфічную кнігу «Наліжэнне». Да дваццатай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр ставіць яго п'есу «Салавей».

Прастата мовы, займальнасць, яркасць вобразаў зрабілі Бядулю папулярнейшым пісьменнікам сярод народных мас Совецкай Беларусі.

А. КУЧАР.

Міхась Лынькоў

На даху вагона

(Урывак з рамана „Сенька Сакол“)

Дым вылятаў з паравоза сударгавым ахлоп'ем і адразу прыпадаў да зямлі, палахліва нік між дрэў, між кустоў, між штабялямі гнілых шпал.

Было ветрана, сыпаў халодны восенскі дождж.

Паравоз яўна знямог, закашляўся, папярхнуўся сваім уласным кашлем і стаў. Жалобна дзвынкнуўшы буферамі, сталі вагоны.

На секунду замоўклыя спрэчкі ўзгарэліся з новаю сілай, з той толькі розніцай, што некаторыя са спорщчыкаў прыўзняліся з сваіх месц, каб на даху пахадзіць і размяць здзервянелыя ад доўгага сядзення ногі. Але на даху вагона не разгуляешся—вузкая пляцоўка даха цесна застаўлена клумкамі, убогімі салдацкімі набыткамі, перагружана людзьмі ў шэрых прамоклых шынелях. Зямлістыя твары хмура пазіралі з настаўленых каўняроў, людзі не хацелі рухацца, мяняць належаныя і ўпрэтыя месцы. Тут-жа прытуліліся некалькі чалавек у штацкім. На невялічкім чамадане сядзеў не стары яшчэ попік, відаць з вясковых. Ён палахліва азіраўся навакол, прыслухаўся да спрэчак, безнадзейна пазіраў на паравоз, і змахаючы з носа назольныя дажджавыя каплі, нешта бурчэў сабе пад нос. Чулася толькі—божа, божа...

— А ты, бацюшка, прывыкай... Гэта табе не ў класах ездзіць, не на спружынах. Табе-б, бацюшка, у акопах пасядзець хоць дзень, вот бы пазнаў тады бога і яго святых ангелаў... А то што...

Пажылы салдат гаварыў гэта ціха, бяззлобна і бязгучна смяяўся ў павіслыя пракураныя вусы. Попік сціснуўся ў камяк, запахваў рукавы, расы, рукі засоўваў за пазуху, каб сагрэцца. Побач з ім сядзеў чалавек у куцым паліто, выцвілай каракулевай шапцы. Ён штохвілінна знімаў акуляры і торапка, хапаючыся, праціраў іх. І як толькі надзяваў іх, рашуча пазіраў на ўсіх і кідаў многазначна:

— Так, так... а яно пачынаецца... пачынаецца ўжо...

— Што пачынаецца? Што ты вярзеш?—нарэшце запыталі яго. І чалавека нібы прарвала. Ён падскочыў, як нахохлены варабей, замахаў рукамі, пасыпаў словамі, як кулямёт:

— Так... так... Пачынаецца... Вот калі насуваецца гібель на нас, на нашу радзіму, на вялікую матушку Русь... Да чаго давялі дзяржаву... Дзе жалезныя палкі твае, дзе падзелася слаўная абарона, няўміручая слава сцягоў баявых... айчына, айчына!

— Эге! Знаёмыя песні... Чулі мы іх... Далоў! Сядай! Пратры акуляры свае, салавей!—закрычалі навакол.

— А вот і не сяду! Вот праўду буду вам гаварыць, у вочы, каб праняла яна вас, каб апамяталіся вы, што робіце, каго слухаеце... Немец навіс над Расіяй, а вы... вы з фронта далоў...

— Хопіць, наваяваліся, ідзі сам павраюй... Добра яму ў хаце седзячы...

— Хто сядзіць? Я можа на катарзе жыццё сваё загубіў... Я можа супроць цара ішоў за агульнае наша шчасце і свабоду... А вы, вы губіце свабоду, вы слухаецеся нямецкіх шпіёнаў, вы падаецеся на вудачку большэвікоў...

— А ты... — тут пад самы аратарскі нос падсунуўся звычайны салдацкі кулак, агрубелы, валасаты, кастлявы.—Ты, гніда... ты замоўч... Замоўч, гавару... Ты пра большэвікоў тут не гавары, не твайго то розуму справа. Бачыш ты яго! На катарзе быў... За свабоду стаяў... А цяпер буржуйскія зады стаў лізаць... Яму, бач, большэвікі перашкаджаюць... — і моцныя рукі пасадзілі аратара побач з папом.

На даху зашумелі галасы, пачуліся пагрозы, некаторыя ўзяліся за вінтоўкі. Загудзеў паравоз, пасунуўся далей цягнік, а на даху не змаўкалі суровыя спрэчкі.

— А хіба не ведаюць усе, што большэвікі ў закрытым вагоне, за нямецкай пячаткай, прыехалі, каб фронт развaліць, каб немцаў пасадзіць на нашу шыю.

— Слухай ты буржуйскія казкі!—прыміральным тонам гаварыў ужо салдат. Яны нагаворацы...

— А хіба-ж не праўда, што большэвікі фронт зрываюць, што яны свабодную ўладу скінулі, міністраў арыштавалі, хочуць вунь і стаўку нашую разагнаць?

— Ну, праўда! Скінулі, арыштавалі буржуяў, і стаўку разгоняць, дзе яна



«НА ЛЫЖАХ». Карціна мастака— самавучкі чырвонаармейца Вернаутава.
Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

дзенецца... Чаму-ж ты так за Керэнскага?

— А за кім пайсці загадаеш? У Керэнскага закон і парадак... За Керэнскім уся Еўропа ідзе і нас падтрымае.

— Каго гэта—нас?

— Народ.

— Народ розны бывае... Скажам, вот мы, салдаты, ды сяляне там, ды рабочы чалавек—гэта народ, сапраўдашны народ... Ён і ў акопах сядзіць, ён і рэвалюцыю робіць, ён і дзяржаву трымае... А вот яшчэ буржуі сядзяць, ды розныя там з капіталам, ды генералы, паны з граф'ямі—з гэтым народам нам кашы не зварыць. За які-ж народ ты галасуеш?

— За увесь... Народ — гэта Расія, гэта айчына. Айчыне патрэбны і рабочыя, і салдаты, і сяляне. Айчыне патрэбны і генералы, і людзі з капіталам...

— Так, так... — падтрымаў яго чалавек у акулярах.—Кожны на сваё месца: рабочы да станка, селянін да сахі, салдат у акопы, а настаўнік — народ вучыць...

— А буржуй?—кінуўшы круціць цыгарку, запытаў стары салдат.

— Кожнаму сваё месца...—ухіліўся ад прамога адказу ружовашчокі. І не такі цяпер час, каб сваркі ўзнімаць за гэтыя месцы. На тое і свабоду атрымалі, каб агульнымі сіламі вырашыць увесь далейшы парадак. Прыдзе вот Устаноўчы сход, ён і дасць усяму закон і месца.

Некаторым напрыкучылі спрэчкі, і яны слухалі іх безуважліва, хутаючыся ў каўняры шынеляў ад восенскага ветру. Слухалі і пасмейваліся, зрэдку ўстаўляючы вострае слова, каб падагрэць аратара, паддзець яго. Ружовашчокі бачыў, як дарэмны ўсе яго спробы, усе яго довады супроць большэвікоў. І ён пусціў у ход свой апошні козыр.

— А вы чулі, большэвікі пазакрывалі ў Петраградзе ўсе газеты?

— Раз буржуазныя, дык і трэба было закрыць...

— Трэба... трэба... А хіба наша свабода не дае свабоды для слова? Дзе гэта відана, пры якіх рэвалюцыях закрывалі газеты... Вунь Французская рэвалюцыя...

— Ты нам байкі не расказвай...—на хвіліну замяшаўся пажылы салдат, які заўзята спрачаўся з ружовашчокім.—Пры чым тут газеты...—ён яўна не ведаў, як быць з гэтай тонкай справай. Але тут умяшаўся матрос, які ляжаў увесь час з завязанай шчакой і маўкліва сачыў за аратарамі. Пацёршы шчаку, ён сказаў:

— На буржуйскую свабоду нам начхаць... І на іхнае слова...

Аратар аж падскочыў на месцы.

— Вам на ўсё начхаць... Вы начхалі на народ, на вайну, вы начхалі на святую радзіму-маці... Дызертыры.

Грамоздкі, нязграбны ўзняўся са свайго месца матрос. На яго бледным твары ігралі сцятыя сківіцы, ліхаманкава гарэлі вочы, дрыжэлі сцятыя кулакі. Ён пераступіў праз мяшок, пасунуўся да аратара, наблізіўся да яго так, што той пахіліўся галавой назад, палахліва прыслухаючыся да гарачага дыхання матроса, да яго слоў. Яны цадзіліся скрозь зубы і падалі: цяжкія, вострыя, хвалюючыя:

— Ты ўсё пра радзіму... у бога твайго хрыста, у багародзіцу-маці...

Ён рэзка рвануў свой бушлат і падставіў валасатыя грудзі насустрач стылым вятрам. Ціха варушыліся кучаравыя завіткі валос, на іх асядалі рэдкія каплі дажджу, шырокі рубец чырванеў пад цельнікам.

— Вось твая маці, маці-радзіма... За яе ваяваць... За веру, цара, за слаўную айчыну, за яе падстаўлялі лбы і грудзі... Быў чалавек і няма чалавека... А калі і застаўся—дык адна відзімасць—сэрца ў яго халадзее і стыгне кроў, таму ў дзірках увесь ён... За веру, цара і айчыну, у бога твайго і апосталаў... А дома братоў нашых айчына ў турмах трымае за асіну з панскага лесу... Апошнюю кабылёшку цягнуць з двара за падаткі... дзеці свае пузам свецяць, лахманамі прыбраныя, жонка ходзіць жабрачкай... Радзіма, радзіма... Не, не за гэтую мы радзіму, будзь яна тройчы праклятай ад нас... Мы любім радзіму, другую радзіму... І мы знойдзем яе,—хоць лопнуць ад злосці ўсе буржуі на свеце, і тыя, хто цалуецца з імі... Эх ты!.. свісцелка буржуйская... Пустабрэх...

Матроская злосць, відаць, ужо выкіпела, і ён павярнуўся, каб сесці на свае месца. Падвярнуўся вялізны мяшок. Ён пнуў яго нагой, з пагардай кінуўшы да ружовашчокага:

— Ва-а-яка! Гораахват з цябе, а не салдат, бач цэлы куфэл нарыхтаваў. І дзе ваяваў толькі, ці не капценармусам часам...—і ён яшчэ раз тупнуў па мяшку. І як на тое ліха, развязаўся мяшок. З яго выпала некалькі пар салдацкіх бацінак—усе новыя, дабротныя, з такой слаўнай падэшвай, утыканай шырокімі плешкамі цвікоў.

Ружовашчокі аратар неяк адразу асунуўся, паоляднеў. Ён бачыў, як прыўскочылі са сваіх месц салдаты, штурханулі мяшок, яго мяшок. Некалькі шынеляў, бацінкі, чаботы, пара наганаў з патронамі выпалі адтуль. Твары салдат пасуровелі. Нехта ціха сказаў:

— Дзялі, братва, у каго што парванае...

І тут грымнулі галасы:

— Што дзялі?.. Тут голым ходзіш, а тут цябе абкрадаюць. Бач ты яго, радзіма, радзіма, а ён яе ў мяшок засунуў... Зладзеям не даравацы!

— За борт яго!—суха сказаў матрос. І некалькі чалавек падхапілі ружовашчокага аратара і, тузануўшы разы са два ў каршэнь, кінулі пад адхон. Стала ціха. Усе бачылі, як важка цялепнуўся чалавек аб мокры пясок і, перакуліўшыся разы са два, ледзь падняўся на ногі, атрасаючы пыл і наліплае лісце.

— Туды яму і дарога, гаду... Пад калёсы-б ідала...

— Нічога, і так яму хопіць, пачэша плечы...

І каб развеяць сум і тугу, каб спагнаць злосць хоць на гэтым цягніку, які так марудна поўз праз шэры восенскі дзень, гаркнула некалькі галасоў:

— Кру-у-ці, Гаўрыла!

— Круці, наварачвай!

Задрыпаны попік прыліп да свайго чамаданчыка і баяўся паварушыцца. Чалавек з акулярамі зябка пацінаў плячмі і кінуў праціраць свае акуляры. У тахт калёсам гойдаліся на акулярах каплі дажджу, чалавек скоса пазіраў поверх шкелцаў, уцяўшы галаў у плечы. А побач людзі цанавалі абутак, шынелі, вынутыя з мяшка.

І тут заўважылі яшчэ адзін мяшок. І адразу заняліся ім. Гаспадар мяшка, нізкарослы, з абшчыпанай рэдзенькай барадзёнкай салдацік, увесь патануўшы здаецца ў доўгай і пашарпанай шынелі, ўплеўся за мех і не выпускаў яго з рук.

— Не чапайце, браточкі, тут-жа нічога няма шака... Вот вам крыж часны...

Пяшчасны мяшок выслізнуў з рук гаспадара, і хутка усе яго багацце ляжала на даху, цьмяна паблiскваючы ў восенскім змроку пераліvамі срэбра і золата.

Аглушальны рогат страсянуў паветра. Гаспадар мяшка канфузліва лыпаў вачыма і разводзячы недалужна рукі гаварыў да усіх, не абмінаючы і папа, і мокрыя акуляры.

— Ну я-ж казаў, я-ж казаў... Навошта было чапаць...

Перад ім ляжала пуды са два, са тры афіцэрскіх пагонаў. Тут былі і капітанскія, і палкоўніцкія, а больш за усе — маладых прапаршчыкаў і падпаручыкаў. Пад пагонамі прытулілася калясо. Самае звычайнае калясо ад кулямета.

— Ці не на армію ты пастаўляць надумаўся? Гэткі-ж запасец набыў?

— Якая там армія... Адчапіцеся вы...

— Дык навошта гэта табе?

— Ну што гаварыць... Дзялілі цайхауз у нас, дык я прыпазніўся быў... Вот і узяў, што трапілася. Ну, на цацкі там дзецям ці на мала што спатрэбіцца могуць: баба спадніцу упрыгожыць ці яшчэ куды прыстасуе...

— А калясо куды яна прыстасуе?

— Ну, ведама, у гаспадарцы яно ўсё можа спатрэбіцца... Усякі, можна сказаць, цвічок...

— Та-а-к!—насмешліва пракзаў матрос.—Ты-б яшчэ арудзію сюды ў мяшок, глядзі—бабе інструмант...

— А што ты думаеш...—не дачуўшы, адказаў гаспадар пагонаў і дзівіўся, чаму рагочуць гэтыя людзі, што яны хочуць ад яго.

Матрос узяў мяшок і аддаў яму.

— Сабірай, голуб, сваё барахло, ды глядзі, каб цэлым дахаты давёз... І жы-ыла-ж ты, скажу я табе, ну і жыла... На што пакваціўся...

Змяркалася. Людзі лаўчыліся як мага лепш прымасціцца нанач.

Аднастайна пастукваў вагон на стыках. Ціха праносіліся міма сумныя, пачарнелыя лясы, мокрая шэрань палёў. Такое-ж шэрае, замурзанае было нізкае восенскае неба. Па ім хутка імчаліся парваныя воблакі і праз іх сарамліва выглядалі першыя зоры. Дождж сціх. Стала яшчэ халадней. Людзі на даху шчыльней прыціскаліся адзін да другога, каб было цяплей, зацішней. Знізу, з дзвярэй вагона чуліся галасы. Там пелі песню:

... Генералы ды палкоўнікі
Ча-а-а-й з лімо-о-нам п'юць,
Нашаму-ж брату, беднаму салдату,
Шэрую капустачку даюць...

З. Бядуля

Пакаленне за пакаленнем

Кожны раз як ён ад мяне адыходзіць, я аддаюся ў палон старых успамінаў. Яны агортваюць мой слых шолахам старых бяроз і бульканнем вузенькай рачулкі, якая шуміць вясной.

Мне цяпер пяцьдзесят год, а ў дзяцінстве, калі меў толькі дзесяць год, знаёміўся з мінулым ад жывога сведкі яго—стагодняга прадзеда студэнта Мірона Сабалевіча.

Гэта быў маленькі, як дзіцё, дзядок—з рэдзенькай барадкай, з чырвонымі ніткамі вакол паблеклых вачэй, чысценькі, заўсёды ў новых лапцях і падраным кажуронку.

У той час мой бацька пазычыў у суседа на процанты пяцьдзесят рублёў і заарандаваў у пана Адольфа Мыслінскага невялікі сад. Мяне, дзесяцігадовага хлопчыка, бацька ўзяў з сабой у вартаўнікі. Сын дзеда Мірона, пажылы селянін з чорнай, як сажа, барадой, служыў у пана парабкам. Яго звалі «чорнабародым Язэпам». Здружыўся я тады з сынам «чорнабародага» —з хлопчыкам маіх год—Тамашом. Ён быў пастушком.

Я—вартаўнік саду—даваў штодзень хлопчыку Тамашу яблыкі цішком ад бацькі, а ён, Тамаш, вучыў мяне па вечарах граць на жалейцы. Мне тады здавалася, што няма на ўсім свеце лепшага музыкі... Гэта была просценькая музыка лесу і поля, як-бы цірліканне птушак, журлівы смех ручаінкі...

У сад захадзіў дзед Мірон—непісьменны летапісец ваколіцы, стары творца пагаворак і філасофскіх пасловіц. Тоненькім, пісклівым, як у птушкі, галаском ён апавядаў майму бацьку былі з часоў паншчыны. Я і Тамаш таксама пільна прыслухоўваліся да гутаркі дзеда.

Лепшая зямля ваколіцы належала старому пану Мыслінскаму. Лугі, пахата, лясы, вёскі, сяляне — усё-усё было панскай маёмасцю... І дзед Мірон належаў пану. Пасля смерці старога пана яго пяць сыноў падзялілі між сабой спадчыну. Кожнаму з іх выпала па вялікаму маёнтку. Шмат хто з былых прыгонных засталіся «вольна» служыць у Мыслінскіх парабкамі.

Добра памятаю братоў Мыслінскіх: сярэдняга росту, шыракаплечыя, нізкалобыя, з маленькімі мышынымі вочкамі. Па ўсёй нашай ваколіцы іх называлі «склютамі». У профіль яны нагадвалі сякеры. Вельмі скупыя і злыя паны Мыслінскія здзекваліся са сваіх парабкаў, бадай, не менш, чымся іх бацька са сваіх прыгонных.

З апавядання дзеда Мірона я даведаўся, што старая пані Мыслінская вельмі любіла катоў. Лепшыя пакоі ў панскім доме займалі каты. Сама пані ўбірала іх у шаўковыя банцікі. Яны спалі на аксамітных падушачках і іх абслугоўваў цэлы штат прыгонных дзяўчат. Спецыяльная кухарка гатавала ім ежу—«па аналіцку»,—расказваў дзед Мірон.

Стары, люты пан сваімі рукамі скалечыў нямала народу. Аднаго разу, калі пан паехаў у лес на паляванне і апынуўся адзін у цёмным гушчары, на яго ззаду нехта напаў, накінуў яму мяшок на галаву, паваліў і да таго біў кулакамі, пакуль пан перастаў дрыгаць нагамі. Але, на жаль, пан ачухаўся, ачуняў. Пан падазраваў, што гэта работа Тодара, роднага брата дзеда Мірона, бо дачку Тодара пан аддаў суседняму пану за сабаку і пан загадаў аднаму з сваіх шчырых псароў—Сымону Найду павесіць Тодара...

Яго павесілі ў вялізнай панскай пуні, што стаяла на беразе возера, недалёка ад млына. Падмуроўку гэтай пуні я сам памятаю.

Чорнабароды Язэп, дзед студэнта Міхася, араў панскае поле ад цямна да цямна. Я часта пазіраў на яго з саду. Сілуэт аратая з канём вызначаўся на фоне неба, як малюнак. Відаць было здалёк, як ён натужваецца, як ён, моцны, шыракаплечы, нагінаецца над сахой. Ён мне здаваўся асілкам. Я быў упэўнены, што ён можа за лета ўзняць цаліну на некалькі вёрст.

Нейк раз пад вечар чорнабароды Язэп араў ля самага саду. Падышоў сам пан Адольф Мыслінскі. Яму не спадабалася работа Язэпа. Вочы пана памутнелі, наліліся крывёй. Ён пачаў лаяцца самымі брыдкімі словамі, размахнуўся і ўляпіў чорнабародаму Язэпу пару гучных аплявух... Язэп не пахіснуўся. Твару яго я не бачыў, але чуў голас пана: «Бач, вочы якія! Разбойніцкія...»

Я быў здзіўлены, што такі асілак не бароніцца ад пана.

З таго разу я яшчэ бліжэй здружыўся з сынам чорнабародага—з маім равеснікам Тамашом. Кожны дзень, тоячыся ад бацькі, насыпаў яму за пазуху самых лепшых яблыкаў. Хлопчык так прагна іх глытаў, што захварэў на крываўку. Праз дзеда Мірона я пераслаў свайму сябру «лякарства» — шабасавую пшанічную булачку.

Рупны дзед Мірон пачаў заўчас майстраваць для Тамаша труну на вялізным панскім дрывотніку. Я глядзеў, як ён распілоўвае маленькай пілкай тонкія шурпатыя драніцы. Буйныя слёзы ліліся з маіх вачэй. Дзед Мірон таропіўся паблеклым прыжмураным вокам у роўна парэзаныя драніцы. Часта вохкаючы і ківаючы галавой, дзед браў мяне на-вокамер. Я быў аднаго росту з яго паміраючым унукам....

Выжыў Тамаш. Я зноў даваў яму яблыкі, за што ён навучыў мяне выстукваць пальцамі мелодыі на вялізнай піле бацькі—чорнабародага Язэпа.

Ужо як Тамаш вырас, ён налаўчыўся граць на гармоніку і скрыпцы. Ён граў на сялянскіх вяселлях полькі, кадрылі і маршы.

Даўно памёр дзед Мірон. Даўно забыты. Даўно спарахнеў на старым могільніку яго крыж. З цёплым пачуццем успамінаю Мірона, які даў мне матэрыял для аповесці «Салавей». Памёр таксама пан Адольф Мысьлінскі.

У маёнтку Мыслінскага гаспадарыў яго старэйшы сын, які стаў афіцэрам аднога з белапольскіх легіёнаў.

У тысячу дзевяцьсот дваццатым годзе ля ракі Бярэзіны сустрэліся афіцэр пан Адольф і сын яго парабка—Тамаш... Пазналі адзін аднаго. У абодвух вочы сыпалі векавечную нянавісць.

Момант... і яны ўзялі адзін аднаго на прыцэл. Адольф папаў Тамашу ў левую руку. Тамаш Адольфу—у лоб. Скончыўся разлік за вякі дзікага прыгнёту, за несупыннае рабства.

У вялізным калгасе Першае Мая на былых маёнтках паноў Мыслінскіх жывуць цяпер унукі і праўнукі былых прыгонных. Тамаш—старшынёю калгаса. Калі Тамаш бывае ў горадзе, ён заходзіць да мяне—яго равесніка і прыяцеля дзіцячых і юнацкіх год. Кожны раз ён прыносіць новыя весткі, новую радасць аб дасягненнях.

Кандрат КРАПІВА

Развітанне

(Чырвонаармейская песня)

Бывай, мілы!
На дарогу я мілога абніму—
Бывай, мілы, на два леты й на зіму.
Вязі, мілы,
Ад заводаў ды ад трактарных калон.
Палкаводцу Варашылаву паклон.
Вітай, мілы!
Ад работніц, ад калгасніц маладых
Прывітай там камандзіраў баявых.
Шчыльней, мілы!
Шчыльна-цесна стань з байцамі ў грозны рад,
Слухай, мілы, Варашылава загад.
Мацней, мілы,
Стой на варце на заходнім рубяжы,
Ад фашыстаў край совецкі сцеражы.
Бяры, мілы,
Трохлінейку, два падсумкі, патрантаж,
Цэлься ворагу у сэрца, не прамаж.
Бывай, мілы!
Абніму і пацалую пры людзях,
Каб вярнуўся—прывёз ордэн на грудзях.

З. АКСЕЛЬРОД

Пост № 4

Марозны свет вакол. Мой адзінокі крок.
Гучыць між сцен.
У гэту ноч глухую
Скрозь цемень бачу—дзверы і замок,
І ўсё, што я—краіны сын—вартую.

Чатыры хутка ўжо. Снягі ў глыбокім сне.
І я—ці ўсё ў парадку—правяраю.
У руках маіх—вінтоўка баявая.
Хто блізка падысці адважыцца ка мне?

Я так свой зрок напружыў і свой слух,
Так зліты я ў адно цяпер імкненне,
Што адчуваю сініх зор трымценне,
Што чую месяца спакойны рух.

Вінтоўку моцна сціснуўшы, стаю.
Маўчыць прастор марозам звонкім скуты.
Радзіму ўмее бараніць сваю
Баец чырвоны на пасту і ўсюды.

Рыпяць далёка крокі... хто ідзе?
Свой! Гэта змена новая ідзе.

І рып змаўкае,—як зімовы гул.
Змяняецца ў чатыры каравул.
Перадаю кажух. Іду ў казарму спаць,
На белай вежы б'е гадзіннік пяць.

Пераклаў А. КУЛЯШОЎ.

Г. КАМЯНЕЦКІ

Партызаны

(З паэмы)

Вецер. Снег. За радам рад
Стомлены імчыць атрад.

Навакол лясны прастор.
Не шуміць маўклівы бор.

Цішыня. Вакол ні гуку.
Не чуваць капытаў стуку.

Камандзір дае загад,
Каб спыніўся тут атрад.

Моўчкі сталі. Снег і шыр.
Кажа гэтак камандзір:

— «Ну, дык стаўце сцяг, хлапцы.
Адпачнем тут трохі мы».

Сцяганосец:—«я гатоў!»
Сцяг—чырвоны нібы кроў.

А вакол усё ў цішы.
— «Дзе паставіць сцяг, скажы?»

— «Тут, як бачыш, ўсюды лес.
Тут не знойдзеш лепшых месц.

Месца, дзе наш сцяг гарыць,
Лепшым будзем мы лічыць».

Смех. Смяецца з імі шыр.
І смяецца камандзір.

Раптам, што гэта і хто?
Нехта з месца са свайго—

Як лапата барада,—
Голасна ўздыхнуў: «Бяда!

— Каб кавалак хлеба быў,
Я-бы гэтак не тужыў.»

Сціхлі. Змоўкла разам шыр.
Не смяецца камандзір.

Лес маўчыць. Яны стаяць,
На чырвоны сцяг глядзяць.

Даражэй ім сцяг за ўсё,
І за хлеб і за жыццё.

З яўрэйскай мовы пераклаў
Віт. ВОЛЬСКІ.

Кузьма ЧОРНЫ

У сям'і Калацкіх

(З рамана „Заваёва свету")

Незадоўга перад канцом Аляксандравай навукі ў Дабрыню з'явіўся Іван Калацкі. З таго часу, калі яго забралі на імперыялістычную вайну, ён дома не быў. Ён доўгі час быў адрэзаны ад родных мясцін нямецкай акупацыяй, але бацькава пачуццё не хацела ведаць такой неміласэрднай рэальнасці.

Быў ліпень. Новасфармаванае злучэнне стралковых часцей праходзіла праз Дабрыню, кірункам з усходу на захад. Уся сям'я Калацкіх была дома, калі першыя часці чырвонаармейцаў мінулі мост пры возеры і сталі на перадышку. Да трохваконнай хаты Калацкіх пад'ехалі тры коннікі, адзін з іх быццам начальнік над двума астатнімі, бо яшчэ седзячы на кані ён даў нейкі загад аднаму, які ехаў за ім следам. Той паклаў на планшэт паперу, начальнік карандашом падпісаў яе і той з паперай паімчаўся да сваіх часцей. Начальнік пад'ехаў да самай хаты, саскочыў з сядла на зямлю і шпарка пабег да дзвярэй. Чырвонаармеец хапіў за повад пакінянага начальнікам каня і разам з сваім пачаў прывязваць да плота. Уся сям'я Калацкіх прыпала да вокан. Вайсковец убег у хату з слаўнай ціхай усмешкай на абветраным твары. У гэтай змрочнай хаце, дзе мала калі зіхацелі чалавечыя твары ўсмешкамі, адразу быццам усё павесялела.

— Іван!—кінулася маці да сына.

У Марціна Калацкага скаланулася ніжняя палова твару. Роўнай хадой ён падышоў бліжэй, пачакаў, пакуль маці выпусціць Івана з абдымкаў. Але бачачы, што гэтаму канца не будзе, ён паволі адвёў жонку за плячо і тады бацька з сынам абняліся.

— О, цяпер будзем разам,—сказаў Марцін Калацкі.

— Не, я толькі да вечара. Увечары я з сваімі гасцямі пайду далей. Мы ідзем на падмацаванне фронту.

— Зноў на фронт?!

— Трэба. Я сфармаваў полк і вяду на фронт.

— Ты?

— Я. Камандую палком.

— Ты? Камандуеш палком?

— А што?—шчыра засмяяўся Іван Калацкі.

Праз поўгадзіны, седзячы за сталом і бядуючы, што мала чым ёсць частаваць сына, Марцін Калацкі гаварыў з сынам.

Ён сядзеў сярод свае сям'і, не стары яшчэ, у самай сіле чалавек. Усе накіраванні яго душы ў гэты момант ішлі да Івана. «Аляксандра я вучу, каб ён стаў чалавекам, а Іван нідзе не вучыўся, ледзьве ўмеў распісацца, калі пашоў з дому і стаў не то што чалавекам, а вялікім чалавекам. Хіба можа быць Аляксандр такім?» Яго простай душы было страшна: цэлы полк людзей падначальваецца яго сыну. Толькі ён яшчэ не ўяўляў сабе, чаго спрабаваў яго Іван праз усе гэтыя гады. Неўзабаве вечар, Іван зноў надоўга развітаецца з усімі імі, і тут трэба скарыстаць гэты малы час, каб выказаць яму ўсё, што жыве ў сэрцы. А тым часам ён яшчэ і не пачынаў гэтага рабіць. Два разы прыходзілі да Івана ардынарцы, і Іван пасылаў праз іх у полк свае распараджэнні, а Марцін Калацкі рваўся выказаць сыну ўсю сваю шчырасць. Гаварылі аб кофтачцы, якую Клаўдзя сама сабе пашыла, аб новай саламянай страсе на гэтай трохваконнай хаце, аб тым, што ўвясну разлівалася вада ў ручаіне. Марцін Калацкі меркаваў, чым араць зямлю. Смеючыся, успомнілі Александрава франтаўство: хоць адзежа ў яго не франтаўская, але затое, нарэшце, яму такі ўдалося палажыць віхры на галаве на правы бок. Нават развяселеная Клаўдзя дамагалася, каб Аляксандр паказаў сваё круглае кішэннае люстэрачка. Нарэшце, прайшоў вечар і ўся шчырасць была выліта ў доўгім абдымку і пацалунку. Іван Калацкі пашоў да сваіх часцей. Марцін правёў яго да моста, а пасля доўга быў яшчэ з ім у самым лагеры. А поўначы полк зняўся з месца... Доўга яшчэ стаяла ў бацькавых вачах сынава постаць...



У тэатрах БССР.

Злева направа: Белдзяржтэатр оперы і балета. Салістка НІКАЛАЕВА ў балеце «Капелія» Дэліба, сцэна з І акта оперы «Тоска» Пучыні; Віцебскі гортэатр — арт. КАШЭЛЬНІКАВА ў ролі Паўлінкі («Паўлінка» Я. Купалы).

Ільля Гурскі

Валодзя Вярбіцкі

Урывак з п'есы

Карціна X

Аэрадром. Стралой прайшла аўтатраса. На слупу подпіс: «На Маскву». Каля кудравага дуба, што на ўзгорачку, Карчагіна. Яна рассцілае на траве абрус, ставіць закуску. У паветры кружаць самалёты. Карчагіна час ад часу пазірае ўверх. Падыходзіць Марыя Паўлаўна.

МАРЫЯ ПАЎЛАЎНА. Ну і народу, валам-валяць. (Глядзіць уверх). Таццяна Нікалаеўна! Самалёты!.. Бацюхны-матухны... колькі іх... от гэта сіліша!

КАРЧАГІНА (радасна, усхвалёвана). Неба ўпрыгожылі... калі патрэбна будзе, пастаяць за радзіму. (Да Марыі Паўлаўны). Чаго ты задумалася?

МАРЫЯ ПАЎЛАЎНА. Шкада Якава. Чым ён вінаваты?

КАРЧАГІНА. Цікава, ці прыдзе ён сюды? Валодзя з Тарасам Радзіонавічам збіраліся заехаць па яго.

МАРЫЯ ПАЎЛАЎНА (рада). Няўжо?

КАРЧАГІНА. Ага. Гэты год павінен быў шмат чаму навучыць. Мне здаецца, ён не канчаткова загінуўшы чалавек.

МАРЫЯ ПАЎЛАЎНА. Не, не!

Падыходзяць Валодзя, Міхайлаў, Бурлак, Архіп, Воінава і Алёхін. Яны ўсе з клункамі, аддаюць іх Карчагінай.

КАРЧАГІНА (усміхаючыся). Завозна.

МАРЫЯ ПАЎЛАЎНА (да Валодзі). Быў у бацькі? Як ён?

ВАЛОДЗЯ. Абяцаў прысці. (Адышоўшыся пра нешта гавораць).

МІХАЙЛАЎ (да Карчагінай). Памідоры.

КАРЧАГІНА. Дзе ты дастаў? Украіна падкінула, ці што?

МІХАЙЛАЎ. З другой Украіны, з пушчаў Палесся.

АРХІП (аддаючы клунак). Чым багаты, тым і рады...

КАРЧАГІНА (здзіўлена). Навошта столькі?

АРХІП. Нас двое. Я ды Алеська. Яна недзе на дарозе працуе. Брыгадзірша!

КАРЧАГІНА. Тут на дзесяцерых хопіць.

АРХІП. Няхай лепей застанецца.

АЛЁХІН (аддаючы клунак). Нарзан, ды іншыя гарачыя напіткі. А наконт астатняга не спаганяйце... з маленства на чужых харчах.

АРХІП. Прывычка—другая натура... Стары халасцяк. З яго ўзяткі-гладкі...

ВАЛОДЗЯ. Парашуты!..

КАРЧАГІНА. Дзе?

ВАЛОДЗЯ. Унь!

Усе глядзяць уверх.

КАРЧАГІНА. Добрыя дзеткі ў цябе вочы. А я дык яшчэ не бачу.

БУРЛАК. Дзяўчаты!..

МАРЫЯ ПАЎЛАЎНА (да Бурлака). Адкуль ты ведаеш?

АРХІП. Рыбак-рыбака бачыць здалека...

МІХАЙЛАЎ (да Марыі Паўлаўны і Карчагінай). Рознаколерныя... Значыць—жаночая каманда...

КАРЧАГІНА. А-я-яй! Якое хараство! Гэта-ж мусіць і Наташа там... Нечага сказаць, парадавалі... Столькі хвалявання... І глядзець не буду... (Сама глядзіць уверх).

МІХАЙЛАЎ. Можна высадзіць цэлы дэсант...

КАРЧАГІНА. Але-ж трэба мець адвагу...

АЛЁХІН (важна). Народжаныя лятаць поўзаць не могуць...

АРХІП. Калі патрэбна будзе, мы, старыкі, сфарміруем цэлую армію!

ВАЛОДЗЯ. І моладзь у даўгу не застанецца.

МАРЫЯ ПАЎЛАЎНА. Яшчэ-б!

ВАЛОДЗЯ. Наташа!

БУРЛАК (прыглядаецца). Да не. Гэта не яна.

ВАЛОДЗЯ. Што ты! Яе паходка.

Усе кінуліся бегчы. Засталіся: Карчагіна, Марыя Паўлаўна, Воінава і Архіп. Падыходзіць шмат народу.

КАРЧАГІНА (усхвалёвана). Хаця-ж ці добра прызямлілася?

ВОІНАВА. Ёй не ўпершыню. Дваццаць чацверты прыжок.

АРХІП. Цяперашняя моладзь у вадзе не тоне і ў агні не гарыць...

МАРЫЯ ПАЎЛАЎНА (заклапочана). Дзе-ж гэта Валодзін самалёт? Можа ці будзе лётаць.

КАРЧАГІНА. Павінен.

АРХІП. Ён кажуць так летае, што ажно валасы дыбам становяцца... На ім такі можна будзе кругом зямлі ляцець.

КАРЧАГІНА (цалуе). Пабілася?

НАТАША. Не-е. Хацела было каля дуба спусціцца, ды вецер аднёс...

АРХІП. Ото-ж добра, а то яшчэ-б прадукты сапсавала... (Смех).

ВОІНАВА. Тады Акім Акімавіч скандал-бы наладзіў. Ён любіць паесці.

АЛЁХІН (усміхнуўшыся). Асабліва калі з добрае кухні.

АРХІП. Ды з чужой... (Смех).

АЛЁХІН. Кацярына Іванаўна! А як ваш шчупак? Вы смажылі ці фаршыравалі? Я страшна паважаю рыбу. Некаторыя любяць лавіць, а мяне да гэтага не цягне...

ВОІНАВА. Паспееш.

НАТАША (да Архіпа). А дзе-ж Козачка?

АРХІП. Я ў цябе хацеў спытаць.

НАТАША. Мы ўмовіліся тут сустрэцца. Дзед Архіп! Каб вы ведалі, як прыгожа выглядае зверху аўтатраса.

АРХІП. Яно канешне з гары відней. Толькі я не збіраюся паднімацца.

Далёка-далёка чуваць песню. Усе прыслухоўваюцца.

БУРЛАК (рады). Алеська! Я яе пазнаў па голасу...

АРХІП. Дзіўна. Адзін па голасу, другі па паходцы, пазнаюць.

КАРЧАГІНА (прыглядаецца). Хто там ідзе?

АРХІП (з гонарам). Юнацтва. Будаўнікі дарогі. Весела жывецца, спяваюць, самі песні складаюць.

МІХАЙЛАЎ. Алеська арганізавала такі хор, які не сорамна і ў Маскве паказаць.

АРХІП. Яна ў мяне ого, брыгадзірша! Сваімі дарогамі, суседцы, нос падатром.

КАРЧАГІНА. Куды яны ідуць?

МІХАЙЛАЎ. Да нас у госці.

КАРЧАГІНА. Што ты галубок-саколік? Чым-жа мы будзем іх частаваць?

МАРЫЯ ПАЎЛАЎНА. І сапраўды, з сораму згарыш.

МІХАЙЛАЎ (да Карчагінай і Марыі Паўлаўны). Індывідуалісты!?

НАТАША. Алеська з сваім хорам збіраецца ў Маскву ехаць. Паслухаеце, як яны спяваюць.

КАРЧАГІНА. Глядзіце, каб не прышлося чырванець. Народ цяпер ганарлівы.

АЛЁХІН. Песнямі не наясіся. Прыдзецца падшпіліць папругу.

ВОІНАВА (да Алёхіна). Хопіць і табе. Раней часу не падпяразвайся.

КАРЧАГІНА. Баюся.

МІХАЙЛАЎ. Нічога. Парадам камандую я.

БУРЛАК (у захапленні). Як дзіўна яны спяваюць!

МАРЫЯ ПАЎЛАЎНА. Маладосць.

НАТАША. Там і старыкі ёсць.

АРХІП. Таму так добра і спяваюць. (Бярэцца за грудзі). Э-э-э. Схапіла не на жарты. Расхадзілася. Чаго добрага... (Усе захваляваліся). Нічога... Крыху лепей стала...

Падыходзяць дзяўчаты, хлопцы. Сярод іх Алеська. Яе акружаюць. Смех. Радасць.

АЛЕСЬКА (да Валодзі). Нешта-ж твайго самалёта не відаць... Мо' ці будзе лётаць?

ВАЛОДЗЯ. Будзе.

АРХІП. Алеська! (цалуе). Ну, як ты? Ці вялікая вырасла? Песенніца мая. А ці помніш ты, як я табе спяваў. Нудныя былі песні. (Да Міхайлава). Ведаеце, чаму яна пайшла будаваць дарогу? Хоча, каб не быць бітымі. Наважыла за бацькоў расквітацца. Пазнанцы жывымі ў магілу закапалі.

АЛЕСЬКА. Праўда? Чаму ты гэтага раней не сказаў?

АРХІП. Не трэба было. Ты малая была, шмат чаго не магла зразумець. Яны на вачах у бацькі, у людзей глуміліся над маці...

АЛЕСЬКА. Праклятыя!

АРХІП (страшна хвалюецца). Рана табе было пра гэта казаць... але я рашыў... (Схапіўся за сэрца, кусае губу). Баяўся... каб не пайсці... нічога табе не сказаўшы... Ты ўсё павінна ведаць... А цяпер...

АЛЕСЬКА. Клянуся, што за здзекі над бацькамі, над людзьмі, мы расплацімся. Ты можаш быць спакойным...

АРХІП (з радаснай усмешкай). Я ў гэтым быў упэўнены... але баяўся... ведаеш... на скрыпучых калёсах далёка не заедзеш...

МІХАЙЛАЎ. Падрамантуем. Заўтра-ж паедзеш на курорт.

АРХІП. Тарас Радзіонавіч! Не трэба. Няхай маладыя.

АЛЕСЬКА (цалуе дзеда). Паедзеш!

АРХІП (яму відаць стала лепей). Яно канешне пры такім жыцці паміраць не хочацца. Алеська! Даўно не чуў я твайго голасу. Хочацца паслухаць песеньку.

АЛЕСЬКА. А якую?

АРХІП. Што бліжэй да сэрца.

АЛЕСЬКА (з радасцю запявае).
Сталін родны бацька наш...

ХОР.
Зірнуў на нас, — зара ўзышла,
Зірнуў на нас, — зара ўзышла,
І ўся прачнулася страна.

АЛЕСЬКА.
Сталін, Сталін дарагі...

ХОР.
Як ясна зорка ззяеш ты,
Як ясна зорка ззяеш ты.
Да комунізма нас вядзі.

АЛЕСЬКА.
Што за сонца яснае...

ХОР.
Над зямлёю ўсёй гарыць?
Гэта наш любімы Сталін, —
Цяпло і шчасце нам дарыць.

АЛЕСЬКА.
Сталін, Сталін дарагі...

ХОР.
Як ясна зорка ззяеш ты,
Як ясна зорка ззяеш ты,
Да комунізма нас вядзі.

АРХІП. Слаўная песня.

ДЗЯЎЧЫНА (з хора). Самі яе склалі.

АРХІП. Узварухнулі чарназём... і пайшло і пайшло. Сцеражыцеся, буржуі! Калі што якое, змяцем з твару зямлі. Мы старыкі да моладзі на падмогу...

МІХАЙЛАЎ (усміхнуўшыся). А можа наадварот?

АРХІП. Не ўсё адно... У нас з моладдзю дружба на векі-вечныя... Ніхто не ў сілах пасварыць!..

АЛЕСЬКА. Правільна!

НАТАША. У вас вопыт трох рэвалюцый, практыка барацьбы, загартаванне, а ў нас малады задор, жаданне давесці распачатую вамі справу да канца...

МІХАЙЛАЎ. Малайчына! (Цалуе Наташу).

БУРЛАК (радасна). Валодзін самалёт!..

Усе глядзяць уверх. Радаснае хваляванне. З хуткасцю маланкі праляцеў аэраплан.

АРХІП (да Валодзі). Ну, Молакаў! Віншую! Не дарэмна ты насіў імя сталінскага сокала...

Падбягае Вярбіцкі; ён страшна ўсхвалёваны.

ВЯРБІЦКІ. Валодзя! Бачыў і я тваю стальную птушку... Прызнаюся, сумняваўся, што з гэтай каруселі выйдзе які толк...

АРХІП (да Вярбіцкага). Абознік!..

ВЯРБІЦКІ. Біце, толькі не да смерці.

АРХІП. Будзем біць датуль, покуль не выб'ем дур з галавы.

ВАЛОДЗЯ. Яно каб не калектыў канструктараў, то можа-б і не вышла нічога...

МІХАЙЛАЎ. Не скромнічай. За аснову ўзялі твой праект... Але трэба сказаць, што будзь гэта не ў нашай краіне, нічога-б не было...

ВЯРБІЦКІ (дастае тэлеграму). Валодзя! Я прынёс радасную для цябе вестку. (Чытае). «Валодзю Вярбіцкаму. Ваш самалёт прайшоў усе выпрабаванні. Ідзе ў серыйную вытворчасць. Выязджайце Маскву. Варашылаў». (Падыходзіць да Марыі Паўлаўны, аб нечым гавораць).

МІХАЙЛАЎ. Чаму толькі для яго? Гэта наша агульная радасць. (Цісне руку Валодзю). Віншую! Шчыра рады.

БУРЛАК. Гушкаць.

ГАЛАСЫ. Гушкаць! Гушкаць!

Моладзь падхапіла Валодзю, гушкае.

АЛЁХІН (да Міхайлава). Аднак, не пшкодзіла-б падмацавацца.

ВОІНАВА. Куды вас гоніць?

АЛЁХІН. Яшчэ прадукты сапсуюцца...

МІХАЙЛАЎ (да Карчагінай і Марыі Паўлаўны). Ці гатова там у вас?

КАРЧАГІН. Просім!

МІХАЙЛАЎ (да ўсіх). Сядайце!

Усе садзяцца, наліваюць.

КАРЧАГІНА (да Міхайлава). Будзь гаспадаром.

МІХАЙЛАЎ (наліўшы). Падымем першы келіх за любімага чалавека, правадыра і настаўніка, лепшага нашага друга таварыша Сталіна! (Усе ўсталі. Крыкі: «Ура!» П'юць, закусваюць). А цяпер слова дадзім Алёхіну.

АЛЁХІН (ядучы). Я страшна заняты. (Смех). Перадаю слова Віцю Бурлаку.

БУРЛАК. Я сыграю фрагменты другой часткі сімфоніі «Чалавек-сонца». (Іграе. Воплескі).

МІХАЙЛАЎ. Слова мае віноўнік урачыстасці Валодзя Вярбіцкі. (Воплескі).

ВАЛОДЗЯ (да ўсіх). Каб вы ведалі, як мне хочацца ў Маскву. Сам не ведаю, чаго так цягне. Хочацца пабыць у Крэмлі.

БУРЛАК. І мне таксама. Здаецца пяшком-бы йшоў.

АЛЕСЬКА. Я сёння ў сне сніла, ш[illegible] выступала з хорам у Крэмлі. Пра[illegible] дыр мне руку цісну. Пытаўся, [illegible] я хачу.

АРХІП. І што ты сказала?

АЛЕСЬКА. «Я знаю,—кажу,—шт[illegible] чога не знаю». «Хачу,—кажу,—вуч[illegible] ца». «Правільна!»—сказаў правадыр[illegible]

АРХІП. А пра мяне і не ўспомні[illegible] ла?..

АЛЕСЬКА. Хацела, але хутка пра[illegible] нулася.

АРХІП. Можа калі і угледзіш, то перадай, што мы, старыкі, яго моцна любім. Гатовы за яго, калі спатрэбіцца, жыццё аддаць.

АЛЕСЬКА. Правадыр нам горача апладыраваў. Мы двойчы праспявалі «Ці не быстрая рэчка...»

Алеська заспявала, хор падхапіў, усе падцягваюць:

Ці не быстрая рэчка ваду замуціла,
Чаго плачаш, дзяўчыначка, ці матуля біла.
Ты пойдзеш гарою, а я далінаю.
Я сама знаю, людзі гавораць, што не быць мне з табою.
Няхай сабе кажуць усякае ліха.
А мы з табой, дзяўчыначка, любімося ціха.

МІХАЙЛАЎ (да Валодзі). Зусім зразумела, чаму цябе так цягне ў Маскву. Масква—сэрца свету.

Усе ўстаюць. Бурлак зайграў «Юрачку». Моладзь пайшла танцаваць.

ВАЛОДЗЯ. Добры дзень, Масква! Усім сэрцам з табою.

НАТАША (да Валодзі). Зайздрошчу табе.

ВАЛОДЗЯ. Паедзем удваіх.

АЛЕСЬКА. Не сёння, дык заўтра і мы з Віцяй будзем у Маскве.

ВАЛОДЗЯ (ідучы з Наташай, з нейкай асаблівай цеплынёй). У Маскву, у Маскву.

Эдуард Самуйлёнак

„Парад нацый“

(Урывак з рамана „Будучыня“)

Змяркалася. Андрэй Міхайлавіч падышоў да вакна і зняў прышпіленую на кнопкі газету, якая замяняла фіранку. Ён убачыў рознаколерныя дахі дамоў, пажоўклыя дрэвы бульвараў ясную восеньскую далеч неба—абрысы блізкіх і дальніх гор былі выразнымі на іх спадах відаць было руіны старадаўных сцен і баявых веж. Горы і руіны акружалі горад. У стомленых летняй гарачынёй садах, што раскінуліся ля падножжа гары Давіда, была дрымотная цішыня: сонны спакой панаваў у вузенькіх вулічках; шум горада толькі з павевамі ветру прыходзіў сюды. Андрэй Міхайлавіч задумаўся.

Ужо больш за год жыве ён у Тбілісі. На новую экспедыцыю, як называе Андрэй Міхайлавіч свае адзінокія вандраванні па Калхідзе,—грошай няма. На сцяне ў ягоным пакоі распята шырокае палотнішча, на якім нанесены паметкі з апошняга дарожнага блок-ноту. Значны раён цэнтральнай часткі балот, сэрца прыморскай нізіны, ужо даследваны і распрацаваны на карце. Старадаўныя каналы, курганы, мёртвыя, балотныя рэкі без пачатку і канца, глухія азёры намечаны на карце разам з накідамі новых, будучых каналаў, грэбляў і дамб; намечаны план гіганцкіх работ, распрацаваны першыя яго контуры. Аглядаючы карту Андрэя Міхайлавіча, даўні ягоны прыяцель, інжынер Леанід Гогоберыдзе не раз гаварыў:

— Кінь, Андрэй... Гэта лішняя праца! Для таго, каб асушыць Калхіду, патрэбны сілы ўсяго народа, розум і энтузіязм сапраўдных народных правадыроў! А што могуць зрабіць гэтыя меншавіцкія шарманшчыкі? Адзінае, што яны могуць,—гэта ўрадавы банкет і карная экспедыцыя. Пойдзем да мяне, у чарцёжнае бюро, там хоць англійскі заказ і плацяць валютай... Ты знясілееш на двух шклянках кавы.

Андрэй Міхайлавіч прадоўжваў працаваць, захоплены грандыёзнай ідэяй, адчуваючы ў сабе сілы, веды і натхненне, не звяртаючы ўвагі на прыкрыя дробязі быту. Ён спадзяваўся на тое, што меншавіцкая авантура рана ці позна праваліцца, і ён будзе мець справу з сапраўднымі дзяржаўнымі людзямі, акружанымі давер'ем народа, поўнымі энергіі і ініцыятывы. Тады ён прыдзе да іх і скажа:

— Вось мая праца!

Ён ведаў, што будзе такі дзень, і чакаў на яго. І працаваў не складаючы рук. І кожны дзень у думках сваіх вандраваў па Калхідзе, знаходзячы ў гэтым спакой і натхненне.

Так, у чаканні вялікіх надзей і цікавых, хвалюючых сустрэч жыў і працаваў Андрэй Міхайлавіч, стараючыся не зважаць на прыкрасці амаль што жабрацкага побыту.

У дзверы пастукалі. Андрэй Міхайлавіч не паспеў адказаць, у пакой заглянула цётка Елена Бакрадзе, хатняя гаспадыня Андрэя Міхайлавіча. Яе дабрадушны, адрузлы твар меў выраз вялікай таямнічасці. Цётка Елена заўсёды выглядала так, як-бы збіралася паведаміць людзей пра нешта вельмі важнае і ў найвышэйшай ступені таямнічае.

— Чорны прышоў!—сказала яна высока ўзнімаючы бровы і прыкладаючы палец да губ.

Увайшоў Гогоберыдзе. Аднагодак з Андрэем Міхайлавічам, ён выдаваўся супроць яго юнаком. Асабліва маладымі былі ягоныя вочы, поўныя задорнага агню, бліскучыя і смяшлівыя. Характэрныя, выгнутыя губы, чорны як смоль пучок вусаў пад гарбатым крыху вялікім носам, ніводнай маршчынкі на твары і стройная фігура,—Леанід Гогоберыдзе на сорак трэцім годзе жыцця быў гэткі-ж франт і хват як і ў тыя годы, калі Андрэй Міхайлавіч пазнаёміўся з ім у адной студэнцкай кухмістэрскай на Васільеўскім востраве ў Пецярбургу.

— Няма чаго чытаць!—сказаў Гогоберыдзе, падаючы Андрэю Міхайлавічу газеты.—Бестыя Каўцкі называе гэты меншавіцкі блуд «дэмакратычным раем»... Загубяць народ, прахвосты!

Ён моўчкі і хутка прайшоў міма Андрэя Міхайлавіча, і калі той, прагладаючы газеты, з'явіўся на парозе свайго пакоя, Гогоберыдзе ўжо ляжаў на абшарпанай канапе і курыў.

— Сёння можна пабачыць гэтага Каўцкага ў натуральны рост,—сказаў Гогоберыдзе.—І таксама Дэбрукера, Макданальда і нават Вандэрвельдэ, які ўзнімаўся на аэрастаце на французскім фронце ў час вайны. Не было каму зрабіць дзіркі ў гэтым аэрастаце.

У гэтую хвіліну Андрэй Міхайлавіч як-раз чытаў карэспандэнцыю аб тым, як праводзяць час у Грузіі высокія госці. Лідэры ІІ Інтэрнацыянала Каўцкі, Дэбрукер, Вандэрвельдэ, Макданальд, Інгельс і астатнія, днямі намерваюцца адбыць у Кахетыю для пробы славутых він удзельнага ведамства. Апісваліся чарговыя ўрачыстасці, у якіх прымалі ўжо ўдзел «бацькі дэмакратыі» і ўрачыстасці, у якіх яны ўдзельнічаць намерваюцца. Паведамлялася, што сёння ў Тэатры оперы будзе наладжаны ў гонар гасцей урачысты канцэрт. Уваход па спецыяльных білетах.

— Зубры!—гаварыў Гогоберыдзе.—Парагвайская аперэта! Сёння мы з табой, Андрэй, убачым гэтую кампанію... У мяне два білеты ў партэр.

— Я не пайду!—сказаў Андрэй Міхайлавіч, складаючы газеты.

— Глупства!—адказаў Гогоберыдзе ўстаючы.—Нельга быць такім грэблівым. Ці мала мы бачылі ўсякай дрэні за свой век?! Усё-ж, павінен ты прызнаць, Андрэй, што відовішча будзе выключнае, можа ніколі за ўсю чалавечую гісторыю не збіралася ў адно месца адразу гэтульні авантурыстаў!

— Ты стаў цяпер левым!—усміхнуўся Андрэй Міхайлавіч. Ты стаў зусім левым, нарэшце, мой дарагі Леанід!

— І левым!—крыкнуў раздражліва Гогоберыдзе, чырванеючы.—Калі-б мяне прынялі большэвікі, я быў-бы ўсёй душой з імі! Леанід Гогоберыдзе яшчэ можа служыць народу! Вось што, калі хочаш ты ведаць! А ты яшчэ над палітыкай? Яшчэ за палітыкай? Апранай сурдут, стары дурань! Ужо восем гадзін!..

*

Андрэй Міхайлавіч не шкадаваў пасля, што паслухаў Гогоберыдзе, хаця вечар, як і меркаваў ён, выйшаў несамавіты. У ясна асветленай зале тэатра, у нуднай цішыні—падкрэсленай штучнай урачыстасці, гучэлі манатонныя галасы аратараў. Госці і гаспадары абменьваліся прывітаннямі. Прыстойны партэр нахіляў прылізаныя галовы. Там і тут калыхаліся султаны вячэрніх жаночых прычосак, партэр узнагароджваў аратараў вельмі далікатнымі воплескамі. Галёрка-ж маўчала. Раз нават Андрэй Міхайлавіч выразна пачуў угары смех. Афіцэр гвардзеец, сусед Андрэя Міхайлавіча, глянуў угору і злосна выскаліў зубы. Гогоберыдзе падштурхнуў Андрэя Міхайлавіча пад локаць і падміргнуў.

У антракце яны сядзелі за столікам у файэ, Гогоберыдзе частаваў Андрэя Міхайлавіча віном і хутка захмялеў сам. Яго бліскучыя, жвавыя вочы загуманіліся. Ён з адкрытай злосцю, раздражліва крывячы губы, аглядаў тых, што праходзілі міма і сядзелі за столікамі навакол.

— Памятаеш, Андрэй...—гаварыў ён, і туга праглядала ў яго затуманеных вачах,—ты памятаеш, як мы з табой сядзелі на галёрках Марыінскага і Александрынкі?.. Памятаеш, як ненавідзелі мы партэр, тоўстыя тушы ў мундзірах і фраках, тупасць сытасці, бляск багацця... Колькі гадоў прайшло! І вось, мы зноў седзімо побач... Цяпер ужо ў партэры, але па запрашальных білетах... Мы бачым тое самае, што бачылі ў дні маладосці... Тупасць сытасці, бляск накрадзенага багацця... Андрэй! Мне сорамна!.. Мой народ цярпіць голад і мрэ ад галечы, а я ні ў чым не магу дапамагчы... Завяршылася кола. На старасці год я прышоў да выходных пазіцый: адзінае, што я магу—гэта скардзіцца за бутэлькай віна. А мой народ, зямля маіх бацькоў...

Гогоберыдзе кінуў акурак, не клапоцячыся аб тым, куды ён трапіць. Празвінеў званок. Андрэй Міхайлавіч, вельмі задаволены гэтым, устаў і ўзяў Гогоберыдзе пад руку.

— Я стаміўся, вось што...—сказаў Гогоберыдзе пачакаўшы, і ўжо больш спакойна:—І мяне душыць, калі я гляджу на гэтых сцерваў...

— Досыць, Леанід!—сказаў Андрэй Міхайлавіч.—Вось, ужо зараз канцэрт.

У задрапіраванай, упрыгожанай флагамі ложы, відаць было здалёк невыразныя сілуэты гасцей. Андрэй Міхайлавіч добра бачыў толькі белыя валасы Макданальда, ружовую лысіну Вандэрвельдэ, нечыю сутулаватую спіну. Астатняе перашкаджала бачыць драпіроўка. Па ўскраі сцэны, грацыёзна ступаючы на наскі, рысаком прыскакаў распарадчык. Калыхнулася заслона, увзвізгнулі скрыпкі. Канцэрт пачаўся.

Гэта быў канцэрт, які кожны называў па-свойму. Большасць называла яго «парадам нацый». Як толькі ўзнялася заслона, аркестр пачаў германскі гімн, відаць у гонар Каўцкага. На сцэну выйшла пара актораў—немец з немкай. Яны павольна прайшлі праз сцэну, кланяючыся зале. Публіка ў партэры ўстала апладыруючы гасцям у ложы. Галёрка і астатняя частка залы захоўвала маўчанне. Пасля гэтага на сцэну вышлі англічанін з англічанкай. Аркестр пачаў граць англійскі гімн. Зноў усе ўсталі. Такім-жа чынам ушаноўвалі Францыю і Бельгію. Андрэй Міхайлавіч скосу глянуў на Гогоберыдзе.

— Балаган!—сказаў той скрозь зубы, аднак, устаючы:—Ганьба! Шарманшчыкі праклятыя!

Пад канец, «параду нацый», з сцэнай адбылося нейкае замяшанне. Распарадчык, матляючы хвастамі фрака, зноў прабег па сцэне і саскочыў у аркестр. Праз хвіліну на сцэну вышаў мужык, у чырвонай кашулі і ў лапцях. Пачухваючы свой руды парык, ён вышаў на сярэдзіну сцэны і імкнучыся здацца вельмі смешным нізка пакланіўся. У тую-ж хвіліну аркестр пачаў іграць «Інтэрнацыянал». Мужык зрабіў выверт сваімі лапцямі і прытупваючы пайшоў па сцэне.

Але з першай-жа хвіліны, з таго самага моманту, як смычкі скрыпак пачалі першыя такты гімна, у тэатры пачалося нешта дзіўнае і незвычайнае. На галёрцы, у бель-этажы, пачуўся гул галасоў, асобныя выкрыкі. Іх пакуль што заглушала музыка. Скрыпкі знарок фальшывілі. Але першыя акорды гімна кранулі сэрцы многіх прысутных тут. Велічная мелодыя сурова і ўрачыста ўзнялася над людзьмі і падхоплены ўсёй галёркай і часткай залы, загрымеў «Інтэрнацыянал». Аднекуль пасыпаліся лістоўкі.

— Ура!—крычалі дзесяткі галасоў.—Ура! Няхай жыве ІІІ Інтэрнацыянал.

— Ваша! Савецкая Расія! Ваша! *)

— Прэч балаганшчыкаў!—крыкнуў Гогоберыдзе,—ганьба!

Лістоўкі сыпаліся з гары. Усе ўзняліся на ногі, пачаўся крык, трашчэлі крэслы, ашалелы ад нечаканасці дырыжэр усё яшчэ махаў рукамі, аркестр граў і галёрка спявала «Інтэрнацыянал». На сцэне, не ведаючы што рабіць, усё яшчэ тупаў актор у лапцях. Раптам апала заслона, аркестр адразу сціх, але сотні галасоў спакойна і ўрачыста спявалі гімн.

Гогоберыдзе стаяў побач з Андрэем Міхайлавічам, бледны, прыціскаючы руку да грудзей. У яго дрыжэлі губы. Ён бачыў, як хутка, як паспешна засоўваюцца драпры ў ложы гасцей. Госці пакідалі тэатр.

— Прэч здраднікаў рабочага класа!—крычалі з галёркі.

— Прэч!

— Партыя большэвікоў! Ваша!


— Ваша—Савецкая Расія!

Нехта ўзяў Андрэя Міхайлавіча пад руку. Перад ім стаяў малады чалавек. Ён добра ведаў гэтага маладога чалавека. Гэта быў адзін з тых, што ратавалі Андрэя Міхайлавіча з багны на кургане «Наохваму».

— Вы мне можаце дапамагчы?—хутка, азіраючыся, спытаў малады чалавек.—Вы згодны дапамагчы?

— Згодзен!—адказаў Андрэй Міхайлавіч, адчуваючы, што дарэмна слоў траціць нельга.

*) Ваша—ура—грузінск.



НОВЫ МЕНСК.
Канчаецца будаўніцтва Тэатра оперы і балета.

Фота І. Каплінскага.

М. Клімковіч

Пад Барысавам

(Урывак з п'есы аб барацьбе супроць белапольскіх акупантаў)

З'ява І

Камандзір баявога ўчастка чырвонага фронта пад Барысавам. Ён стаіць каля карты Беларусі, на якой чырвоная істужка фронта і дыслакацыя варожых і нашых сіл на розных берагах ракі Бярозы.

КАМАНДЗІР.

Ударым так. (Правёў алоўкам тоўстыя сінія рысы каля Барысава з двух бакоў).
Барысаў з двух бакоў
Мы возьмем у клешчы першы раз, па-людску
І, як ні дуж пракляты пан Пілсудскі,
А выскачыць павінен без зубоў.
Іначай быць не можа. Ставіць у лоб
Жывыя сілы пад расстрэл палякам,
Калі балотам у тыл—без шуму і без знаку—
Завесці можна цэлай сеткай троп
Атрад,—няўжо вялікі трэба розум
Спецоў ваенных? Сёння к нам адтуль
Прыбег мужык... ратуецца ад куль
Памешчыка... ён брод цераз Бярозу
У зручным месцы ведае. Пабачым.
(Бярэ тэлефон).
Штаб? Перабежчыка ка мне.
(Ізноў да карты).
Дык вось ты, Беларусь—край беднасці жабрачай
І панскай роскашы, распластаны ў вайне.
Насупіў бровы ты адвечнымі барамі,
Туманам твар заслаў... Ды каб адзін туман,
А то заслаў цябе пажарным дымам пан
І шыбеніц рады—з найлепшымі сынамі
Тваімі—у дыму...
(Бярэ другі тэлефон).
Расшыфравалі? Дайце... Ліст з ЦК?
Ад Сталіна? Прысланы хутчэй, як змога.
(Паклаў трубку).
Во нам—большэвікам
Вучыцца у каго: бацькоўская трывога
Нязломны дух і цвёрдая рука.
Арліным вокам бачыць, дзе падмога
Патрэбна і туды нясе свой грозны лёт
Наш пламенны калхідзец і нястомны.
Парадаваць байцоў,—хай шляхце вераломнай
Напомняць наш Царыцынскі паход.
(Стук у дзверы).
Заходзьце.

З'ява ІІ

Уваходзіць стары селянін з вёскі Гліўіна, што па той бок Бярозы.

КАМАНДЗІР.

Добры дзень. Што добрага, дзядуля?

СЕЛЯНІН.

Дзень добры, камісар. Пра добрае-б пачулі
Мы можа што ад вас, а нас—хоць не пытай.

КАМАНДЗІР.

Чаму, дзядок? Палякі-ж пішуць—рай
У іх сялянам: соль ёсць і да солі...
(І кіўнуў рукой на грудок польскіх газет, сярод якіх вылучаецца «Минский курьер» і «Звон»).

СЕЛЯНІН.

Соль ёсць, вядома. Гэтак шкуру соляць,
Што хоць крысо адрэж і уцякай.
У нас памешчык Глівенскі—пан Свіда
Вярнуўся з імі, батракоў сабраў
І так лагодненька пытае, гніда:
«Вам большэвік тут, кажуць, солі не даваў,
А я прывёз. Каму патрэбна солі?»
Сёй-той паверыў: «Можа, пане, мне».
Ну, збілі ў кроў і раны на спіне
Сапраўды пасалілі соллю.

КАМАНДЗІР.

Іш гады белыя.

СЕЛЯНІН.

Вядома—гадаўё!
Так агаліць народ пажар і той не зможа:
Забралі ўсё: курэй, скаціну, збожжа,
Што згледзіць пёс ліхі, лічы, што не тваё.
Усё здрапежылі, пагвалцілі, пабілі,
Што дзень, што ноч—на вёсках енк і крык.
Няма ў сяле такіх, што бога-б не малілі,
Каб хоць хутчэй вярнуўся большэвік.
(Стук у дзверы).

КАМАНДЗІР.

Заходзьце.

З'ява ІІІ

Уваходзіць чырвонаармеец і падае пакет.

КАМАНДЗІР.

Дзякуй.
(Хутка чытае пісьмо і знімае трубку тэлефона).
Дайце камісара.
— Жывіца, слухай! Ёсць пісьмо ЦК.
З падзіва... План рашучага удару...
Заходзь хутчэй, хай камандзір палка
Таксама зойдзе.
(Кладзе трубку).
Слухаю, дзядок.
(Да чырвонаармейца).
Вы вольны, друг.
(Чырвонаармеец вышаў).

СЕЛЯНІН.

Ды слухаць што, таварыш?
Лягчэй, калі ў зямельцы косці парыш,
Чым жыць вось так. Мы чулі, галубок,
Што Ленін мір іх каралю ці пану
Прапанаваў...

КАМАНДЗІР.

Прапанавалі, дзед, ды пан Пілсудскі міру
Не хоча нам даваць. Шалее, як відаць
Свіння варшаўская, дзядок, ад жыру
І прыдзецца жырок штыхом пакалупаць.

СЕЛЯНІН.

Дай бог, таварыш. Вось і я прышоў
Сказаць,—каб ў лоб не лезлі: пан прыпасаў
Падвёз на-днях—і сочыць вокам ласым
За пераправамі, дзе-б полк ваш не навёў.
А вёрст дзесятак уніз—ля вёскі Ухалоды
Ёсць брод, таварыш, з леташняга году.
Падход там зручны—і паноў няма.
Каб, скажам, ноччу ды яшчэ туман,
Вас хлопцы правялі-б і лесам і балотам,
А варту панскую прыкончым мы пад плотам...

КАМАНДЗІР.

Падумаем, дзядок. А ты не падвядзеш?

СЕЛЯНІН.

Таварыш, не жартуйце.

КАМАНДЗІР.

Ты не крыўдуй, дзядок! Павесці ў бой людзей
Не жартачкі ўсляпую, ну а хто адкажа,
Калі народ там покатам паляжа
Без толку?

СЕЛЯНІН.

(абразіўся).
Што-ж, камісар, табе відней.

КАМАНДЗІР.

Дзед, не сярдуй. Падумаем, разважым,
Параімся. Ты-ж крыху адпачні.

СЕЛЯНІН.

Не, зараз не такія дні,
Каб адпачыць... У Маскву найду дарогу
Да Леніна дайду і выпрашу падмогу.
(Уваходзіць камісар і камандзір палка).

КАМІСАР ПАЛКА.

Дзень добры, камандзір.

КАМАНДЗІР.

Дзень добры, камісар.

КАМІСАР ПАЛКА.

Дай мне пісьмо.

Ю. Дворкіна

ЭЖЭН ПАТ'Е

(Да пяцідзесяцігоддзя з дня смерці)

Парыжская комуна—гэты першы ў гісторыі чалавецтва вопыт дыктатуры пролетарыята—мела сваіх гераічных змагароў—паэтаў. Яны змагаліся на барыкадах, адначасна запальваючы сваой песняй сваіх таварышоў па барацьбе. Адным з самых выдатных спевакоў Парыжскай комуны з'яўляецца паэт-пясеннік Эжэн Пат'е. Гісторыя рэволюцыйнай літаратуры ведае многа такіх «шансанье»—творцаў і выканаўцаў песень-куплетаў, якія звязалі сваю творчасць з народам і выражалі яго пачуцці, думкі і імкненні. Класічным узорам такога «шансанье» з'яўляецца геніяльны французскі паэт Беранжэ, уплыў якога адчуваў Эжэн Пат'е. У сваіх песнях Эжэн Пат'е змог стаць сапраўдным выразнікам і спеваком Парыжскай комуны. Ён стварыў неперавышаны да гэтага часу, па сіле выражэння пролетарскай магутнасці, твор,—які гучыць на вуснах працоўных усяго свету; Эжэн Пат'е з'яўляецца аўтарам міжнароднага пролетарскага гімна — «Інтэрнацыянала».

Песні Пат'е ў пераважнасці—песні палітычныя. У іх ён з'яўляецца палкім выкрывальнікам буржуазнага грамадства, сатырыкам-памфлетыстам і разам з тым натхнёным спеваком будучага соцыялістычнага ладу.

Эжэн Пат'е нарадзіўся ў Парыжы ў сям'і ўпакоўшчыка. Навучыўшыся размалёўцы тканіны, ён дасягнуў у гэтай галіне вялікай кваліфікацыі. Плоць ад плоці і кроў ад крыві працоўнага французскага народа, Эжэн Пат'е прымае актыўны ўдзел у люаўскіх баях 1848 г., а затым і ў чэрвеньскіх барыкадах. Лютая расправа звярэлай буржуазіі з чэрвеньскімі інсургентамі вызначыла зараджэнне ў душы Эжэн Пат'е пачуцця класавай непрымірымасці, палкай нянавісці да буржуазнага ладу. Гэта пачуццё фарбавала ўсю далейшую творчасць паэта.

У 1870 г. Пат'е ўступае ва французскую секцыю Інтэрнацыянала. Ён актыўна ўдзельнічае ў рэволюцыі 18 сакавіка 1871 г., а затым становіцца актыўным работнікам Парыжскай комуны. Увесь перыяд Комуны працуе ён не пакладаючы рук у розных секцыях і камісіях, з'яўляецца аўтарам рада дэкрэтаў (напр., пра кватэрную плату). У часе разгрома Комуны Пат'е ўдалося перабрацца спачатку ў Англію, а затым у Амерыку. Тут прадаўжае ён сваю рэволюцыйную работу ў якасці генеральнага сакратара-казначэя соцыялістычнай рабочай партыі. У 1880 г. па амністыі паэт вяртаецца ў Францыю. У 1884 годзе паяўляецца два зборнікі Пат'е—«Хто шаленец?» і «Соцыяльна-эканамічныя санеты». Зборнікі былі выдадзены сябрамі паэта, які жыў у вялікай нястачы. У 1887 годзе былі выдадзены яго «Рэволюцыйныя песні». Гэта быў апошні год жыцця Пат'е, які памёр у жабрацтве.

Пачынаючы з першых творчых крокаў, Эжэн Пат'е актыўна перапрацоўвае, але разам з тым беражліва выкарыстоўвае песенны жанр свайго вялікага настаўніка Беранжэ. Песня-куплет з паўтараючымся лёгкім прыпевам, які адгукаецца на розныя падзеі грамадскага жыцця,—вось якой была песня Беранжэ. Яго вучні, рабочыя паэты Клеман, Пат'е і інш., пайшлі далёка наперад па шляху барацьбы за лепшае будучае чалавецтва, аб якім марыў і іх настаўнік. Песня-куплет захоўваецца ў творчасці Пат'е, хоць ён піша і санеты і паэмы.

У песнях Пат'е гарыць вера ў светлае будучае чалавецтва і энергічная нянавісць да буржуазіі (верш «Крывапійцы», «Забіць сум», «Прапаганда песень», «Дом, які трэба разбурыць»). Дом—гэта буржуазная Францыя, дзе ў раскошных кватэрах жывуць спекулянты, банкіры, папы, прадажныя жанчыны, іх ахоўваюць ашуканыя салдаты. І ў «Прапагандзе песень» паэт заклікае песні пранікнуць у розныя куткі Францыі, каб распрапагандаваць бядняка, селяніна, салдата.

Але з асаблівай сілай загучала песня Пат'е, калі ён засвоіў ідэі Маркса, ідэі навуковага соцыялізма. Калі, на пэўным этапе рэволюцыйнага руху, а іменна ў 1848 годзе, паэт Фрэйліграт становіцца паэтычным прадстаўніком «Саюза комуністаў», дык паэтычным выразнікам ідэй Інтэрнацыянала, створанага Марксам, з'яўляецца Эжэн Пат'е.

Тэматыка песень Пат'е разнастайная, але заўсёды палітычна завостраная. Паэт увесь час падкрэслівае сваю песенную сувязь з народнымі масамі, паэт заяўляе аб тым, што нельга выганяць палітыкі з песень, бо палітыка—гэта барацьба за надзенныя патрэбы працоўных. У выдатным творы «Сямейны паэт» Пат'е падкрэслівае гэту думку ў прыпеве. Песня гэта зроблена майстэрска. Яна пачынаецца запэўненнем у тым, што з гэтага часу паэт будзе апяваць толькі сямейныя падзеі, абмяжуецца пытаннямі сямейнага побыту. Ён іранічна сцвярджае прыпевам:

Правда, ведь семейному поэту,
Песнь другая вовсе не нужна?

І далей паэт бліскуча даказвае адваротнае:

Не поэма ли семья? Так звонок
В колыбели радостный пролог.
В воздухе нуждается ребенок,
Как в лучах нуждается росток.
В городе теплынь и много света...
Но в лачугах сырость потечет!
В качестве семейного поэта,
Должен я громить квартирный счет.

Чым больш разгортвае паэт карціны жыцця рабочай сям'і, тым усё больш яркай становіцца думка аб непарыўнасці палітыкі і жыцця.

В качестве семейного поэта
Должен крикнуть я «мы есть хотим».

Такім чынам, паслядоўна пратэстуе ён супроць вайны, супроць цяжкіх умоў працы, супроць беспрацоўя, беспраўя.

Рабочы клас і энергічны пратэст супроць жабрацкага яго становішча адлюстраваны ў вялікай колькасці песень («Соцыяльная амністыя», «Беспрацоўе», «Крызіс» і інш.). Паэт патрабуе амністыі не толькі палітычнай. Амністыя павінна быць для працаўнікоў.

Паэт заяўляе аб тым, што прыдзе соцыяльная рэволюцыя, якая знішчыць жудасную капіталістычную рэчаіснасць. Паэт ускрывае класавыя супярэчнасці, паэт гаворыць пра жорсткую, скрытую вайну, якая не спыняецца ні на секунду. Гэта вайна працы з капіталам.

Это история массы.
Конец ее всюду один.
Я был всюду пушечным мясом,
Я—мясо для жадных машин.
Идет счетоводство лихое
На войнах. Но кто подсчитал
Калек и убитых в забое,
Куда их послал капитал.
(«Крызіс»).

Але паэт бадзёра глядзіць наперад, бо ён бачыць «надыходзячых дзён рэванш».

У сваіх песнях энергічна выступае Эжэн Пат'е супроць вайны і яе падпальшчыкаў, супроць рэлігіі і яе прыслужнікаў, як зброі прыгнечання працоўных.

От веры воронам доход
Сгребают золото сутаны.
Их бог нас за руки берет,
Пока нам вывернут карманы.
(«Жан-Бядняк»).

Лепшым антырэлігійным творам з'яўляецца санет «Святая тройца». Святая тройца—гэта рэлігія, уласнасць і буржуазная дзяржава.

Святая троица! Мы все в твоей петле!
Поп, ростовщик, жандарм—их трое на земле,
Ложь, воровство и смерть—вот триединство бога.

Актыўны ўдзельнік барацьбы пролетарыята, бязмежна адданы справе вызвалення працоўных, комунар Эжэн Пат'е ў сваіх песнях змог выразіць вялікую аптымістычную веру ў канчатковую перамогу пролетарыята, уславіць Комуну, як пачатак барацьбы за будучае, комуністычнае грамадства.

Адна з самых моцных песень, прысвечаных Комуне, гэта песня «Яна не памерла». Роўнага ёй твору наўрад ці знайсці з усіх прысвечаных Комуне. Эжэн Пат'е сам-жа змагаўся на барыкадах, сам перажыў жахі яе разгрому. Непахіснасць, баявая рашучасць, мужнае натхненне комунараў былі і яго якасцямі. Комуна для Эжэна Пат'е—яго родная, кроўная справа, справа ўсяго яго жыцця. З вялікай цеплынёй і любоўю сцвярджае паэт жыццёвасць і надыходзячую перамогу комунізма.

Эжэн Пат'е памёр 7-га лістапада 1887 года. У гэтым годзе пяцідзесяцігоддзе з дня яго смерці супадае з святкаваннем 20-годдзя Вялікай пролетарскай рэволюцыі. Лепшым помнікам Эжэну Пат'е служыць тое, што яго гімн «Інтэрнацыянал», як міжнародны гімн працоўных, гучыць у гэты дзень на ўсіх мовах свету. Шматмільённыя дэманстрацыі працоўнага чалавецтва нясуць магутныя гукі і словы гэтага цудоўнага гімна, створанага ў 1871 г. комунарам Эжэнам Пат'е. Магутныя гукі «Інтэрнацыянала» гучаць і на дэманстрацыях 7-га лістапада з вуснаў народаў Савецкага Саюза, якія жывуць у тым грамадстве, за якое змагаўся, якое прадбачыў і пра якое страсна марыў Эжэн Пат'е.

Натхнёныя радкі «Інтэрнацыянала», прасякнутыя рэволюцыйным пафасам, напісаныя пад уплывам ідэй Маркса—гэтыя радкі заўсёды будуць жыць і клікаць да перамогі.

Никто не даст нам избавленья,
Ни бог, ни царь и ни герой,
Добьемся мы освобожденья
Своею собственной рукой—

горда гучаць словы «Інтэрнацыянала». Эжэн Пат'е тут выразіў упэўненасць у сілы рабочага класа. Ён заявіў аб тым, што толькі працоўныя ўсяго свету з'яўляюцца сапраўднымі гаспадарамі зямлі.

Лишь мы, работники всемирной
Великой армии труда,
Владеть землей имеем право,
А паразиты—никогда!

Эжэн Пат'е прадракаў рашучую схватку прагрэсіўнага чалавецтва са старым светам, ён быў цвёрда упэўнены ў надыходзячай перамозе працоўных. Магутна гучыць прыпеў:

Это есть наш последний
И решительный бой.
С Интернационалом
Воспрянет род людской.

Памяць пра песняра Комуны, пра натхнёнага стваральніка магутнага пролетарскага гімна — «Інтэрнацыянала» — будзе вечна жыць у сэрцах прагрэсіўнага чалавецтва.

У ТЭАТРАХ БССР






I. «ЛЮБОЎ ЯРАВАЯ» Трэнева ў Віцебскім гортэатры. Швандзя—засл. арт. рэсп. А. ІЛЬІНСКІ, Пікалаў —арт. ІВАНОЎ, праф. Гарнастаеў—арт. СЯРГЕЙЧЫК.
II. «ЖЫЦЦЁ КЛІЧА» Біль-Белацаркоўскага ў Белдзяржрамтэатры. Нікіцін—арт. ПЛАТОНАЎ, Кашырын—арт. РАХЛЕНКА.
III. «ФАЛЬШЫВАЯ МАНЕТА» А. М. Горкага ў Яўрэйскім Дзяржтэатры БССР. Злева направа: Дуня—арт. АЛЬТМАН, Ефімаў—арт. РУТШТЭЙН, Клаўдзія—арт. ЦЫПКІНА, Глінкін—арт. ФЕЛЬДМАН.
IV. «БЕСПАСАЖНІЦА» А. Н. Остроўскага ў Віцебскім тэатры. Злева направа: Карандышэў—арт. ІВАНОЎ, Ларыса—арт. КАШЭЛЬНІКАВА, Агудалава—арт. РАДЗЕЛОЎСКАЯ, Паратаў—арт. ШЭЛЯГ.

В. І. ВЛАДАМІРСКІ

Большасць прадстаўнікоў беларускага савецкага мастацтва вырасла і творча сфармавалася за годы савецкай улады. Да гэтай плеяды выхаванцаў рэволюцыі адносіцца і заслужаны артыст БССР В. І. Владамірскі.

У 1919 годзе ён дабраахвотнікам паступае ў Чырвоную армію. Адначасна прымацоўваецца да гарнізоннага тэатра ў якасці культработніка і тутжа працуе актарам. З гэтага часу і пачынаецца творчы шлях Владамірскага.

У 1921 годзе Владамірскага накіроўваюць у Ленінград, у тэатр Смольнага раёна. Не гледзячы на тое, што ён там прабыў нязначны час, усё-ж ён вынес адтуль шмат карыснага.

У 1924 г. В. І. Владамірскі прышоў працаваць у першы Беларускі дзяржаўны тэатр, якім доўгі час кіравалі контррэволюцыйныя нацдэмы. Ворагі намагаліся скіраваць беларускае мастацтва з шырокага савецкага шляху, арыентуючы яго на варожую Польшчу, прышчапляючы мастацтву беларускага народа шкодныя махрова-нацыяналістычныя, буржуазныя ідэйкі, цягнулі тэатр у балота фашысцкага бруду. Яны скажалі гісторыю шматпакутнага беларускага народа і працягвалі ў спектаклях контррэволюцыйныя выхваленні неіснуючага «залатога века». Містыфікацыя, сімволіка, экзотыка і інш. атрыбуты класава-варожай маскіроўкі былі неад'емлімымі спадарожнікамі нацыяналістычна-буржуазнага рэпертуара. Совецкія творы не дапускаліся ў тэатр. У свой час і Владамірскі падпаў пад уплыў варожых элементаў. Але гэта была эпізадычная з'ява ў творчым жыцці артыста. Ён давёў на справе, што сапраўдным яго шляхам з'яўляецца рэалістычны паказ людзей краіны соцыялізма.

Вялікім дасягненнем Владамірскага з'явілася стварэнне вобраза комсамольца Цыганка ў спектаклі «Гута» Да гэтага часу вобраз маладога беларускага рабочага адсутнічаў як у драматургіі, так і ў тэатры.

Владамірскі становіцца папулярнейшым акторам беларускага народа. І ў 1933 г. ўрад БССР надае яму годнасць заслужанага артыста БССР.

Цікавы і шматгранны вобраз стварае В. І. Владамірскі ў 1932 г. у спектаклі «Бацькаўшчына» К. Чорнага. Майстэрскі актор раскрывае характарныя рысы Леапольда Гушка. Крок за крокам раскрываецца вобраз Гушка, які ўсё больш і больш пераконваецца, што радзіму трэба адваёўваць з вінтоўкаю ў руках. Владзімірскі ўклаў у



гэты вобраз увесь свой акторскі тэмперамент, усё сваё багацце эмацыянальных фарбаў.

Потым ён стварае два сатырычныя вобразы—Апалона Мурзавецкага ў спектаклі «Ваўкі і авечкі», і паліцмейстэра Івана Каламейцава ў спектаклі «Апошнія» М. Горкага. Гэтыя два спектаклі безумоўна з'яўляюцца перамогай тэатра на шляху рэалістычнага мастацтва, і работы Владамірскага—адны з найбольш яскравых у названых спектаклях.

Увесь творчы шлях Владамірскага паказвае, што актор, якога выхавала совецкая ўлада, упарта перамагаючы свае памылкі, імкнецца авалодаць сладчынай тэатральнага мастацтва Апошнія ролі з'яўляюцца сведкамі росту актора Владамірскага. Да XX-годдзя Кастрычніка т. Владамірскі прыходзіць з вобразам свабодалюбівага Язэпа з «Салаў'я».

А. ЕСАКОЎ.

Наш добра знаёмы

... Шэрыя хвалі плёскаюць ля кранштацкіх фортаў. Над Фінскім залівам легла ноч. 1919 год. Інтэрвенты чатырнаццаці дзяржаў рыхтуюць удар па чырвонаму Петраграду.

А ў клубе маракоў грыміць ту-стэп, нерухомыя стаяць ля прычалаў ваенныя караблі, на мінаносцы «Гаўрыіл» шумна засядае судком, на палубе моцна спіць вахценны сігнальшчык Федзя Колесаў.

Скора совецкі глядач убачыць, як большэвікі ў суровыя дні 1919 года аднаўлялі магутны Балтыйскі флот і геранчна баранілі «акно ў Еўропу» ад набега інтэрвентаў. Новы гукавы фільм кіностудыі «Совецкая Беларусь»—«Дывізіён славы» (рэжысёр Файнцымер) пакажа гэтыя падзеі.

Калі прачнецца на экране вахценны Колесаў,—мы яго пазнаем адразу-ж. Малады твар, кірпаваты нос, вясёлая ўсмешка. Гэта наш агульны любімец і знаёмы—заслужаны артыст рэспублікі Аляксей Кміт. Ён развітваецца на экране з сваёй старой мамкай, ідучы на фронт з «Першым узводам»; ён весела і горда праходзіць з гармонікам па вясковай вуліцы ў «Двойчы народжаным». І ён-жа, Пецька Ісаеў, верны ад'ютант легендарнага Чапаева—дораг і знаёмы мільёнам кінагледачоў усяго свету.

Пацягнуўся, уздыхнуў вахценны сігнальшчык Федзя Колесаў і прамовіў:

— Нуда. Клёшам падлогу ды бульвары падмятаем... Харош хлопец Федзя, разумее гэта стары большэвік—камісар мінаносца. Але не ўспрыняў яшчэ Колесаў сутнасці рэволюцыйнай дысцыпліны, любіць Федзя шырокі клёш і прывабную татуіроўку, любіць «бузіць» і «задавацца». Патрэбна моцная рука, каб угамаваць такіх марачкоў і накіраваць энергію іх на справу рэволюцыі.

Кожнае слова, кожны жэст Федзі сігнальшчыка старанна шукае, рэпетыруе, правярае Лёша—актор. Да канца зразумець вобраз, знайсці характэрныя штрыхі, аднавіць любы крок, учынак, слова героя—вельмі цяжкая задача.

Кожнае здыманне з'яўляецца для яго праверкай вялікай работы. Кожная няўдача—гэта такое вялікае гора, калі могуць паказацца слёзы.

Аляксей Кміт, калі яму было 28 год быў ужо ўзнагароджан ганаровым званнем заслужанага артыста рэспублікі. Ён быў упачатку некалькі збянтэжаны гэтым высокім гонарам. Вясёлы і смяшлівы малады актор павінен быў спыніць нечаканыя імправізацыі ў трамваях, на вуліцах, у магазінах (а раней такія таленавітыя выхадкі вельмі яго забаўлялі). Значэнне кожнай ролі вырасла. Рэгулярная вучоба стала неабходнасцю. І не выпадкова ў яго ўзнікла жаданне ісці ў тэатр, штодня працаваць над сваім акторскім талентам.

Фільм «Дывізіён славы» канчаецца вытворчасцю. У гэтай вялікай карціне адным з самых цікавых і жывых вобразаў будзе Федзя Колесаў. Сам А. Кміт наўрад ці задаволены гэтай работай. Роль Федзі не была галоўнаю, многа выдумак і прапаноў актора не ўдалося ажыццявіць.

Але совецкі глядач зноў падзякуе Лёшу Кміта і палюбіць ліхога сігнальшчыка Федзю Колесава.

... Пеніцца бурнае Балтыйскае мора. Цёмная асенняя ноч. Выбух. Трывога. Зноў выбух. Разломаныя варожымі мінамі, тонуць совецкія эсмінцы «Свабода» і «Гаўрыіл». Шыпіць і крэніцца на левы борт «Гаўрыіл», хвалі перакульваюць шлюбку. На тонучым караблі камісар аддае апошні загад. Трэба паведаміць аб інтэрвенцкім дэсанце. Трэба паспець паведаміць!

І на мачту «Гаўрыіла», якая шастаецца, смела карабкаецца сігнальшчык Федзя. Гойдаецца мачта. Зрывае бесказырку вецер. Ляцяць пырскі. Заліта палуба вадой. Тоне карабель.

— Сігнал перадам!—горда крычыць Федзя. У далечы прарэзваюць неба ракеты. Паведамленне прынята! Наймагутнейшае напружанне сіл партыйных і непартыйных большэвікоў выратоўвае чырвоны Піцер.

Кінулася ўверх свінцовая хваля, разламалася мачта, звалілася, панесла ў мора Федзю...

Абавязак перад рэволюцыяй выканан.

П. ШАМШУР.



Кадр з кінофільма «БАЛТЫЙЦЫ»—вытворчасці Белдзяржкіно. У галоўных ролях: заслужаны арт. рэсп. Л. Кміт і арт. Б. Ліванаў.
Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

АКТОР І РОЛІ

«Для мяне, як актора, пытанне пераўвасаблення займае, бадай, асноўнае месца ў рабоце над роллю. Я заўсёды адчуваю задавальненне, калі я Сокал, перастаю існаваць і станаўлюся, скажам, Гопнерам («Штурм»), які падае словы з нейкай нямецкай напеўнасцю, указацельны палец яго правай рукі ўтыкаецца ў кожнага, каго ён хоча пераканаць.

Для мяне надзвычайна важна ведаць, якім тэмбрам голасу валодае Гопнер, як ходзіць шамес («Тойбер»),



Актор Яўрэйскага тэатра БССР М. Б. СОКАЛ у ролях Барыльда—«Авечая крыніца» і Еўдакіма—«Паэма аб тапары».

якія звычкі і навыкі ў Муліка («62 участак»), як апранаецца Еўдакім («Паэма аб тапары»), ці пацеюць ногі ў Мендэля («Партызаны»). Мне вельмі важна назаўсёды задзёрнуць партнёру перад Барыльда («Авечая крыніца»), каб ён ні ў якім разе не ўбачыў кітайца Лі-Хо («Джым Куперкоп»), каб Ар'е-Лейб («Закат») не сустрэўся з Патэкам («Ботвін»), і каб доктар Кунінгамам («Людзі ў белых халатах») не быў бы знаемы з прафесарам з «Гоп-ля мы жывем».

Гэта старонка з акторскага дзённіка М. Б. Сокала. Старонка не выпадковая. Калі праглядаеш галерэю вобразаў, створаных Сокалам, больш за усе зварачвае на сябе ўвагу надзвычайнае уменне актора пераўвасабляцца ў кожны новы, так не падобны на папярэдні вобраз. Хітры, жуліковаты, з адценнем «яўрэйскага скепсіса» глядзіць на нас з фото твар шамеса, а вось—сумленны, адкрыты, мужны твар партызана («Партызаны»)—якая супроцьлегласць! Іспанец Барыльда і Еўдакім з «Паэмы аб тапары»—трэба доўга ўглядацца, каб знайсці ў гэтых такіх розных тварах адны і тыя-ж знаемыя рысы твару актора Сокала. Шпік і паэтычны вобраз юнага музыканта, абрузглы сінагагальны староста і жывы, вынаходлівы слуга Моска—такі дыяпазон актора. Не толькі твар мяняе Сокал з кожнай роллю—дзівосна пераўтвараецца ў ім у адпаведнасці з вобразам уся фігура, паходка, голас. Грузная, расхлябаная паходка Цалі і усе востра знойдзеныя дэталі вобраза гучаць настолькі-ж арганічна, як і надзвычайная рухомасць, маладосць і энергія Моска («Бальпонэ»). Актор пераўтвараецца ўвесь з кожнай новай роллю. Вонкавае пераўтварэнне выцякае з новай унутранай лініі, ад зместу новай ролі. Таму ўся філіграннаяработа актора над вонкавым малюнкам вобраза мэтаімкнёна, праз вонкавае ён раскрывае ўнутранае, ідэйнае ў вобразе. У большасці работ Сокала вонкавае і ўнутранае арганічна зліта,—значыць актор глыбока прадумаў вобраз, правільна яго зразумеў і па-майстэрску спецыфічнымі акторскімі сродкамі данёс яго да гледача.

Сокал—рознастайны актор. Ён выконвае ролі і гратэскава—камедыйнага характара, і лірычныя, і трагедыйныя. Праявіў ён сябе больш за ўсё ў першых, а імкнецца больш за ўсё—да апошніх,—трагедыйных, востра-драматычных роляў. З вялікім захапленнем ён працаваў над ролю Заўла Авадзіна ў юбілейным спектаклі тэатра «Сям'я Авадзіс». У гэтай ролі ёсць той матэрыял, да якога актор імкнецца ў апошні час. Чад фармалізма і нацыяналізма, які насаджалі ў Яўрэйскім тэатры ворагі народа, на нейкі час атруціў і Сокала. Цяпер ён вызваляецца ад гэтай атруты, як ад цяжкой хваробы і з радасцю працуе над глыбінямі вобраза. Якраз у гэтым напрамку яго багатая творчая індывідуальнасць лепш за ўсё і раскрываецца.

У вобразе Заўла Авадзіса няма і кроплі былой местачковай дзікасці, тых рысаў характара, якія выхоўвала праклятая «рыса аселасці». З якой любоўю Заул адносіцца да маленькага новага перасяленца, які нарадзіўся ў яго ў хаце. З вялікай цеплынёй і гумарам распрацаваў актор сцэны, калі Заул чакае нараджэння дзіцяці, сцэну Заўла з жонкай над калыскай.

Крок за крокам раскрываюцца рысы вобраза. Заул—новы вобраз на сцэне Яўрэйскага тэатра. Былое шкодніцкае кіраўніцтва тэатра старанна не дапускала на падмосткі ЯДТ вобразы новых людзей совецкай краіны.

Справа не толькі ў тым, што Заул вызваліўся ад прыгнёту рэлігіі, фанатызма, нацыянальных забабонаў. У яго дыханне іншае, ён інакш—не так як дарэволюцыйны яўрэйскі працоўны—ідзе па зямлі. У Заўла Авадзіса—упэўненасць гаспадара жыцця, вялікі аптымізм і мэтаімкнёнасць, любоў да радзімы, цёплыя адносіны да людзей, гордасць за сваіх сыноў, з якіх адзін—сакратар райкома партыі, другі героем загінуў на границы, трэці ідзе займаць месца загінуўшага брата. Надзвычай хвалюе гэта месца ў ролі, калі Заул выслухвае заяву сына аб жаданні стаць на месцы геройска загінуўшага Шлёмкі. Але цэнтральнае месца ролі, калі Заул атрымлівае тэлеграму ад К. Е. Варашылава, нарком вітае яго з добрымі сынамі. Незвычайная радасць, хваляванне, гордасць ахопліваюць Заула. Ён суе тэлеграму у левую кішэню, потым у правую, нарэшце пакідае яе ў руках і прыціскае да грудзей. Ён пачаў гаварыць і не ў сілах стрымаць сябе, упершыню Заул заплакаў...

Сокал—працавіты актор. Ён не абмяжоўваецца работай над роллю, трапнае акторскае вока бесперапынна заўважвае характэрнае, цікавае, вострае ў акружаючым жыцці—на вуліцы, у сталовай, на вакзале. Ідзе накапленне матэрыялаў да будучых вобразаў. Хвалююць актора і агульныя пытанні акторскай творчасці. Ён наглядае, супастаўляе, робіць для сябе вывады, пасля кожнай новай сваёй работы; гэта дапамагае яму расці далей.

М. Б. Сокал прабуе свае сілы і ў галіне рэжысуры. Ён марыць ажыццявіць дзве пастаноўкі па творах Шолам — Алейхема — «Стэмпеню» і «Есэлэ-Салавей». Як актор Сокал марыць сыграць глыбокі, патрасаючы трагедыйны вобраз.

«... Адзін талент не можа забяспечыць рост, рух наперад. Неабходна культура, уменне ўпарта і сістэматычна працаваць над сабою. Актору неабходна развіваць у сябе любоў да культуры, да ведаў». Гэта правільнае заключэнне М. Б. Сокал з правам можа рабіць на аснове сваёй творчай практыкі.

Гэты даравіты, удумлівы актор—адзін з прадстаўнікоў плеяды талентаў Совецкай Беларусі, узрошчаны за годы совецкай улады.

М. ЮДЭЛЕВІЧ.

ТАЛЕНАВІТЫ АРТЫСТ

Мужны вучоны, чалавек бліскучага розуму, з вялікім чулым сэрцам, палка ненавідзячы фашысцкіх ізувераў,—такім быў вобраз прафесара Ведэля у выкананні М. А. Зорава ў тэмпераментным маладзёжным спектаклі Белдзяржтрама «Працяг будзе».

Актор глыбокай мыслі, абаяльны і тэмпераментны, Зораў не адразу прышоў да рэалістычнага мастацтва, да такіх вобразаў, як праф. Ведэль. Адмоўныя персанажы, якія яму пера-



Зарысоўка Г. Дакальскай

важна давялося іграць раней у Белдзяржрамтэатры, вобразы шкоднікаў, бюракратаў, дэфензіўшчыкаў і ім падобных, Зораў у большасці іграў у плане сатырычнага гратэска. Тут часам поруч са здаровым рэалістычным зернем, якое дапамагала актору дэмаскаваць гэтых ворагаў, ужываліся і паталагізацыя рухаў, часам тупы позірк, наўмысныя рэзкія інтанацыі, вычварная паходка і т. д.

Пачынаючы з вобраза большэвіка падпольшчыка Евеля Цывіна ў «Бацькаўшчыне» К. Чорнага, М. А. Зораў іграе ўжо рэалістычна. Ён тут выяўляе ўласцівыя яго артыстычнаму тэмпераменту лірызм, цёплую, мяккую танальнасць голаса, разумную і выразную міміку, стрыманыя эканомныя жэсты і ўменне абыгрываць дэталі.

Пасля Ведэля Зораў стварае вобраз Платона Крэчэта—маладога совецкага вучонага, мужнага, смелага і надзвычай лірычнага.

М. А. Зораў да 20-годдзя Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі прышоў з новай цікавай работай. У спектаклі «Салавей» ім створаны вельмі складаны, напісаны З. Бядуляй з вялікім мастацкім густам, каларытны вобраз ксяндза.

Зораў з пачуццём мастацкай меры раскрывае падводныя лініі вобраза, выкрываючы іезуіцка-двурушніцкае, тарцюфскае нутро ксяндза.

М. А. Зораў, артыст мыслі, якая падпарадкоўвае сабе інтуіцыю, заўсёды клапоціцца аб «унутранай партытуры» ролі. Дзякуючы гэтаму створаныя ім вобразы маналітны і мастацка адшліфованы.

Зораў—адзін з параўнаўча нямногіх мастакоў тэатра, які шчасліва спалучае ў сабе спелае акторскае майстэрства з культурай і здольнасцямі ў галіне рэжысуры. Калі ў акторскай творчасці Зораў у юнацкія годы не быў цалкам пазбаўлены элементаў трукацтва, то ў галіне рэжысуры ён з першых-жа сваіх работ становіцца на шлях рэалізма. Зораў ніколі не выступаў з гучнымі самарэкламнымі дэкларацыямі аб «адданасці рэалізму», а, тым не менш, большасць спектакляў Зорава—рэжысера і пастаноўшчыка—з'яўляюцца іменна рэалістычнымі палотнамі. В. І. Немірович-Данчэнка пісаў у артыкуле ў «Праўдзе», што сапраўдны рэжысёр павінен растварыцца ў спектаклі ў акторскім майстэрстве. Такія спектаклі Зорава, як «Працяг будзе», «Музыканцкая каманда», «Платон Крэчат», і асабліва «Апошнія», якраз сведчаць пра тое, што Зораў у цэнтры ўвагі рэжысерскай работы ставіць актора, а не танныя пастановачныя эфекты.

Дзякуючы любоўным адносінам Зорава да актораў і настойліваму выхоўванню акторскай моладзі, у спектаклях «Працяг будзе» і «Музыканцкай камандзе» творча раскрыліся маладыя здольныя акторы Бараноўскі, Міхайлаў, Аляксеенка, Брайчэўская, Краўчанка і цэлы рад іншых.

У значнай меры, дзякуючы ўвазе да актораў і вялікай рабоце з акторамі рэжысера Зорава, у спектаклі «Платон Крэчэт» створаны рад высокамастацкіх вобразаў нябожчыкам В. Н. Крыловічам, акторамі Грыгонісам, Ржэцкай і Ждановіч. Самая спелая рэжысёрская работа Зорава—гэта спектакль «Апошнія» А. М. Горкага.

Абапіраючыся на моцны калектыў Белдзяржрамтэатра, т. Зораў у гэтым спектаклі паклаў усе свае рэжысёрскія намаганні на мастацкае раскрыццё галерэі выдатных горкаўскіх тыпаў.

М. А. Зораў да найвялікшай гістарычнай гадавіны прышоў са спектаклем «Вочная стаўка» бр. Тур і Шэйніна, які з'яўляецца мастацкай зброяй супроць заклятых ворагаў совецкага народа.

Можна спадзявацца, што М. А. Зораў, як і многія таленты, квітнеючыя ў нашым шчаслівым народзе, вырасце ў буйнага мастака самага выдатнага ў свеце совецкага соцыялістычнага тэатра.

М. МОДЭЛЬ.

Юныя таленты Совецкай Беларусі

Наша вялікая радзіма беражліва выхоўвае і песціць мноства цудоўных талентаў і выдатных дараванняў, якіх выклікала да жыцця Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя 1917 года.

Надзвычай добрыя музыканты расцвітаюць у шматлікіх народаў нашай цудоўнай радзімы.

У кансерваторыях, музычных вучылішчах і музычных школах выхоўваюцца тысячы юных скрыпачоў, віяланчалістаў, піяністаў. Добрыя дзіцячыя хоры і дзіцячыя аркестры выконваюць сонечныя і радасныя песні пра нашу шчаслівую радзіму, пра нашага любімага Сталіна.

У нас, у БССР, і ў прыватнасці ў Менскай музычнай школе навучаецца многа здольных і даравітых дзяцей.

Пецю Салодчанку, Паўліку Салодчанку і Наце Фаміной—разам 21 год, кожнаму ў асобку па 7 гадоў. Але не гледзячы на такі юны ўзрост, яны сябе выявілі, як даравітыя музыканты.

Пеця, Паўлік і Ната вучацца ў музычнай школе ўсяго адзін год. Пры паступленні яны не ведалі ні адной ноты, але поспехі за год у іх вельмі добрыя.

Дастаткова сказаць, што юная піяністка Ната Фаміна за адзін месяц прайшла тое, што ёй належыць прайсці па вучэбнаму плану за год.

Ва ўсіх траіх абсалютны слых і вялікая музычнасць.

Скрыпач Пеця Салодчанка займаецца ў выкладчыка Бяссмертнага, віяланчаліст Паўлік Салодчанка—ў Фідлона, а піяністка Ната Фаміна—ў выкладчыцы Сульскай. Ната не толькі добра іграе, але добра піша і чытае, не гледзячы



Трыо юных музыкантаў: Пеця Салодчанка (скрыпка), Пава Салодчанка (віяланчэль) і Ната Фаміна (піяністка).
Фота І. Каплінскага.

на свае сем гадоў. Сур'ёзнае і ўдумлівае выкананне характарызуе яе ігру.

Нядаўна на праглядзе Ната выканала п'есу кампазітара Гнесінай—«Дожджык».

Гэта п'еса звычайна выконваецца толькі на трэцім курсе музычнай школы, але Ната яе выканала з такой лёгкасцю і прыгажосцю, што прысутныя педагогі далі высокую ацэнку яе ігры.

Што асабліва вылучае ігру трох дзяцей—гэта свабодная і непрымусовая манера іх ігры. Сцэна і гледачы зусім не бянтэжаць гэта выдатнае трыо, якое выступае на канцэртах гэтак-жа спакойна, як і дома.

А перад гледачамі Пецю, Паўліку і Наце часта даводзіцца выступаць: іх часта слухаюць у Палацы піонераў, у Доме Чырвонай Арміі і на заводзе імя Варашылава.

Да 20-годдзя Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі гэта трыо будзе выконваць у канцэртах цэлы рад твораў для скрыпкі, віяланчэлі і раялі Гендэля, Шумана і інш., а таксама многа сольных твораў.

Некалькі дзён назад камісія педагогаў з кансерваторыі праслухала гэтых даравітых дзяцей і прыняла іх на дзіцячае аддзяленне пры Менскай кансерваторыі.

Мноства юных цудоўных талентаў выхоўваецца і навучаецца ў нашых музычных школах па гарадах БССР—у Гомелі, Магілеве, Бабруйску, Віцебску.

Толькі ў нашай вялікай радзіме, ў краіне соцыялізма расце і выхоўваецца абкружаная надзвычайнымі клопатамі партыі Леніна—Сталіна і ўсяго совецкага народа—выдатная плеяда надзвычайных, таленавітых совецкіх дзяцей.

Ф. К.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Галоўлітбел № 3341.

Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі: Менск, Совецкая, 68, Дом пісьменніка.

Друкарня імя Сталіна.